Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

16 СТУДЗЕНЯ 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 7
(26365)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ЦЭНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗНІЖАНЫ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 15 студзеня прыняў з дакладам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

На сустрэчы былі абмеркаваны пытанні, якія датычацца цэнавай сітуацыі на спажывецкім рынку краіны. Урад прыняў рашэнне аб тым, што ў сёлетнім годзе не будзе займацца рэгуляваннем цэнаў, за выключэннем цэнаў на сацыяльна значныя тавары. Але ўжо на пачатку студзеня ўзнікла шмат праблем, якія датычацца цэнаўтварэння.

Асобныя суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці ў парушэнне заканадаўства рэалізоўвалі па завышаных цэнах тавары айчыннай і замежнай вытворчасці. У выніку склалася сітуацыя, калі на фоне зніжэння цэнаў у свеце ў Беларусі яны неабгрунтаваны выраслі.

Цэны павінны быць зніжаны. Іх павелічэнне з пачатку студзеня павінна скласці не больш за 5—7 працэнтаў да ўзроўню былых, адзначыў Сяргей Сідорскі.

Прэзідэнт даручыў Ураду трымаць пытанне аб цэнавай сітуацыі на спажывецкім рынку краіны на пастаянным кантролі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

(Больш падрабязна — у наступным нумары.)

Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў рашэнне на правядзенне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі ў 2009 годзе

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 15 студзеня зацвердзіў рашэнне на правядзенне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і забеспячэнне пагранічнай бяспекі краіны ў 2009 годзе.

Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Ігара Рачкоўскага аб выніках работы ведамства ў 2008 годзе і планах на 2009 год.

Паводле яго слоў, беларуская граніца як на захадзе, так і на поўдні прыведзена ў адпаведнасць з новымі патрабаваннямі.

Як было адзначана, на беларуска-расійскай граніцы няма ніякіх праблем. «У 2008 годзе ўсе праблемныя пытанні паміж пагранічнымі ведамствамі, што датычыліся «зялёнай граніцы», зняты. Няма праблем пераходу граніцы для законапаслухмяных грамадзян замежных краін, якія накіроўваюцца ў Расію», — сказаў Ігар Рачкоўскі.

Актыўна рэалізуецца Праграма ўладкавання знешняй граніцы Саюзнай дзяржавы на перыяд 2007—2011 гадоў. Усяго для развіцця і ўдасканалення пагранічнай інфраструктуры асвоена больш за 248 млн расійскіх рублёў.

Як далажыў Ігар Рачкоўскі, Дзяржпагранкамітэт выступіў ініцыятарам скарачэння пагранічнай зоны з 50 км да 10—15 км, што, на яго думку, спрыяльна адаб'ецца як на развіцці турызму, так і ў цэлым на эканоміцы прыгранічных рэгіёнаў. Пры гэтым з лютага плануецца значна спрасціць наведванне пагранічнай зоны як для беларусаў, так і замежных грамадзян. Грамадзяніну Беларусі будзе дастаткова толькі заплаціць дзяржпошліну і, маючы пашпарт, на любым пагранічным пасту па заяўным прынцыпе аформіць адпаведны дазвол. Замежнаму ж грамадзяніну неабходна звярнуцца з заяўкай у Дзяржпагранкамітэт або пагранічны атрад, дзе на працягу 5—7 дзён выдадуць пропуск на знаходжанне ў пагранічнай зоне.

Вопыт устанаўлення пагранічнай зоны ўзяты ў краін-суседзяў: Латвіі, Літвы і Польшчы, дзе, дарэчы, дзейнічае больш жорсткае заканадаўства. Ігар Рачкоўскі адзначыў, што ў гэтым рашэнні Дзяржпагранкамітэт зыходзіў, перш за ўсё, з інтарэсаў насельніцтва. Гэта таксама прывядзе да павелічэння колькасці грамадзян, якія хочуць наведаць такія турыстычныя аб'екты, як, напрыклад, Аўгустоўскі канал, запаведныя мясціны Белавежскай пушчы.

Ігар Рачкоўскі таксама паведаміў, што, нягледзячы на ўступленне Літвы, Латвіі ў Шэнгенскае пагадненне, у 2008 годзе не знізілася колькасць замежных грамадзян, якія наведваюць Беларусь. «Да нас 5,3 млн замежных грамадзян прыязджалі, столькі ж і пакідалі Беларусь», — сказаў ён, дадаўшы, што крыху знізілася — на 1,4 працэнта — колькасць грамадзян Беларусі, якія пакідалі межы краіны.

У 2008 годзе на 10 працэнтаў скарацілася колькасць парушэнняў пагранічнага заканадаўства (з 4,97 тыс. у 2007 годзе да 4,47 тыс. у 2008-м), на 23 працэнты — затрыманняў парушальнікаў дзяржаўнай граніцы (з 836 да 644 адпаведна). На 45 працэнтаў скараціўся паказчык па затрыманні незаконных транзітных мігрантаў (з 225 у 2007 годзе да 124 у 2008-м). Павысілася рэзультатыўнасць узаемадзеяння з ДМК, МУС, КДБ, іншымі дзяржорганамі, а таксама мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў ахове граніцы. Так, у 2008 годзе праведзена звыш 400 сумесных мерапрыемстваў, у час якіх затрымана таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму звыш Br10 млрд, што ў 2,5 раза больш, чым за 2007 год.

Дзяржпагранкамітэт ва ўзаемадзеянні з зацікаўленымі дзяржорганамі прымаў меры па стварэнні максімальных зручнасцяў для грамадзян, якія перасякаюць дзяржаўную граніцу, павышэнні эфектыўнасці яе аховы ў пунктах пропуску. Так, прынцып «адзін пункт пропуску — адно спыненне» дзейнічае практычна ва ўсіх аўтадарожных пунктах пропуску. Яго паўсюднае ўкараненне завершыцца з заканчэннем рэканструкцыі пунктаў пропуску «Каменны Луг», «Беняконі» і «Казловічы».

(Заканчэнне на 2-й стар.)

101-Ы СТУДЗЕНЬ СОФ'І АНДРЫЕЎІЧ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Соф'я Андрыевіч з вёскі Валішча Пінскага раёна кажа, што і не заўважыла, як пераступіла свой стагадовы ўзрост. Але пачуцці ад пражытага ў яе светлыя, хоць гадавалася сіратою. Узгадваючы мінулае, яна не прамінае сказаць галоўнага: «як добра жылі яны з мужам, які з пяшчотаю называў яе Зоськай».

«У хаце, у якую я прыйшла замуж, жылі ажно 15 чалавек, але жылі мы дружна, весела»,— прыгадвае старэйшая жыхарка сельсавета. Цяпер Соф'я Канстанцінаўна жыве пад апекаю дачкі Марыі і ў гэтыя дні атрымлівае шмат віншаванняў ад аднавяскоўцаў. Адной з першых валішчанскую доўгажыхарку наведала старшыня сельскага Савета Тамара Вабішчэвіч (на фотаздымку справа).

Дыялог Беларусі і ЕС набывае ўсё больш узаемавыгадны характар

Аб гэтым на брыфінгу ў Мінску заявіў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй Папоў.

Ён адзначыў, што бакамі ўжо ўстаноўлены больш цесныя кантакты ў рамках супрацоўніцтва ў сферы энергетыкі, сельскай гаспадаркі і іншых. Ён выказаў перакананасць, што дыялог будзе развівацца і далей. Вырашэнне газавай спрэчкі паміж Расіяй і Украінай — унутраная справа дзвюх краін, заявіў Андрэй Папоў.

«Гэта сітуацыя адносіцца да сферы ўзаемаадносінаў паміж дзвюма краінамі, — сказаў ён. — Спадзяёмся, што ў самы бліжэйшы час яна будзе вырашана да ўзаемнага задавальнення ўсіх краін».

БЕЛТА.

Урады Беларусі і Украіны падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ва ўмовах сусветнага крызісу

Урады Беларусі і Украіны падпісалі пагадненне аб выпрацоўцы сістэмы мераў па інтэнсіфікацыі двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ва ўмовах сусветнага фінансавага і эканамічнага крызісу. Подпісы пад дакументам паставілі першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзімір Сямашка і першы віцэ-прэм'ер-міністр Украіны Аляксандр Турчынаў пасля завяршэння рабочай сустрэчы ў Гомелі, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Пагадненне прадугледжвае аказанне садзейнічання суб'ектам гаспадарання па розных напрамках. Адзін з яго пунктаў — даручэнне банкаўскім структурам прапрацаваць пытанне аб адмове ў прывязцы да долара ЗША ва ўзаемаразліках.

«Калі мы зможам па гэтай формуле працаваць у рамках нашых краін, то ў далейшым да нас змогуць далучыцца і іншыя», — сказаў Аляксандр Турчынаў.

БЕЛТА.

Беларусь атрымала першы транш крэдыту МВФ у памеры $787,9 млн

Беларусь атрымала першы транш крэдыту Міжнароднага валютнага фонду ў памеры $787,9 млн. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі.

Нагадаем, Выканаўчы савет Міжнароднага валютнага фонду 12 студзеня 2009 года адобрыў праграму «стэнд-бай» для Рэспублікі Беларусь у аб'ёме амаль $2,46 млрд тэрмінам на 15 месяцаў. Беларусь звярнулася за атрыманнем крэдыту да гэтай міжнароднай фінансавай арганізацыі ў кастрычніку 2008 года ў мэтах павелічэння дзяржаўных золата-валютных рэзерваў і стварэння «падушкі бяспекі», неабходнай для стабільнай работы эканомікі ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу.

Атрыманыя сродкі будуць залічаны ў склад золатавалютных рэзерваў краіны і ў далейшым будуць выкарыстоўвацца для падтрымання курсу нацыянальнай валюты. Беларусь далучылася да МВФ 10 ліпеня 1992 года. Яе квота 386,4 SDR (амаль $588 млн). Папярэдняе пагадненне з МВФ — Пагадненне аб праве выкарыстання крэдыту, тэрмін дзеяння якога завяршыўся 11 верасня 1996 года.

БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА ВЫХАДНЫЯ ЗАСНЕЖЫЦЬ І ПАДМАРОЗІЦЬ

Сёння ўдзень пад уплывам зоны паніжанага ціску амаль паўсюдна будзе ісці кароткачасовы снег, а тэмпература паветра будзе ад 0 да 5 градусаў марозу, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

Ужо ў выхадныя вецер зменіцца на паўночны і маразы ўзмоцняцца. У многіх раёнах краіны чакаецца снег і мяцеліца. Тэмпература паветра ўначы мінус 3—10, пры праясненнях да 13 марозу, удзень — 2—7 марозу. У пачатку наступнага тыдня захаваецца ўмерана марознае надвор'е. У панядзелак уначы месцамі, а ўдзень ужо паўсюдна будзе ісці снег. Тэмпература паветра ўначы 3—9 марозу, пры праясненнях да мінус 13—15 градусаў, удзень — ад 0 па захадзе да 6 марозу па ўсходзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

Br5 МЛРД НЕДАПЛАТЫ

Намеснік дырэктара салігорскага таварыства з абмежаванай адказнасцю падазраецца ў тым, што сваімі дзеяннямі нанёс урон дзяржаве на... 5 мільярдаў рублёў.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, падазроны, папярэдне дамовіўшыся з іншымі адказнымі асобамі таварыства, у 2005—2006 гадах ухіліўся ад выплаты падаткаў, з-за чаго дзяржава і недаатрымала істотныя сродкі. На хітрыкі пайшоў і дырэктар аднаго са сталічных таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, якому ў 2006—2007 гадах шляхам наўмыснага заніжэння падатковай базы ўдалося ўхіліцца ад выплаты падаткаў і зберагчы ў суме 662 мільёны рублёў. «Эканомнага» кіраўніка вывелі на чыстую ваду таксама супрацоўнікі фінансавай міліцыі.

Ігар ГРЫШЫН.

278 ТЫСЯЧ ЕЎРА — ЗА «ПАПЕРКІ»

Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Гомельскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да адказных асобаў вытворчага сельгаскааператыва ў Жыткавіцкім раёне, якія падазраюцца ў вымантачванні крэдыту.

Як паведамілі ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, летась — у чэрвені — падазроныя звярнуліся ў банк за крэдытам у суме 278 тысяч еўра. Аднак, як высветлілася, яны, каб атрымаць гэтыя грошы, падалі ў фінансавую ўстанову заведама несапраўдныя звесткі і дакументы. Між іншым, крэдыт да гэтага часу не пагашаны.

А ў Віцебску дырэктар аднаго з адкрытых акцыянерных таварыстваў у красавіку мінулага года, каб атрымаць 4,5 мільёна расійскіх рублёў крэдыту, сфальсіфікаваў і падаў у банк дакументы аб нерухомай маёмасці, якая ідзе ў заклад. У дачыненні да яго таксама ўзбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

З КВАТЭРЫ ЗНІКЛА 6900 ЕЎРА І 2720 ДОЛАРАЎ

За дзевяць гадзін, што адсутнічала дома 59-гадовая мінчанка, зламыснікі паспелі вычысціць яе схованку, з якой знікла буйная сума ў валюце.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, жанчына пражывае ў адной з кватэр дома па вуліцы Чарвякова. «Госці» завіталі да яе, правярнуўшы цыліндр замка ўваходных дзвярэй. Пацярпелай не было дома з 8 да 17 гадзін, таму ў злачынцаў было дастаткова часу, каб адшукаць зберажэнні — 6900 еўра і 2720 долараў ЗША. Цяпер уся надзея на праваахоўнікаў, якія займаюцца пошукам нахабнікаў.

Ігар ГРЫШЫН.

АДКУЛЬ ФАЛЬШЫЎКІ?

У Баранавічах апошнім часам былі выяўлены падробленыя 20-тысячныя купюры Нацыянальнага банка Беларусі.

Адну фальшывую дваццатку выявілі ў філіяле банка. Купюра паступіла з выручкай з адной крамы горада, а яшчэ дзве падробкі малады хлапец абмяняў на больш дробныя купюры ў гульнявым клубе «5 зорак». Фальшывыя купюры мелі невысокую якасць падробкі. У горадзе быў уведзены план «Купюра». Аб фальшыўках папярэдзілі гандлёвую сетку і розныя ўстановы. Неўзабаве ў бары «Сёмае неба» затрымалі двух хлопцаў — вучня і рабочага...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГАЗАВЫ САМІТ, ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, ПРОЙДЗЕ НА ТЭРЫТОРЫІ ЕС

Газавы саміт пры ўдзеле Расіі, Украіны і ЕС, хутчэй за ўсё, пройдзе на тэрыторыі Еўрасаюза. Аб гэтым паведаміў пасол Чэхіі ў РФ Міраслаў Касцелка.

Ён заявіў, што напярэдадні адбылася тэлефонная гутарка прэзідэнта РФ Дзмітрыя Мядзведзева і прэм'ер-міністра Чэхіі Мірэка Тапаланека.

«Яны дамовіліся, што лепш за ўсё зрабіць саміт на тэрыторыі ЕС у складзе Еўракамісіі, Расіі і Украіны», — сказаў пасол. У той жа час назваць дакладныя тэрміны сустрэчы Касцелка не змог. Раней паведамлялася, што РФ выступіла з ініцыятывай правядзення такога саміту ў суботу, 17 студзеня, у Маскве. Аднак прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка і прэм'ер-міністр Украіны Юлія Цімашэнка лічаць, што саміт краін-транзіцёраў і спажыўцоў расійскага газу павінен прайсці на тэрыторыі краіны, не ўцягнутай у газавую спрэчку.

ІЗРАІЛЬСКІЯ ТАНКІ ЎВАЙШЛІ Ў ПРАДМЕСЦЕ ГАЗЫ

Дзясяткі адзінак бронетэхнікі войска Ізраіля ўвайшлі ў чацвер раніцай у раён Тэль эль-Гава, што на поўдні ад горада. Гэта адбылося пасля масіраваных артабстрэлаў, якія доўжыліся ўсю ноч.

Паводле звестак спадарожнікавага тэлеканала Al-Jazeera, баевікі ўзброенага крыла ісламскага руху «Хамас» і атрады «Ісламскага джыхаду» аказваюць жорсткае супраціўленне ізраільцянам у квартале Гань-эль-Хава. Паводле інфармацыі інфармаагенцтваў, матарызаваныя калоны ізраільскіх вайскоўцаў учора на працягу дня прасоўваліся да цэнтра Газы з некалькіх кірункаў.

Па цэнтральных раёнах Газы наносіліся ракетна-бомбавыя ўдары. Як паведамілі прадстаўнікі Блізкаўсходняга агенцтва ААН, з раніцы быў абстраляны раён, дзе размешчаная іх штаб-кватэра. Будынак атрымаў значныя пашкоджанні, тры чалавекі былі параненыя. Як паведамляе АР, міністр абароны Ізраіля Эхуд Барак ужо назваў здарэнне «вялікай памылкай» і прынёс свае прабачэнні прадстаўнікам міжнароднай арганізацыі.

КІТАЙСКАЯ ПРАПАГАНДА ВЫЙДЗЕ НА МІЖНАРОДНЫ ЎЗРОВЕНЬ

На паляпшэнне міжнароднага іміджу Кітая ўлады краіны маюць намер выдаткаваць 6,6 мільярда долараў ЗША, паведаміла France Presse.

Дарагі прапагандысцкі праект будзе ўключаць у сябе стварэнне міжнародных тэлеканалаў на англійскай, рускай і арабскай мовах, больш за тое, шматлікія кітайскія выданні пачнуць выходзіць у англамоўных версіях і адкрываць замежныя карпункты.

Адказны за ідэалагічную працу ў Кітайскай камуністычнай партыі Лі Чаньчунь заявіў: «Мы павінны паказаць усім вобраз моцнага і абноўленага Кітая... Вялікая кітайская нацыя займае ў свеце годнае месца. Кітай — гэта не краіна бедных, адсталых і дурных».

АБАМА ДАПУСЦІЦЬ НА ВАЕННУЮ СЛУЖБУ АДКРЫТЫХ ГОМАСЭКСУАЛІСТАЎ

Барак Абама, які ўступіць на пост прэзідэнта ЗША 20 студзеня, дазволіць прадстаўнікам сэксуальных меншасцяў адкрыта служыць ва ўзброеных сілах, паведаміў тэлеканал FOX News. Паводле словаў будучага прэс-сакратара Белага дома Роберта Гібса, абраны прэзідэнт мае намер адмовіцца ад прынцыпу «не пытай, не кажы», згодна з якім ваеннае начальства не імкнулася даведаецца аб утоеных падрабязнасцях асабістага жыцця салдатаў і афіцэраў. Палітыка «не пытай, не кажы» была ўведзеная ў 1993 годзе прэзідэнтам Білам Клінтанам. Асобам, якія адкрыта дэманструюць нетрадыцыйную сэксуальную арыентацыю, служыць ва ўзброеных сілах забаранялася, бо гэта можа падарваць мараль і дысцыпліну.

Яшчэ адна ініцыятыва абранага прэзідэнта ЗША, якая выклікала шырокі рэзананс, — намер прызначыць кіраўніком Упраўлення па кадрах Джона Бэры, які ў цяперашні час з'яўляецца дырэктарам Смітсанаўскага заапарка ў Вашынгтоне. Крыніца ў Дэмакратычнай партыі пацвердзіла, што ведамства, якое адказвае за кадравыя пытанні ва ўрадавых органах, узначаліць менавіта Бэры. Ён таксама не хавае, што з'яўляецца гомасэксуалістам. Калі Бэры прызначаць кіраваць Упраўленнем па кадрах, ён стане ў ЗША найбольш высокапастаўленым службоўцам — адкрытым гомасэксуалістам.

БЖЭЗІНСКІ ПРАПАНАВАЎ ЗША І КІТАЮ СТВАРЫЦЬ G2

Амерыканскі палітолаг Збігнеў Бжэзінскі, які быў дарадцам Барака Абамы па знешняй палітыцы падчас прэзідэнцкай перадвыбарнай кампаніі, выступіў за стварэнне саюза ЗША з Кітаем па ўзоры адносінаў Вашынгтона з Еўропай і Японіяй.

Паводле словаў палітолага, дзвюм краінам неабходна стварыць нешта падобнае на «вялікую васьмёрку» (G8), якая сёння з'яўляецца нефармальнай пляцоўкай, на якой лідары дзяржаў абмяркоўваюць сусветныя праблемы. Як падкрэслівае Бжэзінскі, лідары Кітая і ЗША таксама павінны сустракацца ў нефармальных абставінах для абмеркавання не толькі двухбаковых адносінаў, але і пытанняў глабальнай палітыкі.

Пытанне адносінаў з Пекінам паступова становіцца цэнтральным у дыскусіях адносна прыярытэтаў амерыканскай знешняй палітыкі. Па аб'ёме ВУП Кітай ужо апярэдзіў Японію і займае другое пасля ЗША месца ў свеце.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.01.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 652,00
1 еўра	3 492,68
1 латвійскі лат	4 962,11
1 літоўскі літ	1 011,29
1 чэшская крона	314,35
1 польскі злоты	827,44
1 расійскі рубель	82,33
1 украінская грыўня	303,61

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	32,2135
10 UAH	36,8786
1000 BYR	12,1515
EUR	36,8786

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падлішьыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

На слыху

ВАКАНСІЙ МЕНШ. АЛЕ ХАПАЕ

Рынак працы Беларусі зацікавіў расіян

У наш час лепш мець працоўны, чым мабільны тэлефон — на жаль, сёння гэта ўжо не жарт. Масавыя скарачэнні сталі рэаліяй у авіяцыі, аўтапраме і IT-сферы Еўропы, паводле прагнозаў спецыялістаў, сёлета могуць апынуцца на вуліцы ад 1 да 1,5 мільёна расіян. Што да Беларусі, то пакуль падстаў рабіць змрочныя прагнозы па сутнасці няма. І ў той жа час нельга не адзначыць: у снежні-студзені на айчынным рынку працы ўсё ж назіраюцца пэўныя змены.

Умовы дыктуе наймальнік

Не сакрэт, што асноўнымі кліентамі кадравых агенцтваў традыцыйна з'яўляліся камерцыйныя структуры. Пры гэтым змены ў прыватным сектары рынку працы аказаліся ці не самымі значнымі. У снежні-студзені практычна захаваўся попыт на менеджараў па продажах, камерцыйных і тэхнічных дырэктараў, інжынераў рознага профілю, офіс-менеджараў, ёсць вакансіі для бухгалтараў і будаўнікоў. У той жа час ці не галоўнай асаблівасцю апошняга часу стала рэзкае зніжэнне колькасці заявак наймальнікаў на некалі вельмі папулярных работнікаў сферы IT-тэхналогій і спецыялістаў па знешнегандлёвай дзейнасці.

— Увогуле, калі да сярэдзіны восені ўмовы на «прыватным» рынку працы па сутнасці дыктавалі работнікі, то цяпер правілы гульні першнаперш вызначаюць наймальнікі, — адзначае **спецыяліст па падборы персаналу кансалтынгавай кампаніі «Квадрат» Мая ЧУРЫЛАВА.** — Другая асаблівасць датычыцца заробкаў. Прапановы па зарплаце крыху зменшыліся. І да таго ж калі раней наймальнікі вызначалі аплату працы выключна ва «ўмоўных адзінках», то сёння — усё часцей у беларускіх рублях.

Аднак самае цікавае нават не гэта. Калі яшчэ летам нашы людзі ўсяляк імкнуліся з'ехаць на працу за мяжу, у тую ж Расію, то апошнім часам у беларускіх кадравых агенцтвах павялічылася колькасць рэзюме ад сушукальнікаў-расіян. Прычым у тым ліку такім чынам спрабуюць знайсці працу людзі, якія раней ніякім чынам не былі звязаныя з нашай краінай.

Кан'юнктура не змянілася

Паводле афіцыйнай статыстыкі, у пачатку года ўзровень беспрацоўя ў Беларусі складаў 0,8 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Гэта — адзін з найбольш нізкіх паказчыкаў у Еўропе. Варта заўважыць: ва ўсіх рэгіёнах колькасць беспрацоўных перавышала колькасць вакансій. Адзіным выключэннем стала сталіца, дзе адзін чалавек, зарэгістраваны ў службе занятасці, мог выбіраць адразу паміж пяццю свабоднымі месцамі.

Зрэшты, дэфіцыт працоўнай сілы ў сталіцы і недахоп прапаноў у рэгіёнах — малюнак ужо звычайны. А вось што сапраўды змянілася за апошні час, дык гэта агульная колькасць свабодных працоўных месцаў. Толькі за першыя 10 дзён студзеня банк звестак службаў занятасці «схуднеў» на 5 тысяч вакансій. Або адразу на 10 працэнтаў. І прычыны тут на паверхні. Многія прадпрыемствы, «завязаныя» на знешнія рынкі, перайшлі на работу ў няпоўным рэжыме або адправілі сваіх работнікаў у адпачынкі. Набіраць у такой сітуацыі новых людзей ніхто не хоча, прынамсі, «на ўсялякі выпадак».

— Я ўстрымаўся б ад якіх-небудзь катэгарычных высноў, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай КОХАНАЎ.** —Так, маштабы няпоўнай занятасці ўзраслі. Аднак не будзем забываць, што да 10 студзеня практычна не працаваў наш асноўны знешнегандлёвы партнёр Расія, да таго ж невядома, наколькі сур'ёзна ўдарыў па тых жа расіянах крызіс. Словам, пакуль спрагназаваць сітуацыю цяжка — больш канкрэтны малюнак мы будзем мець па выніках лютага-сакавіка.

Разам з тым, у міністэрстве канстатуюць: на сёння службы занятасці не атрымалі ніводнага паведамлення аб будучых скарачэннях, а агульная па краіне колькасць вакансій па-raнейшаму значна перавышае колькасць беспрацоўных. Істотна не змянілася і структура попыту — тры чвэрці заявак наймальнікаў прыпадаюць на рабочыя спецыяльнасці. У прыватнасці, як і летась, у найбліжэйшы час не павінна ўзнікнуць значных праблем з уладкаваннем у вадзіцеляў, медперсаналу, трактарыстаў, даяраў і прадстаўнікоў будаўнічых прафесій — муляраў, страхароў, маляроў, машыністаў бульдозера, абліцоўшчыкаў-плітачнікаў, цесляроў, сталяроў, тынкоўшчыкаў, электрагазазваршчыкаў.

Варыянты ёсць заўсёды

Прагнозы — справа няўдзячная. Тым не менш, чакаецца, што сёлета на ўліку ў службах занятасці краіны можа быць каля 200 тысяч чалавек. Аднак, мяркуюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, сам па сабе ўзровень беспрацоўя зменіцца нязначна і будзе складаць у снежні 1,1-1,2 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі.

— Дзяржава працягне праводзіць актыўную палітыку на рынку працы, каб хутка рэагаваць на тыя ці іншыя змены, у нас ужо наладжаны маніторынг сітуацыі — ён будзе праводзіцца праз кожныя 10 дзён, — распавядае Мікалай Коханаў. — Плануецца, што сёлета ў краіне будзе створана 161,5 тысячы новых працоўных месцаў, прынамсі 2,4 тысячы беспрацоўных атрымаюць дапамогу на адкрыццё ўласнага бізнэсу, 24,7 тысячы пройдуць прафесійнае навучанне ці перанавучанне праз службы занятасці, для інвалідаў, выпускнікоў навучальных устаноў і іншых катэгорый, якім цяжка канкурыраваць на рынку працы самастойна, працягнецца практыка браніравання вакансій. Грошы на ўсё гэта ёсць, змяншэння фінансавання не будзе. Прычым калі падзеі пойдуць па горшым сцэнарыі, заўсёды застанецца пэўнае поле для манеўру. Ва ўсякім разе сродкі можна перараз-меркаваць, скажам, крыху скараціць часовую занятасць падчас канікулаў школьнікаў і павялічыць выдаткі на стварэнне працоўных месцаў або падтрымку прадпрымальнікаў.

У наш час лепш мець працоўны, чым мабільны тэлефон — на жаль, сёння гэта ўжо не жарт.

Калі раптам ты стаў «лішнім»

Звальненне — заўсёды стрэс. Тым не менш яшчэ не падстава апускаць рукі. Важна не спыняць пошукі новага працоўнага месца і не адмаўляцца ад магчымасцяў атрымаць дадатковы даход, прыкладам, ад грамадскіх работ — і ў тым ліку з выплатай зарплаты. Сёлета такія работы плануецца наладзіць больш чым для 83 тысяч чалавек. Да слова, варта заўважыць: насуперак скептычным адносінам да гэтай справы, сёння беларускую практыку грамадскіх работ у якасці меры часовай падтрымкі беспрацоўных пачынаюць выкарыстоўваць расіяне.

— Але галоўнае, што трэба рабіць пасля страты працоўнага месца — павышаць уласную канкурэнтаздольнасць, — падкрэслівае Мікалай Коханаў. — Ва ўсе часы было так: калі сітуацыя ў эканоміцы добрая — людзі робяць грошы, калі эканамічныя справы пагаршаюцца — усе вучацца. Бо нават калі крызіс прыйдзе да нас, трэба памятаць, што ён не будзе вечным. Пасля абавязкова пачнецца ўздым і спатрэбяцца высококваліфікаваныя спецыялісты.

Сяргей ГРЫБ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў рашэнне на правядзенне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі ў 2009 годзе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сумесна з МУС створана сістэма інфармацыйнага ўзаемадзеяння па перадачы звестак з банка даных аб грамадзянах, права якіх на выезд з Беларусі часова абмежавана. У 2008 годзе органы пагранічнай службы выявілі больш як 7 тыс. такіх асобаў, з якіх каля 50 знаходзіліся ў вышуку.

Паводле ацэнкі Ігара Рачкоўскага, у 2008 годзе транзітная прывабнасць Беларусі ўзрасла. «Нягледзячы на змяншэнне агульнай колькасці перасячэнняў граніцы аўтатранспартам, колькасць прапушчаных праз дзяржаўную граніцу грузавых аўтапаяздоў павялічылася на 22 працэнты. Такім чынам, тая задача, якую ставіў Прэзідэнт, — павялічыць транзітную прывабнасць Беларусі — выканана», — падкрэсліў ён. Павялічылася і колькасць авіяцыйных перавозак і перавозак, што ажыццяўляюцца грузавым чыгуначным транспартам.

Ігар Рачкоўскі таксама паведаміў аб тым, што Беларусь і Літва плануюць заключыць пагадненне аб узаемным малым прыгранічным руху. Падпісанне гэтага дакумента стане сур'ёзным імпульсам для эканомікі ўсіх прыгранічных рэгіёнаў Беларусі, будзе садзейнічаць пашырэнню, перш за ўсё, турыстычных паслуг і прыдарожнага сэрвісу і паслужыць развіццю так званай народнай дыпламатыі. Прадугледжваецца, што ў зону малога прыгранічнага руху, на «глыбіню» не больш як 50 км, у Беларусь змогуць уязджаць каля 800 тыс. грамадзян Літвы без віз на падставе дазволу. У адпаведнасці з гэтым парадкам амаль 600 тыс. беларусаў змогуць бесперашкодна ў Літве наведваць свякоў, храмы, размешчаныя на літоўскай тэрыторыі. «Тое ж самае плануецца зрабіць з Латвіяй, Польшчай, — дадаў Ігар Рачкоўскі. — Думаю, Еўрасаюз пойдзе насустрач нашым суседзям, каб людзі маглі свабодна перамяшчацца».

Беларускі бок развівае дзелавыя і канструктыўныя адносіны з калегамі з пагранведамстваў сумежных краін і з міжнароднымі арганізацыямі. «Ідзе актыўнае ўзаемадзеянне ў рамках розных міжнародных праграм, у тым ліку з ПРААН, Еўрапейскай камісіяй, Міжнароднай арганізацыяй па міграцыі і з іншымі», — сказаў Ігар Рачкоўскі.

У 2008 годзе Беларусь была выбрана кіраўніком рабочай групы па працідзеянні незаконнай міграцыі міжнародай пагранічнай канферэнцыі, якая ўключае больш як 40 пагранічных ведамстваў. «Гэта вялікі давер Беларусі. Такім чынам, нашы еўрапейскія суседзі ацэньваюць нашу краіну ў якасці надзейнага партнёра, перш за ўсё ў сферы барацьбы з нелегальнай міграцыяй», — лічыць Ігар Рачкоўскі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Чаму бізнэсменам не патрэбны... ільготы?

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці пацікавіліся, як выконваецца Дэкрэт Прэзідэнта «Аб некаторых пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў».

Высветлілася, што з пераліку прадугледжаных Дэкрэтам відаў дзяржаўнай падтрымкі прадпрымальніцкія структуры і індывідуальныя прадпрымальнікі, што займаюцца ў вёсцы вырабам тавараў, скарысталіся толькі магчымасцю льготнага падаткаабкладання. І, дарэчы, іх колькасць невялікая. У прыватнасці, у Прыдзвінскім краі 48 суб'ектаў гаспадарання. Ды і толькі ў 10 раёнах вобласці з усіх 21.

Кантралёры, вывучыўшы сітуацыю, прыйшлі да высновы: у астатніх 11 раёнах вобласці льготамі маглі б скарыстацца каля 100 плацельшчыкаў падаткаў. А астатнія, зарэгістраваныя ў сельскай мясцовасці, з'яўляюцца ў асноўным вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі і выплачваюць адзіны падатак альбо прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання.

Цікава, што не спяшаюцца бізнэсмены па крэдыты, якія можна атрымаць на выгадных умовах пад інвестыцыйныя праекты (у памеры, эквівалентным не болей за 20 тысяч еўра, без забеспячэння выканання абавязкаў па крэдытным дагаворы). Ды і мытныя льготы па тэхналагічным абсталяванні, аказваецца, дзелавыя колы пакуль што мала цікавяць.

Праверка не выявіла фактаў, каб нейкія дзяржаўныя органы перашкаджалі ў атрыманні правоў, прадугледжаных Дэкрэтам. Пры гэтым і не вельмі «рэкламавалі» магчымасці, якія дае Дэкрэт — райвыканкамы пры інфармаванні пра Дэкрэт абмежаваліся размяшчэннем аднаразовых публікацый у раённых газетах.

Галоўная выснова — безыніцыятыўнасць прадпрымальніцкіх структур у атрыманні прэферэнцый. Прасцей працаваць у буйным горадзе пры вялікай канкурэнцыі? Няўжо развіццё вытворчасці і сферы паслуг у вёсцы пры падтрымцы дзяржавы — не выгаднае ўкладанне грошай? Тыя, хто думаюць аб развіцці, безумоўна, ужо ацанілі магчымасці працы ў вёсцы. І пра такія структуры «Звязда» неаднаразова распавядала. Вось, у прыватнасці, цэлая фабрыка «Васіліна», дзе займаюцца вырабам панчох, шкарпэтак, пераехала ў Віцебскі раён з абласнога цэнтра. І аналагічныя прыклады ёсць. На жаль, пакуль што іх нямнога.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗА «МЯШОК БУЛЬБЫ» ВОЛІ НЕ ПАЗБАЎЛЯЮЦЬ

Сусветны эканамічны крызіс не паўплываў і не паўплывае на стан правапарадку ў краіне, заявіў міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір НАВУМАЎ. Ён таксама заўважыў, што статыстычныя звесткі па выніках работы міністэрства — найлепшыя за час суверэннасці Беларусі. Уладзімір Уладзіміравіч таксама паведаміў журналістам, што шэраг службовых асобаў, якія парушылі закон, будуць звольнены з міністэрства. Сам жа ён цяпер выплачвае крэдыт, які браў на будаўніцтва ўласнага катэджа. Разважае над тым, ці варта яму ўзяць удзел у пад'ёме на Эверэст з групай супрацоўнікаў МУС.

Паводле сацыялагічнага апытання, больш за 80 працэнтаў насельніцтва краіны у той ці іншай ступені давяраюць вартавым правапарадку. У многім гэтаму паспрыяў пастаянны кантроль за работай са зваротамі грамадзян. Дарэчы, летась у органы ўнутраных спраў паступіла каля 550 тысяч заяў і зваротаў. Цяпер у кожным горадзе пасля паведамлення на тэлефон «102» нарад міліцыі павінен прыбыць не пазней за 7 хвілін.

— Ужо некалькі гадоў знижаецца цяжкасць наступстваў і грамадскай небяспекі здзейсненых злачынстваў, у першую чаргу — супраць жыцця і здароўя чалавека, — сказаў Уладзімір Навумаў. — Скарачаецца колькасць забойстваў, цяжкіх цялесных пашкоджанняў, грабяжоў, разбояў, крадзяжоў, у тым ліку аўта- і кішэнных крадзяжоў, хуліганстваў і іншых злачынстваў.

За 2008 год органамі ўнутраных спраў і пракуратуры выяўлена 6,5 тысячы злачынстваў, з якіх 2,7 тысячы — карупцыйныя. Выяўлена каля 1,5 тысячы раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваення або растраты, звыш 850 фактаў хабарніцтва і больш за 2 тысячы злачынстваў супраць інтарэсаў службы. Найбольш схільнымі да карупцыйных праяў аказаліся сферы гандлю, прамысловасці, органы дзяржаўнай улады і кіравання, а таксама сельскай гаспадаркі. Усяго да крымінальнай адказнасці за здзяйсненне злачынстваў карупцыйнага характару прыцягнута каля 1250 асобаў.

Летась, напрыклад, супрацоўнікамі па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі перададзена ў пракуратуру для накіравання ў суд крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара філіяла 510 ААТ «ААБ Беларусбанк» і яе саўдзельнікаў. На працягу 2002—2004 гадоў дырэктар злоўжывала службовымі паўнамоцтвамі і атрымлівала хабар, за які незаконна давала камерцыйным прадпрыемствам крэдыты і вэксалі з адтэрміноўкай аплаты. Ажыццяўляўся таксама і крадзеж грашовых сродкаў. Страты складаюць 8 млрд рублёў. Падчас расследавання было забяспечана вяртанне страт шляхам накладання арышту на нерухомую маёмасць абвінавачаных на агульную суму 4,4 млрд рублёў.

Складаны застаецца сітуацыя з наркаспажываннем. Дастаткова сказаць, што толькі па афіцыйных звестках наркаманамі з'яўляюцца 12 тысяч грамадзян. За год было выяўлена звыш 4 тысяч нарказлачынстваў, раскрыты 32 каналы пастаўкі наркотыкаў з-за мяжы. За арганізацыю або ўтрыманне прытонаў для ўжывання наркатычных рэчываў узбуджаны 83 крымінальныя справы.

Перакрыты 60 каналаў пастаўкі «жывога тавару» ў 10 краін свету. Зараз выяўляюцца факты і ўстаналюваюцца ахвяры, якія падверглісся эксплуатацыі ў апошнія трыпяць гадоў. Так, у чэрвені быў вынесены абвінавачвы прысуд арганізатарам пастаўкі беларускіх дзяўчат для аказання платных інтымных паслуг заможным бізнэсменам з Расійскай Федэрацыі. Злачынцы асуджаны да 10 і 11 гадоў пазбаўлення волі. Была ліквідавана і міжнародная арганізаваная група, якая займалася вырабам порнапрадукцыі і распаўсюджваннем апошняй праз інтэрнэт. Зламыснікі наладзілі работу порнастудый у некалькіх сталічных кватэрах. Атрыманыя такім шляхам грошы пераводзіліся ў банкі, размешчаныя за межамі краіны. Сума даходу складала каля 15 тысяч долараў у тыдзень.

Зніжэнне мінімальнай велічыні закладу грашовых сродкаў для забеспячэння яўкі падазронай ці абвінавачанай асобы па выкліку органа ўнутранага расследавання і суда з 500 да 100 базавых велічынь дазволіла шырока прымяняць гэту меру на практыцы.

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у студзені — лістападзе 2008 года ў выніку атручэння алкаголем памерла каля 2,5 тысячы грамадзян. Найбольшая колькасць — у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях. На працягу года выяўлена 186 тысяч правапарушэнняў, звязаных з распіваннем спіртных напояў або з'яўленнем у п'яным выглядзе ў грамадскіх месцах. З незаконнага абароту канфіскавана 2,4 млн літраў самагону і фальсіфікаваных спіртных напояў. За сістэматычнае парушэнне правапарадку на глебе п'янства і алкагалізму 5035 асобаў, у тым ліку 924 жанчыны, накіраваны ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі. У дачыненні да бацькоў, якія не займаюцца выхаваннем сваіх дзяцей, узбуджана звыш 8 тысяч крымінальных спраў.

Ва ўсіх рэгіёнах краіны, акрамя Віцебскай вобласці і сталіцы, зарэгістраваны рост колькасці загінулых у дарожна-транспартных здарэннях. Усяго на дарогах краіны было зарэгістравана звыш 7 тысяч ДТЗ, у якіх паранена 7,5 тысячы і загінула звыш 1,5 тысячы чалавек. За кіраванне транспартным сродкам асобай, якая знаходзілася ў стане ап'янення, вынесена 46 тысяч пастаноў аб накладанні адміністрацыйнай меры адказнасці. За паўторны такі ўчынак узбуджана каля 5 тысяч крымінальных спраў.

— Рост ДТЗ я звязваю толькі з культурай вадзіцеляў, — адзначыў Уладзімір Навумаў. — Толькі ў снежні было тры аварыі, калі з чатырох членаў сям'і выжываў адзін... З 1 верасня мы пачнём рэалізацыю праграмы, якая прадугледжвае павышэнне павагі да правілаў дарожнага руху шляхам адпаведнага выхавання грамадзян, пачынаючы з 3-гадовага ўзросту.

Міністр нагадаў, што расследаванне па факце выбуху на масавым свяце ў Мінску яшчэ працягваецца і адзначыў, што неабходнасць ажыццяўлення дактыласкапіі, якая праводзіцца ў тым ліку ў межах расследавання, абумоўлена Законам «Аб дзяржаўнай дактыласкапічнай рэгістрацыі», прынятым у 2003 годзе. Паводле гэтага закона, абавязковую дзяржаўную дактыласкапічную рэгістрацыю павінны прайсці асобы, якія прызываюцца або паступаюць у добраахвотным парадку на воінскую службу ва Узброеныя Сілы краіны, а таксама тыя, хто паступае на альтэрнатыўную службу. Але міністр выйшаў з хадайніцтвам на Савет бяспекі і Савет Міністраў, каб падобную працэдуру праходзілі ўсе ваеннаабавязаныя. Дарэчы, для атрымання біяметрычнага пашпарта грамадзянам трэба будзе рабіць дактыласкапію.

Міністр унутраных спраў выступіў з хадайніцтвам аб вызваленні былога дырэктара ГД «Ждановічы» Яўгена Шыгалава пасля пакрыцця ім урону ў памеры Br85 млрд. «У адпаведнасці з артыкулам 88 (прым.) Крымінальнага кодэкса Беларусі прадугледжана дасудовае памілаванне грамадзян, якія цалкам пакрылі нанесены імі ўрон. Таму я палічыў магчымым звярнуцца да кіраўніка дзяржавы з хадайніцтвам аб прымяненні гэтага артыкула да былога дырэктара ГД «Ждановічы» Я. Шыгалава», — заявіў міністр.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Уладзімір Навумаў падкрэсліў, што міф аб тым, што ў нашай краіне людзі сядзяць «за мяшок бульбы», абсалютна нічым не падмацаваны. Калі чалавек упершыню ўчыняе злачынства, вяртае нанесены дзяржаве ўрон і пры гэтым адсутнічаюць фактары, здольныя абцяжарыць сітуацыю, то такая асоба, як правіла, вызваляецца ад адказнасці. Што датычыцца амністыі, прымеркаванай да 65-годдзя вызвалення Беларусі, то яна не будзе датычыцца асобаў, якія не кампенсавалі страты дзяржаве, а таксама тых, хто здзейсніў асабліва цяжкае злачынства.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Абзац

■ Стары замак у Гродне будзе адрэстаўраваны ў выглядзе каралеўскай рэзідэнцыі XVI стагоддзя. Аб гэтым паведаміў аўтар і навуковы кіраўнік праекта рэстаўрацыі, архітэктар УП «Гроднаграмадзянпраект» Уладзімір Бачкоў.

■ **Сёння спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Алоўнікава, беларускага кампазітара, народнага артыста Беларусі. Нарадзіўся ў Бабруйску, памёр у 1996 г.**

■ У Мінску для паляпшэння жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў за мінулы год пабудавана 843 кватэры агульнай плошчай 70,7 тыс. кв.м. У адпаведнасці з адпаведным Указам Прэзідэнта краіны, шматдзетным сем'ям, якія маюць патрэбу ў жыллі і стаяць на ўліку, аказваецца дзяржаўная фінансавая падтрымка ў выглядзе льготнага крэдыту і аднаразовай субсідыі ў памеры адпаведна 95 % і 5 % ад кошту жылля.

■ **Учора ноччу адбыўся пажар на гомельскім прыватным прадпрыемстве «Ролбудіндустрыя», якое спецыялізуецца на вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Да моманту прыбыцця выратавальнікаў полымем быў ахоплены офісны будынак фірмы. Супрацоўнікам МНС удалося не дапусціць распаўсюджання агню на вытворчае памяшканне. Прычынай, як мяркуецца, было няспраўнае электраабсталяванне.**

■ Трое работнікаў Скідальскага масласырзавода, філіяла ААТ «Малочны свет», спрабавалі скрасці больш за 2,5 тон сыру на суму звыш Br34 млн. Каля дзвюх гадзін ночы зламыснікі, выкарыстоўваючы асабісты мікрааўтобус, вывезлі сыр з тэрыторыі завода. Але ўжо ў Скідалі аўтамабіль быў затрыманы супрацоўнікамі Гродзенскага РАУС і дэпартамента аховы. Няўдалыя зладзеі затрыманы. Па некаторых звестках, яны меркавалі прадаць сыр у Расіі.

■ **Вярхоўная Рада Украіны ўчора зацвердзіла агульнадзяржаўную праграму знясення з эксплуатацыі ЧАЭС і перапрацэнна аб'екта «Укрыцце» ў экалагічна бяспечную сістэму. Праграма прадугледжвае таксама сацыяльную абарону работнікаў ЧАЭС у сувязі з датэрміновым знясценм станцыі з эксплуатацыі. Усе работы будуць праводзіцца паэтапна. Канчатковае закрыццё і кансервацыя рэактарных установак запланавана да 2022 года. Поўны дэмантаж установак і ачышчэнне пляцовак з мэтай максімальнага знясення абмежаванняў намечана зрабіць да 2065 г.**

■ Самыя вялікія грошы зарабляюць тыя, чый безыменны палец даўжэйшы, чым указальны. Вучоныя даўно выявілі, што высокі ўзровень тэстастэрону, які можна вызначыць па даўжыні пальцаў, садзейнічае хуткаму прыняццю рашэнняў. Таму ўладальнікам такіх пальцаў асабліва ўдаюцца кароткатэрміновыя фінансавыя аперацыі, якія патрабуюць хуткага рашэння — напрыклад, пры гульні на біржы. Даследчыкі высветлілі, што на працягу 20 месяцаў мужчыны, якія мелі больш доўгія безыменныя пальцы, зарабілі ў 11 разоў больш грошай, чым тыя, у каго, наадварот, больш доўгі ўказальны палец. Гэты біялагічны фактар дапамагае дабіцца нават большых вынікаў, чым вялікі вопыт у правядзенні фінансавых аперацый.

Ваенная пракуратура Расіі ўнесла прадстаўленні камандуючым Балтфлотам і ПурВА з-за масавых захворванняў вайскоўцаў пнеўманіяй. Прычынай эпідэмічнага захворвання стала неналежнае выкарыстанне пасадавымі асобамі сваіх службовых абавязкаў — не рабіліся захады па лакалізацыі і ліквідацыі інфекцыйных захворванняў і па кантролі за ўмовамі жыцця асабовага складу. У студзені г.г. на лячэнне паступілі больш за 200 вайскоўцаў з дыягназам «пнеўманія» і іншымі прастудным захворваннямі. Папярэджанні вынесеныя 16 асобам, для прыцягнення вінаватых да крымінальнай адказнасці матэрыялы накіраваныя ў ваенна-следчыя органы.

Поўны абзац

■ **У Свярдлоўскай вобласці пракуратура правяла эксперымент па праверцы ведаў правілаў дарожнага руху ў супрацоўнікаў абласной ДАІ, які даў сумны вынік — з амаль трох дзясяткаў чалавек без памылак на пытанні адказаў толькі адзін міліцыянер. Залік праводзіўся па тыпавых білетах для курсантаў аўташкол. Большасць супрацоўнікаў бяспекі руху дапусцілі да васьмі памылак. Атрымаць жа вадзіцельскія правы можа толькі той, хто без памылак адкажа на ўсе пытанні. Як адзначылі ў тамтэйшай пракуратуры, нездавальняючае веданне самімі супрацоўнікамі ДАІ правілаў прыводзіць да таго, што грамадзяне без дастатковых на тое падстаў прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці.**

■ У Чарнігаве невядомыя зламыснікі скралі 450-кілаграмовы банкамат з грашыма, аднак так і не скарысталіся імі. Сярод ночы зладзеі вынеслі банкамат з будынка мясцовай нафтабазы і, пагрузіўшы на сані, завезлі яго на пустку, дзе ён у паламаным выглядзе і быў знойдзены супрацоўнікамі праваахоўных органаў. На момант крадзяжу ў банкамаце было каля 37 тыс. грыўняў ($5 тыс.). Як выявілася, у знойдзеным банкамаце аказалася касета з некранутымі грыўнямі, а адсутнічала іншая, для захоўвання валюты, якую запаўняюць даволі рэдка. Такім чынам, зладзеі засталіся ні з чым.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Дарогі

ШТРАФ ЯК ПРАФІЛАКТЫКА ДТЗ У СЯМ'І

160 тысяч парушэнняў правілаў дарожнага руху выяўлена летась у Магілёўскай вобласці. Гэта ўдвая болей за папярэдні год.

Вал напрыканцы мінулага года ўдалося прыпыніць, калі інспектары ДАІ разам з прафілактыкай сталі актыўна ўжываць да парушальнікаў штрафныя санкцыі.

— Штраф — гэта нагода для прафілактыкі ў сям'і, таму што ад грашовага спагнання церпіць сямейны бюджэт, а жонка і дзеці ніколі не паставяцца да гэтага абыякава, — патлумачыў на прэс-канферэнцыі начальнік УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Віктар Волкаў. — Таму прыцягненне да адказнасці — мера жорсткая і непапулярная, але вядзе да зніжэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў.

У 2008 годзе на дарогах Магілёўшчыны загінула 178 чалавек. Аўтааварыі забралі больш выццяў, чым летась — на 24 чалавекі. Прыкладна столькі ж людзей (26) загінулі ў дарожна-транспартных здарэннях, якія адбыліся па віне нецвярозых вадзіцеляў.

Падобныя здарэнні адбыліся і сёлета. У вёсцы Сялецкае Касцюковіцкага раёна малады чалавек п'яным сеў за руль аўтамабіля і на вясковай вуліцы ўрэзаўся ў кампанію нецвярозых аднавяскоўцаў. Вынік п'янай забавы: адзін чалавек памёр на месцы, трое апынуліся з траўмамі ў бальніцы.

— Самае жахлівае, што цвярозыя людзі напэўна бачаць, як п'яныя садзяцца за руль, але не спыняюць іх, — пракаментаваў Віктар Волкаў. — Чамусьці ўсе ўпэўненыя, што непрыемнасці здарацца ў некага іншага, а не ў іх. У нас яшчэ памятаюць, як нецвярозы расіянін, які прыехаў пагасцяваць у Горацкі раён, вырашыў пакатаць малых і на роўнай дарозе перакуліўся, у выніку чаго загінула дзіця. Летась мы выявілі 6 тысяч нецвярозых вадзіцеляў за рулём і прыбралі з дарогі 25 тысяч нецвярозых пешаходаў, якія таксама папоўнілі страшную статыстыку. Трэба ўсім мець адказнасць за сваё жыццё і жыцці іншых людзей!

Нягледзячы на ўсе высілкі, абстаноўка на дарогах вобласці застаецца даволі напружаная. Начальнік Магілёўскай ДАІ бачыць тут цэлы комплекс прычын: імкліваe павелічэнне колькасці аўтамабіляў, недастатковая якасць падрыхтоўкі вадзіцеляў, вялікія хуткасці і нервовасць, нізкая культура паводзінаў на дарозе.

Да гэтага спісу трэба аднесці і тэхнічныя няспраўнасці: тут варта ўзгадаць жахлівы леташні выпадак у Шклоўскім раёне, калі на палявой дарозе ў аўтамабілі, якім кіраваў аграном, сапсаваліся тармазы. На шляху няспраўнай машыны апынулася жанчына з каляскай, і ў выніку здарэння дзіця загінула.

Яшчэ адна, «вельмі зімовая», прычына — гэта стан дарожнага пакрыцця. Толькі вадзіцелі не радуюцца сапраўднай снежнай зіме. Слізкая дарога нярэдка становіцца прычынай ДТЗ. І сёлета ўжо адбыліся аварыі з людскімі ахвярамі, дзе негатыўную ролю адыгралі снегапад і своечасова не апрацаваная пяском і соллю шаша. Таму ў Магілёве нагадалі, што бяспека на дарогах — гэта не толькі справа ДАІ, але і многіх службаў і людзей, і ўвогуле ўсяго грамадства.

Ілона ІВАНОВА.

Па той бок прылаўка

Чаму не хапае ўпадабаных марак цыгарэт?

Пэўны дэфіцыт некаторых марак тытунёвых вырабаў вытворчасці СП «Тытунь-інвест» прынамсі ў сталіцы назіраўся яшчэ з першай дэкады снежня мінулага года: у камерцыйных шапіках часам іх было набыць праблематычна. Тады ў Мінгарвыканкаме мы атрымалі каментар, маўляў, паколькі гэтыя самыя шапікі да канца года павінны цалкам знікнуць з вуліц горада, пра што гаспадары цудоўна ведаюць, дык па гэтай прычыне не завозяць новыя партыі, а распрадаюць рэшткі.

Шапікаў у сталіцы ўжо даўно няма. А дэфіцыт захаваўся: у пошуках упадабанага або сіняга «Вінстана», або чырвонага «Монтэ-Карла» даводзіцца пабегаць па крамах. А ў апошніх асартымент далёка не заўсёды радуе. З чым гэта звязана?

У аддзеле гандлю харчовымі таварамі Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама нам адказалі, што ніякіх праблем тут не бачаць, маўляў, у крамах цыгарэты вышэйназванага вытворцы ёсць, ніякага скарачэння паставак у гандлёвую сетку не было. А вось на самім прадпрыемстве рэдакцыі агучылі некалькі іншую версію ўзнікнення пэўнага дэфіцыту. Аказваецца, квота на мінулы год скончылася ў сярэдзіне снежня і на нейкі час вытворчасць была прыпынена. Гандаль працаваў на запасах, што засталіся. Цяпер прадпрыемства зноў працуе, але, відавочна, гандлёвая сетка яшчэ не паспела цалкам аднавіць увесь асартымент тытунёвых вырабаў. Да таго ж, думаецца, трэба ўлічваць і цяперашнюю адсутнасць шапікаў: калі раней такую дробязь можна было купіць літаральна на кожным кроку, дык цяпер усе мусяць ісці па яе ў адны і тыя ж крамы...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВОСЬ ВАМ І «ТАВАРЫ ДЛЯ ЖАНЧЫН»...

Супрацоўнікам Пінскай міжрайінспекцыі паступіла паведамленне з Пінскай гаррайінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя аб забруджванні ракі Піны ў межах горада.

На месцы папярэдне было выяўлена, што ў раку патрапілі нафтапрадукты ў выніку ўцечкі дызпаліва з бака аўтамабіля ў гаражы магазіна «Тавары для жанчын». Супрацоўнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі лакалізавалі ўцечку. Загінулай рыбы не знойдзена.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРЫХАПІЎ НАВАТ ЛЯМПАЧКІ

У хату жыхаркі в. Лясная Баранавіцкага раёна злодзей залез праз акно веранды. Рабаўнік браў усё, што трапляла пад рукі. Прыхапіў залаты пярсцёнак, пакрывала, яйкі, сыр... і нават не пакінуў у хаце электрычных лямпачак. Злодзея шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

А НЕ «КІДАЙ» ЗЕМЛЯКА!

Прайдзісвет з Баранавічаў завалодаў грашыма іншага мясцовага жыхара, які яму даверяў. Непрыгожая гісторыя адбылася яшчэ ў студзені 2004 года, калі пацярпелы вырашыў прадаць сваю кватэру. Тут яму і прапанаваў дапамогу дабрадзей, які ўзяўся вырашыць пытанні па гэтай здзелцы. Дапамагаты аказаўся вельмі карыслівай асобай: ён завалодаў грашыма земляка — Br 9,2 млн наперадзе — суд.

Ігар ГРЫШЫН.

УКРАЛІ ТЫГРАНЯ З КРАКАДЗІЛЬЧЫКАМ!

А разам з імі і медзведзянят. Мяккія цацкі ўсё гэта. Ажно семдзесят штук. Іх, падабраўшы ключ да гаража, нехта сцібрыў у аднаго жыхара Жлобіна. Не пашанцавала і жыхарцы горада Ельска. Пасярод белага дня нехта ўзламаў замкі дзвярэй яе кватэры і ўкраў 340 тысяч беларускіх і 30 тысяч расійскіх рублёў, а таксама 1553 амерыканскія долары.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Мінскі абласны Савет дэпутатаў выказвае глыбокае спачуванне старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Сяліцкаму Валерыю Сцяпанавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Віцебскі абласны Савет дэпутатаў выказвае глыбокае спачуванне старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Сяліцкаму Валерыю Сцяпанавічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.

Супрацоўнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні саветніку-кансультанту Упраўлення арганізацыйнай работы Пахабавай Таццяне Анатольеўне з нагоды напаткаўшага яе вялікага горам — смерці БАЦЬКІ.

Принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» бланки универсальных страховых полисов серии ББ №№ 0110816, 0088529, 0088560, 0096815, 0107697 **считать недействительными в связи с утерей.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0141 га, сроком на 50 лет для строительства объекта торговли по ул. Кирова в г. Воложине. Начальная цена – 8 288 354 бел. рубля. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.07.2008 г. Аукцион состоится **03.02.2009 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **02.02.2009 года** до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

2 февраля 2009 г.

в 8.00 состоится внеочередное Общее собрание акционеров ЗАО «Припутник» по адресу: г. Минск, пр. Рокоссовского, 1, конференц-зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Изменение состава акционеров Общества.
2. Уменьшение размера уставного фонда Общества.
3. Внесение изменений в устав Общества.

С документами Общества, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться в приемной директора ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая.

УНН 10007162.

Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»

СООБЩАЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ МЕСТА НАХОЖДЕНИЯ ПОСТОЯННО ДЕЙСТВУЮЩЕГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО ОРГАНА ЗАО «РРБ-БАНК»,

который располагается по следующему адресу: 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, д. 18.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ИНФОРМИРУЕТ:

в извещение о проведении 22.01.2009 г. открытого аукциона по продаже *здания склада сыпучих материалов*, об. пл. 394,1 кв.м, расположенного: *Минский район, г. Заславль, ул. Советская, 122* (ОАО «Автобаза» г. Заславль), опубликованное в газете «Звязда» от 17.12.08 г.,

ВНОСИТСЯ ИЗМЕНЕНИЕ:

начальная цена с НДС – 130 000 долларов США. Задаток – 30 000 000 белорусских рублей. Окончательный расчет в белорусских рублях производится по курсу Национального банка РБ на дату оплаты за объект.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

Открытое акционерное общество «ДСТ № 2, г. Гомель»

сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 29 января 2009 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж, конференц-зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О внесении изменений и дополнений в Устав открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 2, г. Гомель».
2. Об оказании безвозмездной помощи.

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

УНН 400022426.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

№ лота	Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток
1	Незавершенное строительством законсервированное капитальное строение, 3-этажная кирпичная пристройка к корпусу № 17 «а»	1598,4	г. Молодечно, улица В. Гостинец, 67	643 647 060	5 %
2	Площадка для сбора мусора	94,20		5 137 830	10 %
3	Теплопункт, *(корпус № 11)*	101		19 607 670	10 %
4	Ремстройцех и столярная мастерская (корпус № 12)	431,8		63 316 080	10 %
5	Бассейн оборотного водоснабжения	пл. застр. 464		64 437 930	10 %
6	Склад металла заготовительный резной (корпус № 10)	626,5		95 126 400	10 %
7	***1)*** *Корпус 16 Б, АСУП (1216,1 кв.м);* ***2)*** *прессовый участок пластмасс, (пристройка к корпусу № 16 Б), 199,1 кв.м;* ***3)*** *пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б,* 422,1 кв.м; ***4)*** *склад готовой продукции (корпус 16 Б), 397,1 кв.м;* ***5)*** *два металлических навеса для хранения тары при корпусе 16 Б (142 кв.м, 119 кв.м);* ***6)*** *пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, 298,2 кв.м* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67			543 024 000	5 %
8	Здание столовой (3-этажное, с подвальным помещением и помещением трансформаторной подстанции; в т.ч. оборудование — трансформатор ТМ 400/10/04; ТРП	5378,2	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	1 753 449 525	50 000 000
9	Одноэтажное кирпичное здание (состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, кран-балки)	851,1	г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5	387 976 500	10 %
10	Административное здание (2-этажное кирпичное)	474,9		464 497 200	10 %
11	Бокс гаражный	92,8		41 245 200	10 %
12	Шиферный склад	130,4		54 430 200	10 %
13	Здание участка литья пластмасс	187,4	г. Молодечно, ул. Замковая, 19	108 858 000	10 %
14	Административный корпус (2-этажный кирпичный)	576,1	г. Молодечно, ул. Нагорная, 5	383 867 164	10 %
15	Одноэтажное кирпичное здание конторы	135	г. Молодечно, ул. Чарота, 16	92 609 445	10 %
16	Изолированное производственное помещение малярного участка	352,3	г. Молодечно, ул. Промышленная, 4	84 560 000	10 %

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.12.2008 г. Аукцион состоится **03.02.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **02.02.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Тел: (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

*КУП «Минский областной центр учета

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

16
СТУДЗЕНЯ
2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 2 (15556)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

САЛДАТАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА

З панядзелка ў вайсковыя фарміраванні накіраваліся прызыўнікі са сталічных раённых ваенных камісарыятаў, а ўчора — першыя юнакі з абласцей і абласных цэнтраў. Усяго ў гэту прызыўную кампанію на камплектаванне Узброеных Сілаў і іншых вайсковых фарміраванняў Беларусі плануецца накіраваць каля 10 тысяч чалавек.

— На сённяшні дзень камплектаванне Узброеных Сілаў ажыццяўляецца на аснове двух спосабаў: прызыў грамадзян на тэрміновую службу і добраахвотнае паступленне на службу па кантракце, — расказвае першы намеснік начальніка Галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага Штаба Узброеных Сілаў Сяргей КУПРЫН.

У сучаснай беларускай арміі доля кантрактнікаў на салдацкіх і сяржанцкіх пасадах — гэта дзесьці 20% ад агульнай колькасці. Толькі за мінулы год каля 1500 чалавек заключылі свой першы армейскі кантракт. Прыкладна тыя ж 20% у сённяшняй арміі — гэта выпускнікі ВНУ.

На адаптацыю да новых жыццёвых умоў, вывучэнне элементарных армейскіх правілаў і асваенне базавых навыкаў страявога кроку ў хлопцаў ёсць некалькі тыдняў. Толькі пасля Ваеннай прысягі на вернасць Радзіме, якая адбудзецца 7 лютага, чарговыя прызыўнікі стануць сапраўднымі салдатамі.

Юрась ШАЎЦОЎ.

Фота БЕЛТА.

Абітурыент-2009

«РЭПЕТЫЦЫЯ» ЦТ: СПРОБА ДРУГАЯ, ЗУСІМ НЕ ЗАЛІШНЯЯ...

Другі раунд рэпетыцыйнага тэсціравання стартаваў у Беларусі.

Узяць удзел у ім змогуць усе ахвотныя, у тым ліку і дзесяцікласнікі, якім дарога на цэнтралізаванае тэсціраванне летам будзе закрыта. Практыка паказвае, што многія з патэнцыяльных абітурыентаў сутыкнуцца на «рэпетыцыі» будучых выпрабаванняў з непрыемнай рэчаіснасцю — на многія пытанні яны так і не знойдуць правільных адказаў. Да таго ж сума набраных балаў прымусіць некаторых сур'ёзна панерваваць. Зразумела, што калі выдатнік атрымлівае на рэпетыцыйным тэсціраванні 20—30 балаў, то гэта не можа яго не шакіраваць. Але рэпетыцыйнае тэсціраванне для таго і існуе, каб застрахавацца ад непрыемных нечаканасцяў падчас адказнага старту. Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання ўпэўнены, што псіхалагічна да новай формы ўступных іспытаў усе ўжо прызвычаіліся, а вось «тэхнічная» адаптацыя патрэбна кожнаму новаму пакаленню абітурыентаў.

— Рэпетыцыйнае тэсціраванне — гэта свайго роду вучоба і знаёмства з тым, як выглядаюць тэсты, бланкі адказаў, якія існуюць патрабаванні да іх запаўнення, — дзеліцца сваімі думкамі **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Той, каму хоць аднойчы даводзілася запаўняць дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе ў падатковай інспекцыі, ведае, што з першай спробы без старонняй дапамогі справіцца з гэтай задачай проста немагчыма. Да таго ж вялікая колькасць удзельнікаў тэсціравання скончылі школу дастаткова даўно, многія з іх бачаць тэсты ўпершыню і не ведаюць, як працаваць з бланкамі адказаў. Каб эканоміць час на афармленні бланкаў і пазбегнуць крыўдных тэхнічных памылак, усе аперацыі па рабоце з бланкамі лепш загадзя адрэпеціраваць.

Да таго ж рэпетыцыйнае тэсціраванне, нібыта той рэнтген, выяўляе прабелы ў школьнай падрыхтоўцы абітурыентаў і дае магчымасць іх своечасова ліквідаваць. Але нярэдка няўдачы абітурыентаў на ЦТ абумоўлены зусім не прабеламі ў ведах. Здараецца, што абітурыент разгубіўся, паспяшаўся, няправільна зразумеў, чаго ад яго чакаюць складальнікі тэста... Трэба адрозніваць падобныя, на першы погляд, але зусім супрацьлеглыя пытанні накшталт «Працяжнік на месцы пропуску ставіцца» і «Працяжнік на месцы пропуску не ставіцца», «Літара **а** пішацца ў словах» і «Літара **а** не пішацца ў словах». У спешцы можна дапусціць прыкрую памылку, калі не дачытаць умовы задання да канца, а арыентавацца толькі па першых словах. Дарэчы, тэмы могуць прапаноўвацца з года ў год адны і тыя ж, а вось фармулёўкі заданняў могуць змяняцца. На жаль, многія абітурыенты не ў стане рашыць нават элементарныя матэматычныя задачы, калі пытанне ў іх сфармулявана не зусім стандартна. Да таго ж, з году ў год абітурыенты дапускаюць у тэстах адны і тыя ж памылкі, у іх «правісаюць» адны і тыя ж тэмы школьнага курса, хоць ужо не першы год арганізатары тэсціравання рыхтуюць зборнікі з аналізам найбольш тыповых памылак. Напрыклад, ва ўдзельнікаў ЦТ па беларускай мове традыцыйна вялікія цяжкасці выклікаюць фанетычныя і арфаэпічныя асаблівасці беларускай мовы, асаблівасці націску, заданні на правапіс канчаткаў назоўнікаў, правапіс дробавых і парадкавых лічэбнікаў. На тэсціраванні па фізіцы абітурыентаў нярэдка падводзіць дрэнная матэматычная падрыхтоўка. Правільна рашыўшы задачу «фізічна», яны дапускаюць памылкі ў рашэнні сістэмы ўраўненняў, у матэматычных пераўтварэннях формулаў, пры выкананні дзеянняў з вектарамі, трыганаметрычнымі функцыямі і гэтак далей. Некаторыя абітурыенты памыляюцца пры аналізе графікаў, не могуць прымяніць правілы прыблізных вылічэнняў. Пасля правядзення апошняга ЦТ арганізатары пацікавіліся, а што за памылкі дапусцілі ўдзельнікі тэсціравання па фізіцы, якія атрымалі больш як 90 балаў — гэта проста бліскучы вынік. Высветлілася, што яны дапускалі памылкі ў тэкставых задачах, напэўна таму, што проста не разумеюць, аб чым у іх пытаюцца. **Іншымі словамі, лінгвістычная кампетэнцыя сучаснай моладзі не вытрымлівае ніякай крытыкі.**

— Я хачу папярэдзіць, што толькі ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні не дазваляе спадзявацца на стопрацэнтны поспех на цэнтралізаваным тэсціраванні, — падкрэсліў Мікалай Фяськоў. — Дзеля поспеху трэба многа працаваць, прычым не толькі ў выпускным класе. І зусім немагчыма падрыхтавацца да тэсціравання за кароткі тэрмін, нават з дапамогай рэпетытара. На мой погляд, ні адзін рэпетытар не можа даць стопрацэнтную гарантыю паступлення. Аналіз вынікаў ЦТ за апошнія гады дэманструе ўстойлівую залежнасць асабістых вынікаў удзельнікаў ЦТ ад тыпу навучальнай установы, якую скончыў абітурыент. І, як правіла, першыя радкі рэйтынгу займаюць там выпускнікі гімназій і ліцэяў. Да таго ж на вынік тэставых выпрабаванняў могуць уплываць і многія іншыя фактары — такія, як тэмперамент маладога чалавека, уласцівасці яго памяці, уменне арганізаваць работу ў стрэсавай сітуацыі, хуткасць і мабільнасць мыслення і нават пол удзельніка тэсціравання. Так, на аснове нашых шматгадовых назіранняў мы прыйшлі да высновы, што ў прыродазнаўчай і матэматычнай галінах больш паспяховыя юнакі, а ў гуманітарных, асабліва лінгвістычных, — дзяўчаты.

Пры падрыхтоўцы да тэсціравання я не раіў бы абітурыентам захапляцца зборнікамі тэстаў, нават калі яны і былі складзены супрацоўнікамі нашага інстытута. Муштраванне па тэстах недапушчальнае. **Тэсты — гэта толькі форма кантролю, а зусім не навучання.** Галоўнае — выконваць патрабаванні школьнай праграмы і бліжэй пазнаёміцца з зацверджанымі праграмамі ўступных іспытаў. У гэтым годзе, заўважу, праграмы ўступных іспытаў складаліся з улікам пераходных праграм, па якіх навучаюцца вучні 11-х штрых-класаў. Падрыхтоўку трэба весці па школьных падручніках, звяртаючы ўвагу на ўсялякія заўвагі, дадаткоды матэрыял, даведкі і практыкаванні. **Тэставыя ж зборнікі — толькі дапаможны сродак для дыягностыкі ведаў.** Пры падрыхтоўцы да тэставых выпрабаванняў трэба не толькі сістэматычна паўтараць пройдзены матэрыял, але яшчэ і вучыцца прымяняць свае веды ў нестандартных сітуацыях. Жыццё тэсціруе нас штодня, значыць, трэба вучыцца прымаць хуткія рашэнні...

Трэба дадаць, што рэпетыцыйнае тэсціраванне будзе праводзіцца па 14 вучэбных дысцыплінах: беларускай, рускай мовах, матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, замежных мовах, гісторыі Беларусі, геаграфіі, сусветнай гісторыі найноўшага часу і грамадазнаўству. Па ўсіх гэтых прадметах абітурыентам будуць прапанаваныя два варыянты. Сума ўдзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні засталася ранейшай —16 100 рублёў за адну дысцыпліну. У адрозненне ад цэнтралізаванага тэсціравання на рэпетыцыйным тэсціраванні кола прадметаў, па якіх можна праверыць свае веды, ніхто не абмяжоўвае. Дарэчы, для вучняў выпускных класаў мінскіх школ Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў праводзіць тэсціраванне сумесна з Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама на базе сталічных навучальных устаноў. Але пры жаданні старшакласнікі могуць прайсці тэсціраванне таксама і ў ВНУ. Зразумела, што здаваць іспыты ў роднай школе больш зручна і камфортна, але прэтэндэнтам на студэнцкі білет зусім не пашкодзіць прызвычаіцца да інстытуцкай атмасферы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Незалежная экспертыза Леаніда Заікі

ІДЭІ НА МІЛЬЁНЫ ДОЛАРАЎ

Аб удзеле моладзі ў бізнэсе, а значыць і ў развіцці эканомікі краіны, наш карэспандэнт гутарыць з незалежным беларускім эканамістам, кіраўніком аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Л.Ф. ЗАІКАМ.

— Як бы вы ацанілі намаганні і ўнёсак маладых грамадзян Беларусі ў гэтай сферы па пяцібальнай шкале?

— На тройку з мінусам.

— Ці не вельмі вы прыдзірлівы? Паглядзіце, колькі маладых людзей працуе ў прыватным сектары на тых жа папулярных мінскіх рынках «Ждановічы» і «Уручча». А ў сферы паслуг, напрыклад, прыдарожным сэрвісе, дробным рознічным гандлі і аўтаабслугоўванні? Паўсюдна бачыш маладыя твары. А вы...

— Відаць, мы па-рознаму з вамі разумеем сэнс і ролю маладых у эканоміцы, іх сацыяльную і грамадскую адказнасць.

— Як мне здаецца, моладзь наша ў асноўнай масе не здольная актыўна ўдзельнічаць у эканамічным жыцці краіны з-за сваёй пэўнай інфантыльнасці. Вы згодны?

— Абсалютна не згодны. На мой погляд, меркаванне аб сучаснай моладзі як недарэчным «пакаленні пэпсі» выключна зацыкленым на спажыванні, уласных задавальненнях, дыскатэках, папулярнай музыцы, камп'ютарных гульнях, якое амаль нічым іншым не цікавіцца, глыбока памылковае. Упэўнены, сярод нашых маладых суайчыннікаў шмат энергічных, мэтанакіраваных, таленавітых людзей, якія здольныя стаць паспяховымі інавatарамі, вынаходнікамі і прадпрымальнікамі. Іх патэнцыял вялікі. Мы маем усе падставы чакаць ад маладых новых перспектыўных дзеламі ідэй на многія мільёны долараў. Сёння мы жывём у час рэзкіх і не заўсёды прадказальных пераменаў. Каб заснаваць уласны бізнэс і потым не абанкруціцца, трэба мець высокую ступень адаптацыі да новых абставінаў. Маладым гэта прасцей рабіць.

Так, магчыма, знешні выгляд сучасных юнакоў і дзяўчат у пацёртых джынсах і скамечаных майках, з пірсінгам і татуіроўкамі разражняе людзей сярэдняга і старэйшых пакаленняў. Здаецца, што такі хлопец можа прапанаваць карыснага? Паверце, можа. Ён, як і сотні тысяч яго равеснікаў, уважліва назіраюць за жыццём, аналізуюць рэчаіснасць, лепш за дарослых бачаць яе хібы, недарэчнасці, недасканаласць. У іх узнікае натуральнае жаданне нешта палепшыць, змяніць, рэалізаваць, праявіць сябе і г.д.

— А ці падрыхтавана наша моладзь да актыўнага ўдзелу ў бізнэсе?

— На мой погляд, вельмі слаба. У Беларусі, на жаль, яшчэ пакуль вельмі часта фармальна вітаецца прадпрымальніцтва маладых, слаба заахвочваецца іх ініцыятыва, пошук.

— А як дапамагчы моладзі выйсці на шырокі шлях да поспеху і прызнання? Як зрабіць, каб яе не заўсёды адразу і ўсім зразумелыя ідэі ўспрымаліся і не заставаліся на паперы?

— Зноў спашлюся на замежны вопыт. У развітых краінах Еўропы і ЗША рэгулярна праводзіцца шмат розных конкурсаў, напрыклад, на лепшага маладога прадпрымальніка ва ўзросце да 25 гадоў. Перамога ў ім ужо пэўнае дасягненне, важная веха і перадумова для рэалізацыі сваіх дзелавых планаў. Думаю, што і ў нас варта было б зрабіць такія спаборніцтвы аўтараў дзелавых ідэй рэгулярнымі і масавымі па меры магчымасці. Сэнс конкурсаў — выявіць здольных бізнэсменаў-пачаткоўцаў і маральна іх заахвоціць на першым этапе. А дзякуючы галоснасці, асвятленню конкурсаў у мясцовых сродках масавай інфармацыі прыцягнуць увагу да іх патэнцыяльных партнёраў і інвестараў. Бо часам для рэалізацыі перспектыўнага бізнэсу не хапае адносна невялікай сумы грошай, арганізацыйных навыкаў, элементарнага ведання заканадаўчых актаў і палажэнняў.

Асабліва старанна трэба весці пошук маладых таленавітых бізнэсменаў у рэгіёнах, у малых гарадах і вялікіх пасёлках, дзе пасля школы цяжка знайсці працу, ды і прафесійны выбар не адрозніваецца разнастайнасцю. А рэальны малы бізнэс — гэта і новыя працоўныя месцы, і падаткі ў мясцовы бюджэт, і насычэнне рынку спажывецкімі таварамі і паслугамі.

Зразумела, што палова, а можа і больш такіх ідэй на стадыі рэалізацыі пацерпяць крах. У свеце бізнэсу гэта нармальная з'ява. Галоўнае, што самыя лепшыя і канкурэнтаздольныя праекты атрымаюць развіццё.

— А ці можна больш-менш адназначна сказаць, што вось у гэтай сферы праца ў маладых пойдзе, а вось у той бізнэс прагарыць?

Нам усім варта выпрацоўваць у сабе талерантнае стаўленне да нявдач маладых у бізнэсе, імкненне падтрымаць небараку, магчыма, яго другая спроба будзе больш паспяховай. У такіх умовах моладзь будзе хутчэй інтэгравацца ў эканамічнае жыццё краіны.

— Аналіз дзейнасці ў развітых краінах новых паспяховых кампаній, якія здолелі за кароткі тэрмін заявіць аб сабе і зарабіць вялікія грошы на вытворчасці самых розных тавараў, сведчыць, што не існуе якога-небудзь аднаго сектара эканомікі, які б гарантаваў поспех ці наадварот, асуджваў на нявдачу. Так, па выніках 2007 года ў ЗША самай дынамічнай была прызнана кампанія, якая наладзіла выпуск спартыўнага абутку на колах — гэткі сімбіёз красовак і ролікаў. Увогуле з запатрабаванай прадуктам фірма можа застацца на рынку стагоддзямі, калі ўмела і своечасова выкарыстоўвае навінкі тэхналогій і пастаянна падтрымлівае цікаўнасць да сябе з боку спажыўцоў. Зразумела, як і ў кожнай справе ўдача мае велізарнае значэнне, але поспех у многім залежыць і ад ініцыятывы, нявучымслівасці думкі, рызыкі і нават авантурызму. Бо маладым уласціва (і гэта, бадай, самая цікавая і мабілізуючая рыса іх узросту) прага прыгод, нязведанага, імкненне зрабіць нешта па-новаму, інакш, чым раней.

21-гадовы Марк Цукерберг увайшоў у спіс 20 самых лепшых маладых прадпрымальнікаў свету дзякуючы рэалізацыі даволі простай задумкі: адкрыцці ў інтэрнэце сеткі Facebook для абмену думкамі і інфармацыяй розных людзей. А падказала Марку гэту ідэю жаданне адшукаць былых сяброў па вучобе. Хутка Марк зарабіў 13 мільёнаў долараў. Стаў далей развіваць бізнэс і летась, па звестках вядомага часопіса Форбс (Forbes), стаў самым маладым мільярдэрам планеты.

— Каб стаць прадпрымальнікам, для гэтага як мінімум трэба мець жаданне. У нас такім жаданнем гараць не вельмі многія маладыя людзі. Чаму?

— Усё, як вядома, пазнаецца ў параўнанні. У ЗША 71 працэнт падлеткаў хацелі б стаць прадпрымальнікамі. Гэта і не дзіўна, бо свайму багаццю і ўплыву ў свеце Амерыка нягледзячы на цяперашні крызіс і велізарныя эканамічныя праблемы, у першую чаргу абавязана магутнаму і непахіснаму духу прадпрымальніцтва яе жыхароў, пачынаючы з першапраходцаў і заснавальнікаў Новага свету. А вось у Еўропе аж у два разы менш падлеткаў хочуць звязаць свой лёс з бізнэсам. У Беларусі амаль дзве чвэрці школьнікаў старэйшых класаў дакладна сваё месца ў дзяржаўным сектары і структурах. Я думаю прычына ў тым, што большасць нашых падлеткаў не бачаць для сябе шырокіх магчымасцей рэалізацыі ў прадпрымальніцтве. Шчыра кажучы, шкада. Бо невядома колькі цікавых бізнэс-ідэй і прапаноў атрымала б краіна і яе эканоміка, калі б наша сістэма адукацыі вучыла элементам вядзення бізнэсу, калі б урад больш актыўна садзейнічаў прасоўванню ідэй прадпрымальніцтва сярод моладзі. Кажу так, бо за мяжой шмат маладых людзей з'яўляюцца аўтарамі ўнікальных тэхналогій і гучных экспартаарыентаваных бізнэс-праектаў.

— Аднак высокарэнтабельныя і тым больш унікальныя ідэі не нараджаюцца штодзень і прыходзяць у галаву пераважна сапраўды таленавітым маладым людзям ва ўніверсітэцкіх лабараторыях, даследчых цэнтрах. Што б вы параілі так званым звычайным хлопцам і дзяўчатам?

— У рынкавай эканоміцы галоўнае — запатрабаванасць тавару ці паслугі спажыўцамі. Без гэтага ўсялякі бізнэс страчвае сэнс. Таму часам могуць прынесці вялікія грошы і вядомасць нават нечаканыя ідэі. Двое англійскіх хлопцаў часта бачылі, як стомленыя працяглымі танцамі на дыскатэках падлеткі спрабуюць трохі адпачыць на нязручных крэслах. Гэта навяло юнакоў на думку зрабіць сваю мадэль крэсла, якое лёгка трансфармуецца ў прымітыўны ложак. І гандаль новым таварам пайшоў.

Адзін малады немец знайшоў цікавую ідэю літаральна на сметніку. Хлопец неаднойчы назіраў, як аўтаўладальнікі выкідвалі смецце ў спецыяльныя бакі ў чым папала. Вось ён і прыдумаў зручны аўтамабільны кантэйнер для збору ўсялякіх адходаў у час паездкі. Тавар спадабаўся немцам, яго пачалі набываць у масавым парадку.

Малады француз адкрыў у інтэрнэце сайт працоўных вакансій для моладзі. У Францыі ды і ў Еўропе гэта даволі актуальная сённяшняя праблема. Хутка на сайце зарэгістравалася больш за 200 тысяч наведвальнікаў.

Два юныя амерыканцы сваю першую фірму адкрылі яшчэ ў час вучобы ў школе. Яны, толькі паслухаўшы, заснавалі дробную тэлефонную фірму для абслугоўвання ўсяго за 10 долараў у месяц такіх жа дробных прадпрыемстваў малога бізнэсу, якім было нявыгадна заключаць кантракт на паслугі сувязі з вялікімі кампаніямі. Справа аказалася рэнтабельнай. Ужо на другі месяц пайшоў прыбытак. Неўзабаве гадавы абарот фірмы перабольшыў 5 мільёнаў долараў.

Я наўмысна ўзяў гэтыя незвычайныя прыклады з замежнай практыкі, бо яны сведчаць аб тым, што ў маладога дасціпнага розуму ў нашай краіне яшчэ значна больш шырокае поле дзейнасці, чым у многіх іншых краінах. У нас шмат ідэй ляжаць на паверхні. У замежжы ўжо многія дзелавыя нішы заняты, туды не ўціснуцца. У нас жа перспектыўных і не засвоеных накірункаў бізнэсу яшчэ больш чым дастаткова.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Інфармацыю аб графіку і парадку правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання можна атрымаць у наступных пунктах рэгістрацыі і правядзення

№ п/п	Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
	г. Мінск	
1	УА «Інстытут бесперапыннай адукацыі» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта	г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, к. 43 тэл. 222 80 10
2	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі	г. Мінск, вул. Гікалы, 9, к. 422 тэл.: 293 86 49, 293 80 40
3	Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А.Д. Сахарава	г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, к. 107 тэл. 230 73 72
4	Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 65 тэл.: 237 39 25, 292 38 42
5	Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 99 тэл.: 267 05 92, 267 72 68
6	Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт	г. Мінск, вул. Захарава, 21 тэл. 284 81 43
7	Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Партызанскі, 26, к. 3, к. 129 тэл. 209 78 15
8	Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка	г. Мінск, вул. Савецкая, 18 тэл.: 200 94 17, 200 92 04, 200 17 03
9	Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а тэл.: 227 73 89, 227 07 78
10	Мінскі дзяржаўны політэхнічны каледж	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 85 тэл.: 292 12 34, 292 81 05
11	Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж	г. Мінск, вул. Сацыялістычная, 5 тэл. 243 36 87
12	Мінскі дзяржаўны гандлёвы каледж	г. Мінск, вул. Усходняя, 183/43 тэл. 285 79 18

Населены пункт, адрас, нумар тэлефона пункта рэгістрацыі

Брэсцкая вобласць	Мінская вобласць
г. Брэст, вул. Маскоўская, 267, тэл. 8 0162 42 04 92 бульвар Касманаўтаў, 21 каб. 210, тэл.: 8 0162 21 13 65, 23 04 17	г. Мінск, вул. Альшэўскага, 8, тэл. 252 13 50 (аддзел адукацыі Мінскага райвыканкама)
г. Баранавічы, пл. Леніна, 2, тэл. 8 0163 42 46 83, вул. Вайкова, 21, корп. 2, каб. 12, тэл. 8 0163 45 87 99	г. Мар'іна Горка, вул. Леніна, 47, тэл.: 8 01713 5 22 86, 5 05 22
г. Бяроза, вул. Леніна, 62, тэл. 8 0164 34 56 97	г. Вілейка, вул. Вадап'янава, 24, тэл. 8 01771 5 42 47
г. Ганцавічы, вул. Кастрычніцкая, 1, тэл. 8 0164 62 42 13	г. Стоўбцы, вул. Сацыялістычная, 17, тэл.: 8 01717 5 47 72, 5 83 36
г. Драгічын, вул. Леніна, 149, тэл. 8 0164 42 13 48	г. Крупкі, вул. Савецкая, 42, тэл.: 8 01796 5 44 05, 5 56 61
г. Іванава, вул. Кастрычніка, 2, тэл. 8 0165 22 13 45	г. Салігорск, вул. Багамолава, 22а, тэл.: 8 01742 3 47 74, 3 47 76
г. Івацэвічы, вул. Леніна, 44, тэл. 8 0164 52 13 45	г. Старыя Дарогі, вул. Пралетарская, 38, тэл. 8 01792 5 59 97
г. Камянец, вул. Брэсцкая, 28, тэл. 8 0163 12 13 45	г. Беразіно, вул. Маладзёжная, 1, тэл. 8 01715 5 43 16
г. Кобрын, вул. Матросава, 18, тэл. 8 0164 22 56 04	г. Жодзіна, зав. Маладзёжны, 3, тэл. 8 01775 3 70 76
г. Лунінец, вул. Чырвоная, 1, тэл. 8 0164 73 35 06	г. Слуцк, вул. Леніна, 189, тэл. 8 01795 2 26 00
г. Ляхавічы, вул. Леніна, 3, тэл. 8 0163 32 18 59	г. Узда, вул. Савецкая, 22, тэл. 8 01718 5 54 93
г. Пінск, вул. Леніна, 39, тэл. 8 0165 32 22 89 вул. К. Марса, 28, тэл. 8 0165 35 34 43	г. Валожын, пл. Свабоды, 2, тэл. 8 01772 5 56 82
г. Пружаны, вул. Р. Шырмы, 17, тэл. 8 0163 29 18 59	г. Смалявічы, вул. 50 гадоў Кастрычніка, 11, тэл.: 8 01776 5 58 84, 5 54 82
г. Столін, вул. Савецкая, 69, тэл. 8 0165 52 11 23	г. Лагойск, вул. Камсамольская, 9, тэл. 8 01774 5 45 08
г. Маларыта, вул. Чырвонаармейская, 1, тэл. 8 0165 12 33 96	г. Барысаў, вул. Гагарына, 68, тэл.: 8 0177 74 49 51, 74 48 02, 75 25 78
Віцебская вобласць	г. Любань, вул. Першамайская, 24а, тэл. 8 01794 5 15 44
г. Віцебск, пр. Маскоўскі, 72, тэл. 8 0212 47 72 34	г. Маладзечна, вул. Прытыцкага, 5, к. 14, тэл. 8 01733 7 08 97
г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29, тэл. 8 0214 53 05 35	г. Чэрвень, пл. Свабоды, 1, тэл. 8 01714 5 59 83
Гродзенская вобласць	г. Капыль, вул. Горкага, 36, тэл. 8 01719 5 45 45
г. Гродна, вул. Кастрычніцкая, 5, тэл. 8 0152 73 01 01, 72 36 80	г. Мядзел, пл. Шаранговіча, 2, тэл.: 8 01797 5 51 97, 5 55 85
г. Ваўкавыск, вул. Сацыялістычная, 33, каб. 113, тэл.: 8 01512 211 38, 226 58	г. Дзяржынск, вул. Ленінская, 21, тэл. 8 01716 6 54 46
г. Ліда, вул. Кірава, 20, к. 409, тэл. 8 0156 12 17 91	
Гомельская вобласць	
г. Гомель, пр. Кастрычніка, 48, тэл. 8 0232 47 52 74 вул. Кірава, 34, тэл.: 95 28 02, 95 32 01, 77 50 44 вул. Савецкая, 102, тэл. 57 69 17	
г. Мазыр, вул. Студэнцкая, 28, тэл.: 8 02351 2 43 17, 2 43 27	
Магілёўская вобласць	
г. Магілёў, пр. Міру, 43, к. 221, тэл. 8 0222 25 36 03	
г. Горкі, вул. Мічурына, 5, тэл. 8 02233 5 88 90	
г. Бабруйск, вул. Пушкіна, 145, корп. 4, тэл. 8 0225 52 21 95	
г. Клімавічы, вул. Леніна, 11, тэл. 8 02244 5 78 29	

Аплата за ўдзел у тэсціраванні па адной вучэбнай дысцыпліне складае 16 100 рублёў. Грошы можна ўнесці ў любым аддзяленні «Беларусбанка». Атрымальнік — УП «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў», разліковы рахунак № 3632934510021, філіял № 529 «Белсувязь», код 720, УНП 190194148. РІКВ не нясе адказнасці за якасць і змест тэстаў для тэсціравання, якое праводзіцца іншымі, не названымі ў гэтым пераліку, установамі.

Гучная справа

ГАНДЛЯРЫ МІРАЖАМІ

Мімаволі «замбіраваныя» людзі сваімі добраахвотнымі ўзносамі дапамагаюць махлярам узводзіць «фінансавыя піраміды».

За сем гадоў будаўніцтва такой піраміды на тэрыторыі нашай краіны прадпрымальныя асобы ўцягнулі ў працэс каля 1,6 тысячы чалавек, дзякуючы чаму завалодалі больш як 1,7 мільёна долараў.

Паводле слоў намесніка начальніка Галоўнага следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Дзмітрыя ДАНІЛЬЧЫКА, нягледзячы на тое, што на лаве падсудных у рэшце рэшт апынуліся толькі дзесяць зламыснікаў, у стварэнні такіх структур як «Business Club ASTRAN», «Беларускі саюз узаемадзеяння і дапамогі», «ENERGEN CLUB», «ECONOM CLUB» узяла ўдзел значна большая колькасць несумленных грамадзян. Дарэчы, і саміх такіх «клубаў» ды «саюзаў» было больш — іх колькасць і назвы пастаянна мяняліся. Дзейнічалі арганізацыі па сумна вядомым вышэйзгаданым прынцыпе «фінансавай піраміды», сутнасць якога можна растлумачыць прыкладна так: той, хто апынаецца на версе апошняй, атрымлівае ўсё. Няцяжка здагадацца, што таму, хто ўнізе, застаецца... усё астатняе.

Кожны, хто хацеў трапіць у такія «элітныя ўстановы», павінен быў заплаціць уступны ўзнос. Больш людзей — больш узносаў, якімі распараджаецца, зразумела, групка спрытных лідараў, стваральнікаў «новага бізнэсу». Яны і куюць жалеза, пакуль шэраг даверлівых асобаў наіўна чакае свайго часу «разбагачэння». Схема «бізнэсу», здаецца, простая. Не зусім відавочным на пачатку следства было толькі адно: якім чынам можна падштурхнуць людзей да добраахвотнага развітання з немалымі грашовымі сумамі? Як можна абудзіць у іх жаданне ўступіць у «элітны клуб»?

Насамрэч ідэя заробку грошай на людзях, якія пад уздзеяннем пэўных знешніх фактараў страчваюць магчымасць крытычнага стаўлення да навакольных падзей, не новая. Наогул у перыяд дзесяці з 1996 па 2003 гады ў Расіі, Украіне, Літве, а таксама Германіі, Венгрыі, Чэхіі, Польшчы шырокае распаўсюджанне атрымалі арганізацыі, якія ажыццяўлялі сваю дзейнасць паводле спецыяльнай праграмы псіхалагічнага ўздзеяння на свядомасць грамадзян дзеля завалодання іх грашовымі сродкамі.

Такое ўздзеянне вядома пад назвай нейралінгвістычнага праграмавання, аднаго з самых супярэчлівых раздзелаў сучаснай практычнай псіхалогіі. Гаворка ідзе аб «замбіраванні» чалавека, падштурхоўванні яго з дапамогай пэўных псіхалагічных метадаў да пэўных дзеянняў насуперак яго волі.

Беларускія завадатары «новага бізнэсу» перанялі вопыт эфектыўнага выкарыстання нейралінгвістычнага праграмавання ў замежных «калег». Так, следству ўдалося высветліць, што адным з буйных арганізатараў праграмы псіхалагічнага ўздзеяння з'яўляўся Андрыяс Метцлер, прадстаўнік фірмы «Energen» у Германіі. Менавіта ён на вяршыні злачыннага сіндыката адказваў за ўсходні кірунак, праводзіў вучобу з кіраўнікамі «клубаў», выдаваў сертыфікаты, ажыццяўляў кантроль за «дакладнасцю выканання патрабаванняў праграмы». Абвінавачаных сустракаліся з гэтай асобай у Польшчы, дзе атрымлівалі ўзнагароды як «лепшыя менеджары». Паводле звестак чэшскіх праваахоўнікаў, спрытняка шукае зараз нямецкая паліцыя.

— У 1996-1997 гадах у Польшчы ў межах «TMGI CLUB» з асновамі спецпраграмы азнаёміліся Генадзь Новік, Тамара Аксюцік, Віталь Жалезнякоў, Наталля Савіцкая, Анатоль Трубнікаў і некаторыя іншыя асобы, якія «завезлі» дзіва-сістэму заробку грошай на тэрыторыю Беларусі, — расказвае Дзмітрый Данільчык. — Дарэчы, дзесяць асобаў, якія ў выніку апынуліся на лаве падсудных, мелі вышэйшую адукацыю, былі камунікабельнымі, спрактыкаванымі ў галіне псіхалогіі, і толькі адзін меў судзімасць...

З дапамогай досыць шырокай рэкламы стваральнікі беларускага аналага «фінансавай піраміды» таксама імкнуліся завабіць на спецыяльныя інфармацыйныя семінары як мага большую колькасць людзей. Маніпулятыўная апрацоўка ахвяраў заключалася галоўным чынам у стварэнні ілюзіі матэрыяльнай забяспечанасці членаў клуба. Некаторыя пацярпелыя прыгадвалі, як ім пастаянна паўтаралі пра далучэнне да нейкага «элітнага грамадства». Гэтага часам было дастаткова для з'яўлення жадання наведаць семінар.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

СЁННЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

«КАБ НЕШТА ЗМЯНІЦЬ — НЕ АБАВЯЗКОВА ПЕРАМАГАЦЬ У КОЖНАЙ БІТВЕ»

Колер вачэй — кары, валасы — цёмныя, рост — 172 сантыметры, вага — 84 кілаграмы; сямейнае становішча — не жанаты, дзяцей не мае; хобі — музыка, клуб — «Рэактар»... Так можна працягваць бясконца, бо гэты чалавек вельмі цікавы і рознапланавы. Хто ён? Гэта — дыджэй Лёша Капрызз, які за час сваёй працы ў музыцы адзначыўся ў такіх клубах, як «ЛеО», «Акварыум», «Рэспект», «Парк клуб Мінск», «Алькатраз», «Алусема», «Немо» (Гомель), «Ньюсіці» (Наваполацк), «Бомонд» (Віцебск), «Метро» (Магілёў), Славянскі Базар дыджэй-пляцоўка і шмат іншых. Удзельнічаў у многіх вядомых і маштабных мерапрыемствах. Першая прафесійна арганізаваная ім вечарына прайшла на пачатку 2000 года ў клубе «Рэактар», галоўным дыджэем, а таксама арт-дырэктарам якога ён цяпер з'яўляецца.

— Лёша, як даўно працуеш у клубе «Рэактар»?

— З 2001 года. Лічыце самі.

— А ці ёсць супрацоўніцтва з іншымі клубамі?

— Ёсць. Прычым не толькі з мінскімі, але і ў іншых гарадах: «Калізей 2006» (Гродна), рэстаран «Блюз» (там жа), комплекс адпачынку «Сіці-цэнтр» (Мазыр)... Але ў ролі дыджэя я выступаю толькі ў клубе «Рэактар».

— Зразумела. І як часта ты наведваеш гэтыя клубы? Яны ж усе ў розных гарадах, знаходзяцца далекавата ад сталіцы.

— Стараюся раз на тыдзень ездзіць: то туды, то сюды. З раніцы саджуся за «баранку» свайго любімага аўто і ў дарогу.

— А не сумна аднаму ў машыне пераязджаць з горада ў горад?

— А я «музло» на поўную катушку і хуткасць на 160. Няўжо ў такой абстаноўцы можа быць сумна?! Вядома ж, не. Вось так і вандрую. Звычайна за дзень спраўляюся з усім, што запланаваў. З самай раніцы адпраўляюся ў дарогу і да ночы вяртаюся ў сталіцу.

Мой стыль — «Вясёлае электра»

— Скажы, калі ласка, а як атрымаўся такі псеўданім — ЛЁША КАПРЫЗЗ?

— Ды неяк яшчэ ў пачатку працы, калі трэба было вызначыцца з найкам, сядзелі мы з сябрамі, думалі-думалі, што выбраць каб і цікава, і салідна было. Яны мне шмат варыянтаў прапаноўвалі, усё гарталі нейкія часопісы. А я кажу: не і не, не падабаецца. Карацей кажучы, «капрызы» ў мяне былі. Ну вось і прыйшла ідэя — хай я буду звацца ЛЁША КАПРЫЗЗ, прычым з дзвюма літарамі З.

— Для тых, хто не разбіраецца ў музычных стылях, скажы, як правільна назваць ці абазначыць кірунак тваёй работы?

— «Вясёлае электра», ці як я называю сам свой стыль «Верка Сярдзючка». Таму што пад мае кампазіцыі хочацца танцаваць, ногі проста самі сабой ірвуцца ў скокі. А калі сур'ёзна, абазначыць стыль маёй працы можна як клаб-хаус ці прагрэсіў-хаус, басслайн і крышачку пампін.

— А колькі ўжо дыскаў выпусціў са сваёй музыкай?

— За 4 гады работы ў клубе «Рэактар» больш за 16. Гэта і «Клубны настрой», такіх каля 6, і «Макс мікс фестываль», і «Чувства», і «Рэактаманія», і шмат яшчэ якіх. Увогуле, стараюся выпускаць па 4 дыскі раз у два месяцы.

— Ого! А гэта не зашмат?

— Не. Калі творчая асоба працуе эфектыўна, гэта — мала.

— Раскрый, калі ласка, невялікі сакрэт, як нараджаецца музычная кампазіцыя? Пад настрой ці яна доўга выношваецца, а потым выдаецца на танцпол?

— Мне асабіста для стварэння чарговага музычнага шэдэўра патрэбна натхненне, нейкі эмацыянальны штуршок: радасць нейкая ці, наадварот, можа любоўная няўдача. Тады «Верка Сярдзючка» патрабуе выхаду ў свет.

— З кім з больш-менш вядомых дыджэяў, выканаўцаў табе давялося працаваць?

— Шмат іх было і ёсць. Гэта і Мікса-дэнс, «Хай-фай», Бумбокс, «Без білета», Квест пісталс, дыджэй Боча, Цветкоф, Слімаф, Врунгель... Дарэчы, я з многімі з іх не проста супрацоўнічаю, але яшчэ і сябрую. І едуць яны да нас у клуб не з-за грошай, а з-за добрай, прыемнай, цёплай абстаноўкі, сяброўскіх адносінаў.

— А дзе ты атрымаў музычную адукацыю, калі такая ёсць?

— Нідзе. Калі браць музыку. А так, раней я навучаўся ў БДПУ імя М. Танка на факультэце псіхалогіі. Гэта так, да слова (*усміхаецца*).

— Дык ты псіхолаг з вышэйшай адукацыяй?

— Няскончанай трошкі, зусім трошкі.

— Чаму так? Патлумач, калі ласка.

— Да чацвёртага курса давучыўся, а потым мяне адлічылі.

— За што? Мабыць, двоек шмат атрымліваў?

— Не. Я ўвогуле быў выдатнікам: і ў школе, і ва ўніверсітэце. Проста не склаліся адносіны з кіраўніцтвам дэканата.Там доўгая гісторыя. Але я збіраюся закончыць універсітэт. Трэба давесці справу да канца. Тым больш, што псіхалогія — рэч у жыцці неабходная.

— Ведаю, што акрамя ўсяго іншага ты працуеш у школе дыджэяў. Раскажы аб гэтым праекце.

— Гэта школа, якая дае навыкі дыджэйскага майстэрства. Заняткі мы праводзім, я асабіста праводжу, па гадзіне ў суткі на працягу 7 дзён, пасля чаго выдаецца пасведчанне аб заканчэнні школы з прысваеннем афіцыйнага звання — дыджэй. Ганарова, пачэсна. Я не стаўлю сабе за мэту зарабіць грошы на гэтым. Не. Проста хочацца даць людзям шанц праявіць сябе творча.

— І ці шмат выпускнікоў у школы дыджэй?

— Даволі многа. Больш за 50. Сярод іх: Лазаў, Дэні Кілер, Сцівер... Многія з выпускнікоў паехалі працаваць за мяжу, некаторых можна пачуць у клубе «Рэактар», «Белая вежа», «Алькатраз».

— Якімі якасцямі трэба валодаць, каб трапіць на навучанне ў гэтую школу? Можа, якую-небудзь спецыяльную музычную адукацыю трэба мець...

— Не, ніякай асаблівай адукацыі. Трэба проста любіць і адчуваць музыку, яе рытм. Гэта адзіная патрабаванні. І, безумоўна, павінна быць вялікае жаданне, прага да музычнай, клубнай навукі. Без гэтага нікуды.

«Я ніколі не жадаю чалавеку дрэннага...»

— Ты столькі часу надаеш працы. А як жа асабістае шчасце?

— На асабістае, як ты кажаш, шчасце часу не застаецца. Я ледзь знаходжу яго на сон, а не тое што... (*уздыхае*).

— Гэта значыць, што ты пакуль не жанаты, свабодны?

— Так, жаніцца пакуль не збіраюся. Няма з кім. Так што я свабодны (*падміргвае*).

— А ўвогуле, ці верыш ты ў каханне?

— Зараз, можа, я буду разважаць як псіхолаг, але каханне — гэта, хутчэй за ўсё, нейкае пачуццё, якое ствараецца ў галаўным мозгу пры дапамозе імпульсу, які ўзнікае пры сустрэчы людзей рознага полу і якое прымушае іх прывыкаць адно да аднаго. Вось і лічаць, што гэта каханне. У мяне яго няма ўжо 2 гады. Не адчуваю, няма часу.

— Скажы, калі ласка, ці існуе для цябе нейкае табу? Калі так, то на што менавіта?

— Існуе. Я ніколі не жадаю чалавеку дрэннага. Нават, калі «даталі» надта-надта. Магу з гарачага сказаць нешта крыўднае, але потым адразу ж папрашу прабачэння.

— Калі б табе прапанавалі напісаць пісьмо да Бога, што б ты ў яго папрасіў?

— Міру на Зямлі, менш дурных людзей, якія чамусьці заўсёды імкнуцца быць першымі. Хоць не маюць для гэтага ніякіх здольнасцяў. Каб людзі ніколі не хварэлі.

— А асабіста для сябе?

У мяне пакуль усё ёсць, а тое, чаго няма — я здабуду сам. Калі ўсё заўсёды добра — жыць будзе проста нецікава. А як можна зразумець, што табе добра, калі табе добра, калі ўсё аднолькавае, кожны дзень і няма за што змагацца. Жыццё ў такім выпадку становіцца бескарысным.

— І не кажы. Давай тады аб больш прыемным. Ці ёсць у цябе нейкая мара, самая-самая?

— Лексус. Я вельмі люблю аўтамабілі: хуткія, бяспечныя. Хачу прадаць сваю «старэнькую» і купіць новую прыгажосць (*пазірае на фотаздымак сваёй мары*).

— А што на 2-м месцы пасля аўтамабіля?

— Сям'я. Хачу жонку, дзетак.

— Сур'ёзна?

— Жартую, вядома ж. Пакуль аб сям'і не думаю. Праца займае ўсё маё жыццё.

«Хачу выдаць кнігу для работы арт-дырэктара...»

— Лёша, як ты лічыш, мы выбіраем прафесію, ці яна нас?

— Яна нас. Кожны чалавек таленавіты па-свойму. Застаецца толькі вызначыцца, у чым.

— Кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Ці не збіраешся ты змяніць поле сваёй дзейнасці? Скажам, стаць маляром-тынкоўшчыкам.

— Не, маляра-тынкоўшчыка з мяне дакладна не атрымаецца. А вось з літаратурнай справай я пасупрацоўнічаў бы і, дарэчы, збіраюся гэта зрабіць. Хачу выдаць кнігу для работы арт-дырэктара, дзе будзе змешчана ў выглядзе даведніка інфармацыя з гэтай сферы.

— Калі параўноўваць клубнае жыццё ў нашай краіне з іншымі «клубнымі» дзяржавамі, то...

— То ў нас яго поўная адсутнасць. Мы — нуль. Нам яшчэ многаму трэба вучыцца. Там іншая музыка, якая ў нас не заўсёды ўспрымаецца добра. У межах сваёй краіны — мы малайцы. Нават, калі параўноўваць сталічныя клубы з перыферычнымі, то ў прынцыпе розніца невялікая, даганяюць сталіцу. А вось за межамі краіны нам пакуль няма з кім мерацца сілай. Слабыя яшчэ.

«Я заўсёды выдумляю нешта новае»

— Пасля нашай доўгай гутаркі, я магу смела зрабіць выснову, што чалавек ты вясёлы, імкнешся да новых знаёмстваў, заўсёды душа кампаніі.

— Калі я трапляю на нейкае свята, то са мной не засумуеш. Яшчэ са школы такі, заўсёды ў нейкіх праектах, заўсёды нешта выдумляю. Мне патрэбна творчасць. Люблю знаёміцца з новымі людзьмі, гутарыць з імі на розныя тэмы. А ў гутарцы разумею праўду. Люблю пабалбатаць. Ды ты і сама ўжо, мабыць, заўважыла? (*усміхаецца*).

— Так, з табой можна лёгка гутарыць, ты з вясёлым настроем.

— Я такі быў у школе, такім і ва ўніверсітэт прыйшоў. Мне надта хацелася трапіць у трупу тэатра «Мы», нашага, універсітэцкага. Прыйшоў я да іх і кажу, дайце мне ролю, у мяне ёсць вопыт работы ў тэатры. Тады там іграў Глеб Давыдаў. І дабіўся свайго, мяне ўзялі. Праўда, калі Глеб у галоўнай ролі, то мне спачатку маленькія давалі выконваць. Нешта заўсёды выдумляў у тэатры. І ў клубе гэтак жа. Заўсёды выдумляю нешта новае. Я тут і дызайнер, і рэжысёр-пастаноўшчык, і стыліст, і вярстальшчык, і шмат яшчэ хто. Люблю шматбаковую творчасць.

— Дзякуй табе, Лёша, за цікавую гутарку. Можа, ты хочаш нешта дадаць да ўсяго вышэйсказанага?

— Гутарка, на жаль, скончана. Але дадам яшчэ з задавальненнем. Я люблю збіраць усякія разумныя думкі. У мяне іх ужо шмат. Дык вось, хачу працытаваць адну з апошніх запісаных мною: каб нешта змяніць — не абавязкова перамагаць у кожнай бітве.

— Насамрэч, слушная думка. Дзякуй!

З капрыЗЗным дыджэем гутарыла студэнтка БДПУ імя М. Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Трохкутнік

ЦІ МОЖНА ЦЯЖАРНЫМ СТРЫГЧЫСЯ І ВЫШЫВАЦЬ КРЫЖЫКАМ?

Тлумачыць перынатальны псіхолаг Ірына САМУЦІНА:

Амаль усе забабоны ідуць з глыбокай старажытнасці, таму для прастаты адразу падзелім іх на «раней» і «цяпер».

1. Вышываць, вязаць — дзіця можа заблытацца ў пупавіне.

Раней лічылася, што жанчына, якая занадта шмат часу надае вязанню, вышыванню, шыццю, перастае рыхтавацца да родаў. З-за гэтага яны могуць прайсці цяжэй, чым трэба.

Цяпер гэтыя заспакаяльныя заняткі нават раяць з адзіным АЛЕ — не займацца імі занадта доўга. Бо сядзенне ў адной паставе можа прывесці да недахопу кісларoду ў дзіцяці.

2. Падстрыгаць валасы — укарочваць дзіцяці век.

Раней доўгія валасы былі прыметай здароўя і прыгажосці. Стрыжаныя — дакладнай прыметай хворай жанчыны, у якой па азначэнні не магло нарадзіцца здаровае дзіця.

Цяпер псіхолагі нават раяць падчас цяжарнасці часцей бываць у касметолага, цырульніка, сачыць за сабой, любіць сябе. Ізноў жа адзінае АЛЕ: пры цяжарнасці наш гарманальны фон можа выкінуць жарт — пры афарбоўцы валасы прымуць зусім іншы колер. Хоць на дзіцяці гэта, вядома, ніяк не адаб'ецца, але можа сапсаваць настрой маме.

3. Нельга загадзя рыхтавацъ пасаг — дзіця можа нарадзіцца з праблемамі або наогул мёртвым.

Раней пры вялікай смяротнасці сапраўды лічылася, што не варта загадзя траціцца на дзіцячыя рэчы. Для бедных гэта было дорага. А ў багатых, калі дзіця памірала, ложкі і пялёнкі, якія не спатрэбіліся, толькі выклікалі залішнія негатыўныя эмоцыі.

Цяпер, наадварот, загадзя прыгатаваныя рэчы даюць будучай маме спакой і ўпэўненасць, што, калі яна вернецца з радзільнага дома, не давядзецца насіцца па крамах, а ўсё будзе гатовае. Псіхолагі лічаць, што гэта нават станоўча адбіваецца на працэсе родаў.

4. Нельга фатаграфаваць або маляваць цяжарную, інакш развіццё дзіцяці спыніцца.

Раней фатаграфавалі і малявалі партрэты часцей за ўсё багатых і знатных жанчын. А здароўем яны адрозніваліся далікатным, што вяло да частых выкідышаў або нават смерцяў саміх парадзіх. Ніхто не вёў статыстыку, колькі намаляваных сялянак шчаслива нараджалі дзяцей.

Цяпер захаваць шчаслівыя моманты цяжарнай мамы можна і партрэта. Потым будзе лягчэй растлумачыць дзіцяці, адкуль яно ўзялося, паказаўшы здымак.

5. Як мага даўжэй нікому не казаць пра цяжарнасць — можна сурочыць і наклікаць злых духаў.

Раней так лічылася зноў жа з-за высокай дзіцячай смяротнасці і бясконцай колькасці забабонаў. Рэальнай падаплёкі гэтаму няма.

Цяпер, аднак, псіхолагі таксама раяць даўжэй не казаць аб сваёй цяжарнасці. Тым больш, калі ў пачатку тэрміну ёсць нейкія праблемы. Вядома, што вялікая частка выкідаў прыходзіцца менавіта на першы трыместр. І калі здарыцца гэтая непрыемнасць, колькасць распытванняў можа яшчэ больш траўмаваць жанчыну.

6. Прысутнічаць на пахаваннях, мець стасункі з людзьмі, якія маюць фізічныя недахопы, — дзіця можа нарадзіцца непрыгожым і з адхіленнямі ў развіцці.

Раней лічылася, што жанчына павінна як мага больш глядзець на прыгожыя рэчы і адчуваць станоўчыя эмоцыі. Гэта адаб'ецца на знешнасці дзіцяці.

Цяпер гэта, мабыць, адзіныя забабоны, у якія па-ранейшаму можна верыць. Чым больш станоўчых эмоцый, тым больш шчаслівая мама і малое. На пахаваннях жа гора, памножанае колькасцю людзей, можа выклікаць толькі негатыўныя эмоцыі. А дзіця ўнутры адчувае настрой мамы. Таму і цяпер для цяжарнай жанчыны лепш глядзець толькі на прыгожыя рэчы, слухаць толькі тую музыку, якая выклікае радасць, і выпрабоўваць як мага менш негатыўных эмоцый.

Засцярогі, да якіх варта прыслухацца

Каментуе акушэр-гінеколаг Аляксандр ЗАХАРАЎ:

1. Нельга парыць ногі і прымаць вельмі гарачыя ванны.

— Гэта звязана з тым, што любыя ўздзеянні на ступні, дакладней, на рэфлекторныя зоны, змешчаныя там, знаходзяць водгук у нашым арганізме. Раздражненне ног ад гарачай вады можа выклікаць нават прырашэнне плацэнты да маткі. А гэта можа прывесці да крывацёкаў.

2. Паднімаць уверх рукі (пацягвацца, развешваць бялізну на вяроўках).

— Павялічваецца ўнутрыбрушны ціск, атрымліваецца эфект разрэджання. Ізноў жа ўнутраныя органы атрымліваюць нацяжэнне, узрушанасць. А гэта ўсё вядзе да павелічэння небяспекі выкідышу.

3. Рабіць фота- і электраэпіляцыю. Асабліва інтымных месцаў.

— Самі па сабе фота- і электраэпіляцыя не ўяўляюць небяспекі, яны ніяк не ўплываюць ні на маму, ні на дзіця. Іншае пытанне, што могуць быць закрануты нейкія рэфлекторныя зоны, што можа прывесці да ўзрушанасці ўнутраных органаў. Хоць гэта даволі індывідуальна, захапляцца гэтым я ўсё ж не раіў бы.

4. Качаць верхні прэс і наогул выпрабоўваць сур'ёзную фізічную нагрузку.

— У цэлым дакладна. Для цяжарных распрацаваныя спецыяльныя комплексы практыкаванняў, дзе выключаны ўзняцці цяжараў і качанне прэса — усё, што змяняе ўнутрычэрапны ціск і спрыяе тонусу ўнутраных органаў.

5. Насіць абцасы.

— Гэтае правіла з разраду «беражыце сябе». На абцасах лягчэй спатыкнуцца і ўпасці. Тым больш цяжарным, якія не паспяваюць прывыкнуць да вагі, якая змяняецца, перараэмеркаванню вагі на пазваночнік, а таксама змяшчэнню цэнтра цяжару і змене восі цела.

Доктар раіць...

ХРАНІЧНАЕ НЕДАСЫПАННЕ: ГАЛОЎНАЕ НЕ КОЛЬКАСЦЬ, А ЯКАСЦЬ

Хранічнае недасыпанне для большасці з нас сёння стала ўжо нейкай нормай, з якой мы даўно і ціха змірыліся. Праца, вучоба, дзеці, хобі, сябры — як паспець усё гэта? Часу катастрафічна не хапае, і мы пачынаем паступова скарачаць колькасць сну.

Спачатку на гадзіну, потым — на дзве, а праз нейкі час са здзіўленнем заўважаем, што прачынацца становіцца ўсё складаней і складаней, памяць чамусьці (!) імкліва пагаршаецца, з'явіліся праблемы са здароўем, пад вачыма з'явіліся цёмныя кругі. Усё гэта — наступствы недасыпання, як сцвярджаюць вучоныя. Але самае жудаснае — мы прывыкаем да такога становішча рэчаў, лічым, што нічога страшнага не адбываецца. Жывуць жа людзі... Але ці ёсць выхад з гэтай сітуацыі? Ці можна высыпацца ў будні і пры гэтым не траціць на сон увесь вольны час? Парады дае **ўрач-кардыёлаг Ірына ПУКШАНЕЦ**.

Колькі спаць?

Цяпер вучоныя ўсё часцей прыходзяць да высновы, што для нармальнага самаадчування чалавеку цалкам неабавязкова спаць 8 гадзін, як лічылася раней. Цікавы ў гэтым сэнсе эксперымент быў праведзены імі ў Сан-Дыега (ЗША): яшчэ ў 1982 годзе яны апыталі каля мільёна (!) чалавек ва ўзросце ад 30 да 90 гадоў з тым, каб высветліць, колькі часу яны трацяць на сон. Праз 6 гадоў, у 1988 годзе яны паўторна апыталі тых жа людзей і са здзіўленнем выявілі, што смяротнасць сярод тых, хто спаў 8 гадзін і больш або менш за 4 гадзіны, значна вышэй, чым сярод тых, хто спаў 7—6 гадзін. На жаль, пакуль вучоныя не могуць знайсці тлумачэння гэтаму феномену.

Падобны эксперымент правялі японскія вучоныя з Універсітэта Нагоя, апытаўшы каля 110.000 чалавек. Паўторнае апытанне адбылося праз 12 гадоў, і ў выніку высветлілася, што тыя, хто спіць 7 гадзін, жывуць даўжэй, чым тыя, хто спіць больш або менш за 7 гадзін. Значыць, усё-такі 7 — неабходны мінімум? Або 4? Зноў блытаніна...

Эйнштэйну, каб выспацца, было неабходна 12 гадзін, Напалеон, лічыў, што спаць больш за 6 гадзін могуць толькі ідыёты, рымляне вучылі: «Спаць шэсць гадзін дастаткова і юнаку, і старому. Гультаяватаму дай сем, і нікому не дазваляй восем»... А Леанарда да Вінчы наогул вырашыў, што жыццё занадта каштоўная рэч, каб марнаваць яго на сон, і спаў таму ўсяго 1,5 гадзіны ў суткі, і то не за адзін раз, а кожныя 4 гадзіны па 15 хвілін.

На самай справе адказ на пытанне, колькі трэба спаць, можа быць толькі адзін: у кожнага свая норма, якая вагаецца дзесьці паміж 4 і 10 гадзінамі, калі, вядома, вы не да Вінчы. Засталося толькі гэтую сваю норму знайсці, а для гэтага прыйдзецца паэксперыментаваць. Бо мы ўсе розныя, і ў кожнага з нас ёсць свае асаблівасці — псіхалагічныя і фізіялагічныя, якія ўплываюць на сон, таму нельга ўраўноўваць усіх пад адзін грабянец.

Відавочна, што пры неабходнасці штодня хадзіць на працу, проста спаць «да ўпора», каб такім чынам выявіць сваю норму, не атрымаецца. Таму распрабуйце пачаць раней класціся. Напрыклад, калі раней вы спалі, скажам, 6 гадзін з 02:00 да 08:00 і не высыпаліся, то паспрабуйце спаць тыя ж 6 гадзін, але з 22:00 да 6:00. Лічыцца (і практыка паказвае, што апраўдана), што гадзіна сну да 24:00 роўная пасля апоўначы двум гадзінам. Значыць, у выніку атрымліваецца, што 6=8.

Якасць сну: як спаць?

На самай справе галоўнае — не тое, колькі спаць, але і як спаць. Пры нізкім ККДз сну можа не хапіць і 10 гадзін, а пры максімальным рэальна абысціся нават пяццю. Як зрабіць сон максімальна эфектыўным?

Імкніцеся класціся спаць да 24:00.

Выконвайце рэжым дня.

Вельмі важна выпрацаваць у арганізма звычку засынаць і прачынацца ў адзін і той жа час, каб паменшыць стрэс. Рэзкія перапады — заўсёды стрэс для арганізма, і вы будзеце пакутаваць днём ад сланлівасці, а ўначы — ад бяссоніцы. Менавіта таму ў выхадныя лепш прытрымлівацца таго жа графіка, што і ў будні.

Рэгулярна праветрывайце пакой.

У памяшканні, дзе вы спіце, не павінна быць душна. Спаць з адчыненым акном пры гэтым таксама не рэкамендуецца, асабліва калі на вуліцы холадна. Ідэальнай тэмпературай для сну лічыцца 18°С (часам можа вар'іравацца ў залежнасці ад індывідуальных асаблівасцяў арганізма ад 16 да 20°С).

Рабіце расцяжку.

Лічыцца, з-за нагрузкі пазваночнік да вечара скарачаецца на 1—2 см, а ўначы затым зноў аднаўляецца да нармальнай сваёй даўжыні. Відавочна, што арганізму патрабуюцца на гэта сілы, але можна пазбавіць яго ад лішняй работы, калі зрабіць перад сном расцяжку.

Сёння ў літаратуры можна знайсці вялікую колькасць інструкцый (у тым ліку і відэа) па выкананні падобнага роду расцяжак, таму не будзем тут апісваць тэхналогію. Яшчэ адзін важны момант — не захапляйцеся, робячы расцяжку. Вам не трэба паўнавартасная зарадка перад сном, інакш будзе складана заснуць.

Расслабляйцеся перад сном.

Калі мышцы напружаныя, то, па-першае, вам будзе складана заснуць, а па-другое, паменшыцца ККДз сну. Перад сном паспрабуйце паслядоўна расслабіць усе часткі цела, мысленна рухаючыся ад ног да галавы.

Не пераядайце не ноч.

Калі вы ляжаце спаць адразу пасля сытай вячэры, то арганізму спатрэбіцца шмат энергіі на тое, каб пераварыць ежу, а ў выніку — больш часу на ўзнаўленне. Адпаведна, больш часу спатрэбіцца на тое, каб выспацца. Акрамя таго, менавіта тыя, хто есць перад сном, часцей за ўсё пакутуюць залішняй вагой.

Рэкамендуецца есці прыкладна за 3 гадзіны да сну. Калі ж з-за пачуцця голаду вы не можаце заснуць, то лепш «абдурыць» арганізм і з'есці што-небудзь лёгкае (напрыклад, яблык або гароднінную салату). Рабіць гэта лепш адразу перад сном, каб паспець заснуць, пакуль вам зноў не захацелася есці.

Пазбягайце алкаголю перад сном.

Алкаголь — добрае снатворнае, але вось ККДз сну ён прыкметна памяншае. Тлумачэнне гэтаму простае: арганізм, замест таго, каб аднаўляць свае сілы, заняты нейтралізацыяй алкаголю.

Прымайце цёплы душ.

Душ перад сном дапамагае расслабіцца і супакоіцца. Акрамя таго, чыстая скура лепш дыхае і неабходны для аднаўлення кісларод лягчэй пранікае ў арганізм.

Калі рэгулярна выконваць гэтыя нескладаныя правілы, то можна не толькі пазбавіцца ад хранічнага недасыпання, але і скараціць колькасць гадзін, неабходных для сну, да мінімуму і выдзеліць больш часу для хобі, сустрэч з сябрамі і ўсяго, што вы раней не паспявалі.

Дарэчы...

Недасыпанне — вораг сэрца

Сон менш за 6,5 гадзіны ў суткі павышае рызыку інфаркту міякарда. Да такой высновы прыйшлі даследчыкі з амерыканскага ўніверсітэта Чыкага.

Даследаванні пацвердзілі, што паўнавартасны сон падтрымлівае натуральны баланс, спрыяе нармальнай рабоце арганізма. Недахоп сну, наадварот, вядзе да ўтварэння ў артэрыях небяспечных згусткаў.

Прамая залежнасць здароўя сэрца ад працягласці сну прымушае задумацца аб рэжыме няспання і начнога сну. Толькі сон не менш за 7 гадзін дазваляе арганізму цалкам аднавіцца для актыўнай дзейнасці на працягу наступнага дня.

Тэлесеткі

КІРОЎЦА ДЛЯ ВЕРЫ

Менавіта такая роля дасталася вядучаму Дзмітрыю Шуніну ў новай тэлепраграме на аўтамабільную тэматыку «Шунін і бландзінкі». Прэм'еру гэтага праекта пад маркай «усё, што вы хацелі ведаць пра маторы, але саромеліся спытацца» канал «ЛАД» пакажа ў бліжэйшую суботу, 17 студзеня.

Вядучы (Дзмітрый Шунін) і яго памочніца (Вера Карэтнікава) даследуюць аўтамабільны свет, трапляючы ў розныя пацешныя сітуацыі, пры гэтым памочніцы дастаецца роля паслухмянай вучаніцы, а вядучаму — вопытнага кіроўцы, які адказвае на бясконцыя наіўныя пытанні. Калі ж і яго ведаў на гэта не хопіць, на дапамогу прыйдуць... бландзінкі, многія з якіх, як высветлілася, не толькі бездакорныя кіроўцы са стажам, але ўвогуле асы ў тэхніцы! Напрыклад, бландзінка-інструктар пазнаёміць з прыёмамі правільнага ваджэння, а бландзінка-строгі міліцыянер у пагонах распавядзе пра розныя ДТЗ, іх наступствы і спосабы гэтых ДТЗ увогуле пазбегчы.

У кожным выпуску праграмы будуць падрабязныя аповеды пра «чатырохколавых сяброў», што былі ва ўжытку — як і дзе іх можна набыць, як правільна эксплуатаваць, даглядаць і абслугоўваць; а таксама тэст-драйвы новых аўтамабіляў, эксклюзіўныя рэпартажы з прэстыжных сусветных выставаў. Сваімі аўтамабільнымі гісторыямі падзеляцца і госці — зоркі эстрады, героі аўтаспорту, іншыя папулярныя ў краіне і за яе межамі людзі.

Шунін, бландзінкі і аўтамабілі — у эфіры «ЛАДа» кожную суботу.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Муз-news

The Champions: двухмоўны пазітыў

Гурт, які быў створаны летась з былога КВЗшніка, аранжыроўшчыка і спевака Nils'а і цемнаскурага рэпера Олісы за год умацаваў пазіцыі ўдзелам у некалькіх інтэрнацыянальных конкурсах і выпускам дэбютнага альбома.

Практычна ўвесь матэрыял на дыску быў напісаны на працягу года па схеме «экзотыка плюс рамантыка». «Паколькі нашы выступленні праходзяць на дзвюх мовах, то, прыходзячы на канцэрт, можна вывучыць і англійскую, і рускую, — жартуе Nils (Вячаслаў Лышчык). — А ўвогуле ўсімі сваімі канцэртамі мы прымнажаем пазітыў у душах слухачоў».

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ШКОЛЬНАЯ РЭФОРМА — ПАД ПРЫЦЭЛАМ МАНІТОРЫНГУ

У апошнія дні адыходнага года ў сценах Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы адбылося пасяджэнне камісіі, якая будзе займацца правядзеннем маніторынгу эфектыўнасці дзеянняў дзяржаўных органаў па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 года № 15 «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі». Не сакрэт, што пераход беларускай школы да 11-годкі стаў сур'ёзным выпрабаваннем для ўсіх: ад школьных педагогаў і кіраўнікоў устаноў адукацыі да спецыялістаў Нацыянальнага інстытута адукацыі, сістэмы перападрыхтоўкі педагагічных кадраў, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і кіраўнікоў галоўнага адукацыйнага ведамства нашай краіны. Новая канцэпцыя агульнай сярэдняй адукацыі вымагала распрацоўкі новых навучальных праграм, новага каляндарна-тэматычнага планавання па кожным вучэбным прадмеце, распрацоўкі і зацвярджэння новага Тыпавога вучэбнага плана і шэрагу іншых нарматыўна-прававых актаў.

— Пры пераходзе на абноўлены змест навучання перад намі стаяла няпростая задача: з аднаго боку, неабходна было ліквідаваць праблему вучэбных перагрузак, а з іншага — захаваць дастаткова высокі ўзровень ведаў нашых дзяцей, — патлумачыў журналісту «Звязды» **намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір ФАРЫНО**, на якога ўскладзены абавязкі намесніка старшыні камісіі па маніторынгу. — У распрацоўцы праграм узялі ўдзел 64 дактары навук, больш як 100 кандыдатаў навук, а таксама пераможцы і лаўрэаты Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года». Пасля правядзення ўніфікацыі вучэбных планаў абавязковая вучэбная нагрузка базавага ўзроўню была скарочана ў сярэднім на 15 працэнтаў , а ў 10—11-х класах — на 20 працэнтаў. Але мы не проста скарацілі гадзіны, а вылучылі самае галоўнае, пакінулі абавязковае ядро кожнага вучэбнага прадмета. Вучэбныя праграмы былі пабудаваныя па лінейным прынцыпе, што дазволіла пазбавіцца дубліравання інфармацыі. Зменшыўся аб'ём і складанасць падачы матэрыялаў, выключаны яго апісальны характар, залішак фактуры і празмерная дэталізацыя... Але цяпер трэба прааналізаваць, як непасрэдна ў школах прайшоў пераход на абноўлены змест навучання, з якімі цяжкасцямі сутыкаюцца ў сваёй штодзённай працы школьныя настаўнікі, кіраўнікі навучальных устаноў, самі вучні і іх бацькі.

— Ці не маглі б вы больш падрабязна патлумачыць, што стане прадметам маніторынгавых даследаванняў і якія навучальныя ўстановы трапяць у поле зроку вашай камісіі?

— Права адбіраць навучальныя ўстановы для ажыццяўлення маніторынгу атрымалі рабочыя групы ў рэгіёнах. Усяго створана 7 рабочых груп — па адной у кожнай вобласці і ў сталіцы. Іх узначальваюць намеснікі старшыняў аблвыканкамаў і намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў. — Плануецца ўзяць па адной школе, сельскай ці гарадской, у кожным з раёнаў Беларусі і па дзве школы — у кожным з раёнаў горада Мінска. Мы паставілі толькі адну ўмову — вывучаць сітуацыю трэба на базе звычайных агульнаадукацыйных устаноў, а не на базе навучальных устаноў новага тыпу, якіх змены ў адукацыйнай вучэбнага працэсу закранулі ў найменшай ступені.

У першую чаргу будзе высвятляцца забяспечанасць агульнаадукацыйных устаноў тыпавымі вучэбнымі планамі, вучэбнымі праграмамі па прадметах, праграмамі факультатыўных заняткаў, інструктыўна-метадычнымі лістамі па арганізацыі адукацыйнага працэсу, каляндарна-тэматычным планаваннем па ўсіх вучэбных прадметах. Зразумела, што нас цікавіць таксама, наколькі добра кіраўнікі і педагагічныя работнікі ведаюць нарматыўныя акты, што рэгулююць дзейнасць агульнаадукацыйных устаноў.

Другі напрамак маніторынгавых даследаванняў — забяспечанасць агульнаадукацыйных навучальных устаноў падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі на папяровых і электронных носьбітах (асабліва вучняў 9-х і 11-х штрыхкласаў), матэрыяламі, надрукаванымі ў навукова-метадычных часопісах у дапамогу педагогам.

Абавязкова будзем вывучаць, як арганізуецца ў навучальных установах шосты школьны дзень, ці праводзяцца спартыўна-масавыя, фізкультурна-аздараўленчыя і іншыя выхаваўчыя мерапрыемствы, наколькі ў школах запатрабаваныя факультатыўныя заняткі. Для таго, каб вывучыць меркаванні наконт арганізацыі адукацыйнага працэсу пры пераходзе школы на 11-гадовы тэрмін навучання, у тым ліку і эфектыўнасць правядзення факультатыўных заняткаў, прадугледжана анкетаванне настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў. У гэтым годзе базавая школа выпусціць удвая больш маладых людзей, таму для нас вельмі важна, каб кожны з іх быў уладкаваны ў жыцці і забяспечаны прафесійяй.

— Казімір Сцяпанавіч, а як будзе вырашацца пытанне з забеспячэннем вучняў 9-х і 11-х штрых-класаў, якія навучаюцца па пераходных вучэбных планах, падручнікамі ў трэцяй і чацвёртай вучэбных чвэрцях?

— Друкаваць дадаткова падручнікі для гэтых класаў было эканамічна немэтазгодна хоць бы таму, што пераходныя планы — з'ява часовая. Пэўны дэфіцыт падручнікаў будзе адчувацца толькі першыя два гады. Між іншым, для выдання падручнікаў дадаткова спатрэбілася б больш за 5 мільярдаў рублёў. Таму мы абралі іншы шлях — Нацыян

НЕДАСВЕДЧАНЫ ПРАДАВЕЦ,

альбо Што такое ГМА і з чым яго есці?

Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2008 года № 1115, у выпадку наяўнасці ў харчовых прадуктах генетычна мадыфікаваных складнікаў прадавец АБАВЯЗАНЫ давесці да ведама пакупніка (акрамя інфармацыі аб утрыманні ГМ кампанентаў на спажывецкай тары) ДАДАТКОВУЮ інфармацыю аб ГМА, пазначыўшы яе на цэнніках і (ці) іншымі спосабамі (з выкарыстаннем этыкетак, сцікераў, постараў і інш.), якія прымяняюцца для асобных відаў тавараў. Праведзены маніторынг паказаў, што далёка не ўсе гандлёвыя прадпрыемствы сталіцы адрэагавалі на новыя правілы.

У асобных магазінах увогуле не знайшлося ніякай дадатковай інфармацыі аб ГМА (генна-мадыфікаваных арганізмах). Самі работнікі заявілі, што прадукцыю з ГМ кампанентамі яны проста не заказваюць (хоць у продажы на той момант былі тавары з указаннем вытворцы «ўтрымлівае ГМА»). У некаторых супермаркетах для харчовых прадуктаў з ГМ кампанентамі адвялі спецыяльныя паліцы, аднак туды трапілі і натуральныя прадукты. Напрыклад, шакалад і кетчуп, якія ў спісе складнікаў маюць мадыфікаваны крухмал, хоць ён не з'яўляецца трансгенным. Хтосьці з прадаўцоў афарміў дадатковую інфармацыю аб таварах з ГМ кампанентамі асобным спісам. Цікава, што ў ім значыліся прадукты, якія не мелі на сваёй упакоўцы знака вытворцы ці пастаўшчыка «Утрымлівае ГМА». Усе пералічаныя выпадкі з'яўляюцца парушэннямі правілаў гандлю і цягнуць за сабой штрафныя санкцыі (між іншым, ад 2 да 20 базавых велічынь), аднак многіх памылак можна было б пазбегнуць, калі б прадаўцы мелі больш інфармацыі аб трансгенных прадуктах.

Большасць нашых спажыўцоў «нешта чулі пра ГМА, але не вельмі шмат». Тым не менш яны перакананыя ў шкоднасці такой прадукцыі і стараюцца яе не набываць.

Самі пакупнікі таксама не вельмі ясна ўсведамляюць, што ж гэта насамрэч такое — генна-мадыфікаваная ежа. Тым не менш яны перакананыя ў шкоднасці такой прадукцыі і стараюцца яе не набываць.

— Немагчыма прааналізаваць усе прадукты харчавання на ГМ кампаненты, — патлумачыў **намеснік кіраўніка Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра біябяспекі кандыдат біялагічных навук Барыс АНОШАНКА**. — Аднак бяспечныя харчовыя прадукты могуць быць выраблены толькі з бяспечных арганізмаў, таму наш цэнтр займаецца менавіта арганізмамі, а не прадуктамі. На сайце цэнтра ёсць раздзел «Генна-інжынерныя кампаненты ў прадуктах», дзе любы можа знайсці падрабязную інфармацыю па гэтай тэме.

Паводле слоў Барыса Аношанкі, у свеце да гэтага часу не выяўлена ні аднаго даказанага выпадку адмоўнага ўздзеяння ГМА на здароўе чалавека. Усе новыя гатункі трансгенных арганізмаў перад тым, як трапіць на рынак, праходзяць дасканалую шматгадовую праверку на біябяспеку. У Беларусі ў прамысловых маштабах ГМ-культуры не вырошчваюцца. Завозяцца да нас толькі трансгенная соя і кукуруза. Што датычыцца дарослага насельніцтва, то ніякіх абмежаванняў на ўжыванне прадуктаў з ГМ кампанентамі ў нас не існуе. А вось вытворчасць і продаж дзіцячага харчавання з выкарыстаннем трансгенных культур забароненыя.

Згодна з дзеючым заканадаўствам, уся харчовая прадукцыя, што трапляе на тэрыторыю нашай дзяржавы і мае ў сваім складзе сою ці кукурузу, павінна праходзіць абавязковую праверку на ўтрымванне ГМА. Між іншым, такой татальнай сістэмы кантролю за абарачэннем прадуктаў з ГМ кампанентамі больш няма нідзе ў свеце. Заслугоўвае ўвагі яшчэ адзін момант. У Расіі і краінах Еўропы прадукт лічыцца натуральным, калі доля ГМ кампанентаў у ім не перавышае 1 працэнта. Адпаведна на такім тавары не будзе маркіроўкі «Утрымлівае ГМА». Беларускія нормы ў гэтым сэнсе больш жорсткія, наш парог праходжання — 0 працэнтаў. Часта бывае, што расійскія ці еўрапейскія прадукты, якія завозяцца на нашу тэрыторыю, не маюць адпаведнай маркіроўкі (бо канцэнтрацыя ГМК у іх не перавышае 1 працэнта). Аднак для рэалізацыі на беларускім рынку пастаўшчык абавязаны нанесці на тавар дадатковую маркіроўку «Утрымлівае ГМА».

У Расіі спіс харчовых прадуктаў, якія падлягаюць абавязковай праверцы на наяўнасць ГМ кампанентаў, значна шырэйшы за беларускі (туды акрамя соі і кукурузы занесены бульба, рапс, рыс, таматы і г.д.). Год таму кіраўнік нашай краіны даў даручэнне ўсебакова прааналізаваць сітуацыю з трансгеннымі прадуктамі ў Беларусі і магчымасць пашырэння беларускага спіса. Як патлумачыў **начальнік упраўлення метралогіі Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Сяргей НЯФЁДАЎ**, спецыяльна створаная працоўная група правяла шэраг маніторынгавых даследаванняў, закліканых выявіць, якія яшчэ групы харчовых тавараў на нашым рынку (акрамя соевых і з утрыманнем кукурузы) могуць мець у сваім складзе ГМА. Правяраліся бульба, рыс, таматы. Было выяўлена некалькі выпадкаў утрымання ГМА, аднак канчатковая экспертыза ўстанавіла, што ўсе яны — фальшыва-станоўчыя (высокадакладнае абсталяванне спецыялізаваных лабараторый станоўча рэагуе нават на некалькі малекул натуральнага арганічнага забруджвання). Прааналізаваўшы сітуацыю, працоўная група прапанавала не пашыраць пералік прадуктаў, якія падлягаюць абавязковай праверцы на ГМА.

— На нашым рынку сёння няма і, паводле меркаванняў спецыялістаў, у бліжэйшыя некалькі гадоў не з'явіцца іншых трансгенных культур, акрамя соі і кукурузы, — патлумачыў Няфёдаў. — Сам аналіз на выяўленне ГМА даволі дарагі, гэтая сума аўтаматычна закладаецца ў цану. У выніку яе аплачвае спажывец.

Тым не менш, Міністэрства аховы здароўя пасля вывучэння сітуацыі з ГМА ў Еўропе, дзе апошнім часам пачаў «усплываць» трансгенны рыс, выступіла з прапановай унесці ў спіс прадуктаў, якія падлягаюць абавязковай праверцы на ГМА, гатункі гэтай культуры. Адпаведнае рашэнне пакуль не прынятае.

У 2007 годзе кожны жыхар Беларусі заплаціў за праведзенне аналізу на ГМА 200 рублёў. З пашырэннем спіса «падазроных» прадуктаў вырасце і доля затрат на абавязковую экспертызу. Аўтаматычна ўзрасце цана на ўсе харчовыя прадукты з утрыманнем рысу (піва, дзіцячае харчаванне і г.д.)

У канчатковым выніку выбар «ужываць трансгенныя прадукты ці не?» застаецца за спажыўцом. Галоўнае — даць яму поўную інфармацыю аб тавары. Аднак тут трэба памятаць, што ёсць выпадкі, калі высветліць «паходжанне» пэўнага кампанента тэхналагічна немагчыма (напрыклад, у соевым лецыціне, соевым алеі).

З верасня 2007 года на сайце Міністэрства гандлю з'явіўся спіс несумленных пастаўшчыкоў і вытворцаў, куды трапляюць парушальнікі беларускага заканадаўства. Інфармацыя туды трапляе па выніках праверак міністэрстваў аховы здароўя, сельскай гаспадаркі і харчавання і Дзяржстандарта. За першыя тры месяцы там з'явіўся ўсяго адзін запіс — на пэўнай партыі прадукцыі «Белрыбы» адсутнічала інфармацыя, што тавар выраблены з выкарыстаннем ГМА.

Інга МІНДАЛЁВА.

Хто каго?

«На кірмаш паехаў дзед — Жонку вывесці ў свет...»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

За што купіў, як кажуць...

Сямейка адна сынка ў школку збірала: новай адзежы накупілі яму, чаравікаў, кніжак. Завялі, як належыць — 1 верасня, з вялікім букетам — пакінулі, а гадзін праз колькі той дадому з'яўляецца, ранец у кут, крычыць:

— Э-эх, і што ж вы мне не сказалі, што гэта бадзяга аж на адзінаццаць гадоў?!

Вось і мы вінаватыя — не сказалі. Бо, адкрываючы конкурс на лепшы подпіс да здымка, самі не ведалі, што ён так расцягнецца! Думалі, можа, год альбо два, а яму і на сёмым канца не відно! Па яснай прычыне — «...патрэбны мы адно аднаму — газета — чытачу-падпісчыку, а падпісчык — газеце», — прызнае Валерый Гаўрыш з Пастаўшчыны. І ці не за ўсіх піша, што конкурс, рубрыка «Хто каго?» дае чалавеку цудоўную магчымасць выказацца, бліснуць сваім досціпам, веданнем мовы, а потым яшчэ і «ўпэўніцца ў тым, што нечага ж варты, калі над тваімі радкамі паўкраіны рагоча!.. Станоўчых эмоцый ад гэтага столькі, — працягвае Валер Мікалаевіч, — што ніякі лекаў не трэба!».

А значыць, газета — на правільным шляху?!

Прычым, як высветлілася, эканоміць з ёй можна не толькі на гэтым. Вось якім каштоўным вопытам дзеліцца спадарыня Целяшэўская з гарадскога пасёлка Івянец Валожынскага раёна:

Я святочную яду
Не вару каханку,
Падпішуся на «Звязду» —
Прынясуць да ганка...
Варта мужу ў рукі ўзяць,
На канапу сесці —
Калі — дзень, а калі й пяць
Не пытае есці!

(З таго ж ліста, але — хочацца верыць — не пра таго каханка:

Паглядзіце — ў мужыка
Рогі — аж да паталка
Мусіць, весела сустрэў ён,
Год «брацельніка»-быка»?).

Зрэшты, цяпер і тут — не пра яго, — пра «калегу» каня, яго кіроўцу, аўтамашыну... І як заўсёды — словамі чытачоў. «Спачатку, — піша ў сваім лісце спадар Старых з Гомеля, — мініанекдот, адным радочкам: «Ваздзіцелі КамАЗаў разглядаюць дарожныя знакі выключна дзеля цікавасці». Цяпер — верш:

Вадзіцель кабылы,
падобнай на клячу,
Кіроўцам машын
часта ставіў задачу:
З дарогі не збочу,
хоць і не трамвай.
Як хочаш аб'ехаць,
так і — аб'язджай»...
Скуль столькі нахабства?
Скажу вам адразу:
Той дзед быў калісьці
кіроўцам КамАЗа».

Цалкам магчыма.

Кім яшчэ? Ды прыгледзьцеся — услед за спадаром Нефідовічам з в. Любань, што на Лунінеччыне — гэта ж пан Быкоўскі да Паўлінкі

Ехаў на кабыле,
А Якімка, да яе ж, —
На аўтамабілі.
Ён разумнік, чалавек,
Гонар усёй вёскі!
Дык хіба ж Паўлінцы трэба
З клячаю Быкоўскі?

Ну зразумела ж, не. І па многіх прычынах — не каханы, раз, не разумнік, два, не маладзён, тры, не багач...

А хацеў жа быць ім! Прычым не толькі той, Купалаўскі, але і гэты, са здымка:

Дзед дачуўся, што фінансы
У ЗША «пяюць рамансы».
Накупіўшы латарэй,
Думаў стаць за ўсіх мудрэй:
З хаты вынес — да граша,
А не выйграў — ні шыша.
Жонка выперла во з дома,
Куды едзе — невядома...

Невядома — аўтарцы гэтых радкоў, спадарыні Чыгрынавай з в. Забалацце Вілейскага раёна. А вось у спадара Сітніка са Старадарожчыны сумненняў няма:

Калясіў дзед шмат па свету —
Усё шукаў сабе кабету,
Каб багатаю была, пажадана —
не з сяла...
Многа вёсен, многа вёрст
Кінуў ён каню пад хвост...
Чаму шчасцем твар цвіце?
Ці не баба — «на хвасце»?

А калі яшчэ і тая, што шукаў?..

Цуды, як вядома, здараюцца! Адно — не так часта, як хацелася б — асобным дзядам:

Па аб'яве дзед Панас
Выбраўся ў сваты...
Каб «Рэно», не тарантас,
То станоўчы б быў адказ...
А так — едзь дахаты, —

напісала пра гэтага кіроўцу жонка спадара Гаўрыша Вальдэмара Альбертаўна. І ў тым, што даедзе, яна не сумняваецца. Як няма сумневу і ў спадара Дубовіка з Бярэзіншчыны, бо таксама ж чалавек вясковы, а, значыць, перавагі коннай язды цудоўна ведае:

Даішнік дзеда не спыняе,
Правы кіроўцы не пытае,
Рулюе — п'яны ці «пад мухай»,
І не баіцца слова: «Хукай».

А таму — парада ад спадарыні Лабажэвіч з Клецка:

Хто выпіўшы руліць сядае,
Няхай канька сабе купляе,
Каштуе менш... І балазе —
Ён сам дадому прывязе.

Што далей будзе? Як сведчаць шматгадовыя назіранні за гэтай вельмі прыгожай і разумнай жывёлінай — пастаіць конь, пачакае, пакуль нехта з хаты выйдзе — «прыме» яго каштоўны груз. А не прыме, дык у добрае надвор'е можна і на возе ноч паспаць. Рамантыка...

Праўда скончыцца яна можа...

Дрэнна — на першы погляд. А як на другі — дык лепей не трэба. Карацей — мужык адзін (некалі ў кіно паказвалі) намуразаўся дужа і на возе заснуў, а зайздроснікі над ім пажартаваць рашылі: выпраглі каня, самі — падцягнулі калёсы да плота, між шчыкецін аглоблі працунулі, канька на той бок перавялі і запрэглі.

Мужык раніцай прачнуўся, убачыў, як ён «плот пераехаў» і...

Мякка кажучы, здзівіўся. Вельмі.

Пасля гэтага, казалі, ніякай гары ў рот не бярэ, завязаў. Во як падзейнічала!

Каб на ўсіх так...

Але ж пра гэта нават марыць нельга. А таму ўжо знаёмы нам Валерый Гаўрыш (з жонкай Вальдэмарай Альбертаўнай) *Збыў аўто — купіў каня.*
А чаму? Вядома:
Хопіш лішку, дык ён сам
Давязе да дома.

Да таго ж —

Што той трактар, што машына?
Конік — выгадна і чынна:
Завядзёнка ў сялян —
Ёсць Буланчык, —
значыць пан!

Сцвярджае так спадар Нефідовіч з Лунінеччыны. І дадае, што «адраджаем зараз вёску, але неяк не па-боску» — выбарна, што вяскоўцы кароў цяпер зводзяць — сілы не тыя, а вось без каня — пакуль што ніяк.

Адкуль (і ўжо ад іншага аўтара) сур'ёзны, нават сумны подпіс да здымка:

Нешта не радуе аўтаэкскорт
Рыжую гэту кабылку:
Коней звялі, ды скажы,
мой народ
Ці не зрабілі памылку?

Пытанне гэта — ад Валерыя Гаўрыша з вёскі Навасёлкі Пастаўскага раёна. Аднак турбуе яно і гараджан! Да агародніка-дачніка, сябры свайго па шчасці-няшчасці звяртаецца спадар Астроўскі з Мінска — з рытарычным пытаннем:

Каб быў конік, быў вазок,
Ты б на дачу ці валок
Два вядры ў сваіх руках
І вандзэлак на плячах?

Ну, зразумела ж, не...

А эканомія якая?! На тым жа бензіне:

Іншамарка ездзіць шпарка,
(Ці сядзіць? У нас на карку?)..
Конік — хоць ідзе і ціха —
На дарогах — меней ліха.

Да таго ж — як працягвае спадар Дубовік з Бярэзіншчыны — і пра экалогію даўно падумаць пара:

Модных «мерсаў»
стала болей —
Копцяць нашы гарады...
Запрагайма, хлопцы, коней —
Хопіць сена і вады!

Да таго ж, мяркуючы па здымку:

Хоць і едзе конь не шпарка —
Не абгоніць іншамарка!
Так што тут — пардон-мерсі —
Меней ты, браток, фарсі! —

заклікае вадзіцеля аўто спадар Сітнік. Але ж — пры ўсіх перавагах —

Транспарт той экалагічны,
Транспарт той эканамічны,
Ды яшчэ і экзатычны...
А наўрад ці будзе звычным, —

сцвярджае спадарыня Гудачкова з Жыткавічаў.

Таму самы час цяпер вярнуцца «назад», да аўтамабіляў. І тут абавязкова трэба заўважыць, што на тэрыторыі Беларусі яны не выпускаюцца, таму гэткае распаўсюджанае ў нас слова іншамарка, мякка кажучы, не дакладнае. Трэба неяк без яго, а тым больш, што дакладных у нас... Аданіце:

Кабыліцу сваю дзед
Пужкаю пагладжвае
А шыкоўны «драндулет»
Ззаду прытармажвае.
Разумею я яго —
Ён крыху знячэўлены:
Як ты пойдзеш на абгон,
Калі ў ім не ўпэўнены? —

за кіроўцу машыны піша Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна.

Тыя ж думкі ў спадара Барысёнка з Ушаччыны:

Цішэй едзеш —
далей будзеш —
Не патрэбен тут балет!
На дарозе пільнасць згубіш, —
Трапіш, брат, у лазарэт.

...Што яшчэ ўгледзелі чытачы на здымку? Ну зразумела ж, людзей на абочыне:

Пешаходаў шмат наўкола,
Але ж гэта — не прэстыж...
Зараз модна быць на колах,
Ды й яшчэ каб на якіх! —

усклікае сям'я мінчан Астроўскіх.

Бы падслухаўшы іх, спадарыня Лабажэвіч прыгледзелася да тых самых колаў. Што ўбачыла? Ды відавочнае:

Амаль аднолькавыя шыны
Ў павозкі гэтай і ў машыны...
З паў-слоўца конік разумее,
Машына — гэтак не ўмее.

Хоць яна (вось гэта, са здымка) і не зусім звычайная. Спадар Томкавіч з Вілейкі літаркі «СТВ» на капоце ўгледзеў. І таму за журналістаў са сталічнага тэлеканала нават абяцае:

Буйным планам вас пакажам
У суботу й сераду —
За змястоўным рэпартажам
Станавіцеся ў чаргу!

Дзеда з канём, трэба разумець, ужо здымаюць. Праўда, ззаду чамусьці...

І каб толькі гэта ды незразумелым было! На тым самым тэлебачанні... Вось прыпомніце — раней у аснове ўсіх песняў прыгожыя вершы ляжалі, да іх кампазітары пісалі музыку (ці наадварот). Потым дадаваўся прыгожы голас... Цяпер для выступленняў гэтага не трэба, трэба — падтанцоўку запусціць. У выглядзе маладых, прыгожых і распранутых хлопцаў-дзяўчат, альбо (у нашым выпадку і па меркаванні спадара Адамовіча з Чэрвеня) — аўтамабіля: *Адзін саліст* (гэта, трэба разумець, пра каня? — **Аўт.**)
І два кіроўцы
СТБ —
На падтанцоўцы.

Вось так яна і ў нашым конкурсе з'явілася. Нельга ж без нечага новага?

Як нельга і без старога ці — так дакладней! — вечнага. Ну вось успомніце:

Ехаў дзедка на кірмаш,
З ім на возе баба...

Сто да аднаго — што з героямі далей было паводле слыннага Кандрата Крапівы, вы помніце! Але ж у чытачоў «Звязды» і перапевы ёсць. Вось што спадарыня Чыгрынава, напрыклад, піша:

На кірмаш паехаў дзед —
Жонку вывесці ў свет.
Так хваліўся там Буланым,
Што забыўся недзе Ганну.

Цяпер во едзе дамоў, бядак. Фасону, як быццам, не губляе, але ж відавочна (прынамсі, спадарыні Тарасік з Мінска):

Во, і каню не мілы свет —
Згубіў бабу недзе дзед.
А яна ж, хоць і «піла»,
Трэба дома каб была!

Вось на гэтай жыццесцвярджальнай ноце і завершым мы чарговы агляд. Засталося а) падзякаваць усім, хто напісаў нам, б) папрасіць прабачэння ў тых, чые радкі не змясцілі, в) нагадаць, што на папярэднім конкурсным здымку былі тры закапочаныя мужыкі — на лаўцы, каля крамы «Детский мир» і д) паведаміць, што лепшыя радкі пра іх, пра гэтых мужыкоў (па меркаванні вялікага чытацкага журы) склалі Валянціна Апанасаўна Гудачкова, Вольга Паўлаўна Лабажэвіч, Валерый Мікалаевіч Гаўрыш, Уладзімір Уладзіміравіч Сітнік, Сцяпан Паўлавіч Нефідовіч і Любоў Міхайлаўна Чыгрынава, з чым, крыху паспрачаўшыся, згадзілася і журы рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе квартальнай падпіскі на дарагую (сэрцам) «Звязду» накіроўваецца ў вёску Забалацце, што на Вілейшчыне. Калі хочаце, каб да вас, — пішыце. Здымак, як заўжды, дадаецца. Умовы — не мяняюцца — кароткія (не больш 8 радкоў), трапна, смешна і, калі ласка, разборліва.

Валянціна ДОЎНАР.

Шануй родную зямлю!

НА ВАДОХРЫШЧА ДА СВЯТОГА ЯНА

На свята Вадохрышча да крынічкі Святога Яна прыходзяць людзі, набіраюць ваду. Асвяціць яе, павіншаваць усіх прыязджае мясцовы святар. Збіраюцца звычайна жыхары Верчыцаў, Шчытна, Астраўка. Крыніцу Святога Яна тут шануюць з даўніх часоў. Яна выбіваецца з зямлі на левым беразе ракі Ружанкі, якая працякае па ўрочышчы з загадкавай назвай «Цёмныя». Распавядаюць, што назву гэту дала яшчэ ў далёкім 1787 годзе сама Кацярына II. Недалёка праходзіць так званы Кацярынінскі тракт праз Ружаны і Слонім. Імператрыца праязджала неяк надвячоркам, і тутэйшы яловы лес ёй падаўся занадта змрочным, яна некалькі разоў вымавіла: «Цёмна! Цёмна!». Вось і сталі называць лес «Цёмныя», толькі чамусьці ў множным ліку, маючы на ўвазе, відаць, цёмныя аграмадныя яліны.

Дык вось крынічка заўсёды была светлым праменьчыкам на краі гэтага цёмнага царства. А ведалі яе людзі і карысталіся гаючай вадой даўным-даўно. Старшыня Варанілавіцкага сельсавета Віктар Руды расказаў, што гэта месца літаральна абрасло легендамі і паданнямі. Старажылы казалі, што раней тут стаяла статуя Святога Яна. Святы быў выразаны невядомым майстрам з дуба ў рост чалавека. Левай рукой Ян паказваў на тое месца, адкуль біла крыніца. Мясціне пакланяліся яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай, тутэйшыя краязнаўцы знайшлі пісьмовыя сведчанні на гэты конт. А пры Польшчы, да вайны, як згадвалі вяскоўцы, на крыніцу прыязджаў ксёндз, тварыў малітву. Там была каплічка, абсталяванае месца для набірання вады.

Але падчас вайны ўсё разбурылася, прыйшло ў заняпад, — распавяла жыхарка суседняга хутара Ірына Францаўна Цяцерская. А вось сама крынічка не перасыхала, яна цякла з зямлі маленькай ручаінкай, і людзі прыходзілі да яе, стараліся ўмыцца крынічнай вадой. У ваколіцах лічылася, што крыніца Святога Яна дапамагае вылечваць хваробы вачэй.

І вось дачакалася крынічка свайго часу, прыйшлі людзі, пачысцілі і добраўпарадкавалі месца вакол яе, пабудавалі дарожкі з парэнчамі, каб зручней было падыходзіць, абсталявалі месца, дзе можна браць ваду. Людзьмі, што паклапаціліся пра крыніцу, былі вайскоўцы. Першы раз давялося пачуць аўтару гэтых радкоў, як крыніцу адраджалі ваенныя. Звычайна гэтай справай займаюцца актывісты царкоўных прыходаў, школьнікі, сельгаспрадпрыемствы.

Камандзір часці падпалкоўнік Юрый Чмель расказаў карэспандэнту «Звязды», што яго падначаленыя, афіцэры і салдаты, з вялікай увагай паставіліся да прыроднага помніка з цікавай гісторыяй, які воляй лёсу апынуўся на тэрыторыі іх часці. Пэўную работу па добраўпарадкаванні яны правялі, а цяпер стараюцца падтрымліваць тэрыторыю ў чысціні, з задавальненнем ужываюць чыстую крынічную ваду. А на свята Вадохрышча, калі збіраецца мясцовае насельніцтва, жыхары ваеннага гарадка, абавязкова прыходзяць і вайскоўцы.

Цікава, што недалёка ад гэтай крыніцы, літаральна побач, б'е яшчэ адна. Другая крынічка струменіць з зямлі фактычна ў агародзе дома Рэгіны Ясінскай, суседкі Ірыны Цяцерскай, пра якую згадвалася крыху вышэй. Гэты струмень вады, паводле слоў Ірыны Францаўны, спрадвеку паіў жыхароў трох дамоў іх хутара. І дзяды, і прадзеды жанчын не капалі калодзежа, не было такой патрэбы. «Ад крыніцы, — расказвае Ірына Францаўна, — зімой, калі стаяць маразы, нават пара ідзе. Яшчэ не было выпадку, каб крынічка замерзла. Улетку — наадварот, ад вады патыхае прахалодай. І вада — чысцюткая, стаяць можа доўга, не псуецца, асадку не ўтварае».

Вось такія незвычайныя крыніцы наталяюць вадой людзей і зямлю ў ваколіцах Варанілавічаў Пружанскага раёна. А каля вёскі Брады гэтага ж раёна крыніцу таксама празвалі «святой», і яна авеяна казкамі-паверʼямі. Само месца, відаць, спарадзіла самыя розныя паданні. Крыніца выбіваецца нібыта з-пад карэння трох бяроз, а побач ляжыць аграмадны камень-валун з адбіткам ступні, які мясцовы люд называе следам Божай Маці. Цікава, што падобны валун з падобным адбіткам ёсць каля вёскі Ставы Камянецкага раёна, пра яго распавяла наша газета два гады таму. І там таксама ёсць крыніца. Каля Ставаў крыніца дагледжаная, добраўпарадкаваная, людзі бяруць там ваду. А вось крынічка ля Брадоў абмялела, амаль схавалася. Ёсць версія легенды, што адбітак на камені пакінула не Багародзіца, а анёл, які аднойчы выратаваў тутэйшыя мясціны ад засухі і неўраджаю.

Паданні пра крыніцы, успаміны старэйшых жыхароў вёсак запісалі вучні мясцовай школы, якія ўдзельнічалі ў конкурсе даследчых праектаў Брэсцкага абласнога эколага-біялагічнага цэнтра вучняў «Захаваем крыніцы». Падчас гэтай акцыі школьнікі збіралі гістарычныя звесткі пра крыніцы сваёй мясцовасці, запісвалі ўспаміны старажылаў, разам з настаўнікамі хіміі, біялогіі праводзілі аналіз хімічнага складу вады з крыніц, вызначалі магчымыя прычыны забруджвання. Многія ўдзельнікі своеасаблівай экспедыцыі дапамагалі прыбіраць тэрыторыю вакол крыніц...

У ходзе конкурсу вучні апісалі больш за 70 крыніц. Дарэчы, многія з іх адсутнічалі ў спісе-пераліку абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Так, паводле пераліку, у Жабінкаўскім, Маларыцкім, Ганцавіцкім раёнах крыніц не заўважана. А школьнікі прыслалі звесткі пра крыніцы ля вёскі Пажэжын Маларыцкага раёна, каля вёскі Малькавічы Ганцавіцкага раёна. А пружанскія вучні расказалі не толькі пра свае крыніцы, але і знайшлі цікавыя асаблівасці мясцовага свята «Зелянец», якое адзначаецца праз два тыдні пасля Тройцы. У гэты дзень жыхары многіх вёсак ішлі да крыніц, а лекавыя травы абавязкова асвячалі крынічнай вадой.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

ПРЭС-РЭЛІЗ

Дэпартамента па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь аб адчужэнні акцый

У адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 сакавіка 1998 г. № 3 «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь» прадугледжана паэтапнае знясце абмежаванняў на адчужэнне акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў, набытых грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у дзяржавы за грашовыя сродкі на льготных умовах (па цане не 20 працэнтаў ніжэйшай за намінальны кошт) і ў абмен на імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць», а таксама атрыманыя ўзамен іх доляў у маёмасці арэндных і калектыўных (народных) прадпрыемстваў пры пераўтварэнні іх у акцыянерныя таварыствы.

На першым і другім этапах адмяняюцца абмежаванні на абарачэнне акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў, доля дзяржавы ў статутным фондзе якіх адсутнічае або складае 75 і больш працэнтаў, а таксама больш як 50 працэнтаў.

Азнаёміцца з пералікамі названых адкрытых акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх могуць свабодна адчужацца, можна на інтэрнэт-сайтах Міністэрства фінансаў у раздзеле Дэпартамента па каштоўных паперах (www.minfin.gov.by), РУП «Рэспубліканскі цэнтральны дэпазітарый каштоўных папер (www.centraldepo.by), ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа» (www.stock.bcse.by), а таксама ў філіяльнай сетцы ААТ «ААБ Беларусбанк» і ААТ «Белаграпрамбанк».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дарагі сыночак і пляменнік **Аляксандр Анатольевіч СМОЛІЧ** з Мінска. Прымі нашы сардэчныя віншаванні з нагоды юбілейнага дня нараджэння. Зычым здароўя, дабрабыту ў сям'і, заўжды быць шчырым і працавітым.

Мама, цётка.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Новополького сельисполкома Пуховичского района

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, расположенных на территории Новопольского сельсовета:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Новополье, 624484005101000082	0,1399 га	сети электроснабжения	477 388	1 000 000	100 000
2	д. Новополье, 624484005101000081	0,1469 га		477 388	1 000 000	
3	д. Замостье, 624484003601000057	0,2494 га		477 388	500 000	50 000
4	д. Бахаровичи, 624484000601000106	0,2106 га		477 388	1 000 000	100 000
5	д. Бахаровичи, 624484000601000109	0,2492 га		477 388	1 000 000	
6	д. Войровка, 624484001601000167	0,1035 га		477 388	1 500 000	150 000
7	д. Дудичи, 624484003101000128	0,1857 га	сети электро-, водоснабжения	477 388	2 000 000	200 000

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **17.02.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.02.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Богушевичский сельский исполнительный комитет Березинского района Минской области

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 7 (семи) земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Едлино 3 (три) участка, в д. Бычин 4 (четыре) участка.

№ лота	Адрес земельного участка. Кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке	Номинальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)
№ 1	Березинский район, д. Бычин 620480801301000052	0,1585	электроснабжение	799821	36614	3661
№ 2	Березинский район, д. Бычин 620480801301000053	0,1079	электроснабжение	812736	24925	2492
№ 3	Березинский район, д. Бычин 620480801301000055	0,1635	электроснабжение	799821	34314	3431
№ 4	Березинский район, д. Бычин 620480801301000054	0,1672	электроснабжение	799821	35112	3511
№ 5	Березинский район, д. Едлино 620480804601000041	0,1470	электроснабжение	763615	30849	3085
№ 6	Березинский район, д. Едлино 620480804601000040	0,1612	электроснабжение	763615	33852	3385
№ 7	Березинский район, д. Едлино 620480804601000039	0,2048	электроснабжение	763615	43008	4301

Примечание: земельные участки имеют ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.

Задаток перечисляется на расчетный счет 3604003230324 в филиале № 602 АСБ «Беларусбанк» код 510 УНН 600056587. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому Лоту).

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией и земельными участками.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **20 февраля 2009 года** в 10.00 по адресу: Березинский район, Богушевичский сельский Совет (зал заседаний).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются ежедневно, кроме субботы и воскресенья, до 17.00 по адресу: д. Богушевичи Березинского района Минской области, Богушевичский сельский Совет (кабинет секретаря).

Контактный телефон: 8 01715 48 312.

«Тэлефон даверу... слухаем Вас»

Звесткі аб тым, што хтосьці ўтойвае свае даходы ад падаткаабкладання, гэта значыць абкрадае дзяржаўны бюджэт, неправамернымі дзеяннямі падрывае асновы законнасці і маралі, з'яўляюцца важным складнікам эфектыўнай работы падатковых органаў па выяўленні і спыненні парушэнняў дзейнага заканадаўства. Паведамленні грамадзян аб фактах незарэгістраванай прадпрымальніцкай дзейнасці, утойвання выручкі ад падаткаабкладання, нявыдачы чэкаў спажыўцам і аб іншых парушэннях заканадаўства аказваюць неацэнную дапамогу падатковым органам у іх рабоце на карысць грамадства і дзяржавы. У мэтах паляпшэння работы па зборы інфармацыі ад насельніцтва, павышэння аператыўнасці спынення парушэнняў заканадаўства аб падатках і прадпрымальніцтве, а таксама выхавання ў насельніцтва пачуцця неабходнасці супрацоўніцтва з органамі дзяржаўнай улады і кіравання **ў Міністэрстве па падатках і зборах працуе тэлефон даверу (328 53 53).**

Найбольш распаўсюджанай інфармацыяй аб парушэннях заканадаўства, якая паступае па тэлефоне даверу, з'яўляюцца звесткі пра нелегальных таксістаў, пра здачу кватэр унаймы без выплаты падаходнага падатку, пра ажыццяўленне незаконнага рамонту і вытворчасці розных вырабаў, пра нелегальныя станцыі тэхабслугоўвання аўтатранспарту, пра парушэнні ў сферы рознічнага гандлю таварамі пры дапамозе рэкламных аб'яў і з выкарыстаннем сеткі інтэрнэт, аб ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці без выплаты адзінага падатку, а таксама аб фактах утойвання даходаў і таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў. Паведамленні, перададзеныя па тэлефоне даверу, з'яўляюцца ананімнымі. Канфідэнцыяльнасць звестак аб асобах, якія звярнуліся па тэлефоне даверу, гарантуецца. Пры гэтым адзначым, што кансультацыі па пытаннях вылічэння падаткаў і збораў па тэлефоне даверу не праводзяцца.

За 11 месяцаў 2008 года па тэлефоне даверу Міністэрства па падатках і зборах паступіла 120 паведамленняў грамадзян. На выніках кантрольных мерапрыемстваў парушэнні выяўлены па 60 паведамленнях. У дзяржаўны бюджэт даналічана падаткаў і адміністрацыйных штрафаў у суме 463 млн рублёў. Накіравана ў даход дзяржавы таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму 270 млн рублёў.

Так, па тэлефоне даверу паступіла інфармацыя пра тое, што грамадзянка І. здае гараж і жылое памяшканне на тэрыторыі г. Мінска без рэгістрацыі дагавораў паднайму ў падатковай інспекцыі і выплаты падаткаў. З мэтай праверкі гэтай інфармацыі работнікамі падатковай інспекцыі былі праведзены агляд гаража і кватэры, што здаюцца ўнаймы, а таксама апытанні асобаў, якія арандуюць гэтыя памяшканні. У выніку быў выяўлены памер даходу, які атрыманы грамадзянкай І. ад ажыццяўлення незаконнай дзейнасці. Грамадзянку абавязалі выплаціць падаходны падатак у суме 350 тыс. рублёў. Акрамя таго, у дачыненні да грамадзянкі І. складзены адміністрацыйны пратакол за нявыплату падаткаў у адпаведнасці з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Паводле атрыманай інфармацыі, у адным з гандлёвых аб'ектаў Мінскай вобласці пакупнікам не толькі адмаўлялі па патрабаванні грамадзян у выдачы касавых чэкаў, але і ўвогуле адпускалі прадукты харчавання і алкагольныя вырабы з выключаным касавым апаратам. Па выніках праверкі ў гэтым гандлёвым аб'екце быў выяўлены шэраг парушэнняў заканадаўства. Наяўныя грашовыя сродкі па касавым апараце не прабіваліся, атрыманая выручка ўтойвалася ад падаткаабкладання. Акрамя таго, быў выяўлены тавар, які захоўваўся ў краме без дакументаў, што пацвярджаюць легальнасць яго набыцця. Гэты тавар на суму звыш 2,5 млн рублёў накіраваны ў даход дзяржавы. Сума адміністрацыйных штрафаў па выніках праверкі склала 1,75 млн рублёў.

Былы работнік аднаго з прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці паведаміў пра тое, што прадпрыемства «М» увозіць з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі значныя партыі мінеральнай вады. На тэрыторыі рэспублікі мінеральную ваду рэалізуюць з парушэннем заканадаўства і атрыманыя даходы ўтойваюць ад падаткаабкладання. Падчас кантрольных мерапрыемстваў на складах прадпрыемства выяўлена захоўванне бутэлек мінеральнай вады без маркіроўкі кантрольнымі (ідэнтыфікацыйнымі) знакамі. Гэта прадукцыя на суму 260 млн рублёў канфіскавана і па рашэнні суда накіравана ў даход дзяржавы. Вінаватыя службовыя асобы прадпрыемства М. прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

Па тэлефоне даверу паступілі звесткі пра тое, што грамадзянін В. арганізаваў на тэрыторыі рэспублікі сетку камерцыйных арганізацый, якія займаюцца незаконнымі фінансавымі аперацыямі і ўхіляюцца ад выплаты падаткаў. Ананім паведаміў, што пад выглядам правядзення будаўнічых работ грамадзянін В. арганізаваў дзейнасць, звязаную з пераводам ценявых грашовых патокаў на рахункі афшорных кампаній за мяжу. Былі названыя канкрэтныя адрасы, прозвішчы і рэквізіты лжэпрадпрымальніцкіх камерцыйных структур, якія ўдзельнічалі ў незаконнай дзейнасці. Па выніках кантрольных мерапрыемстваў інфармацыя, якая паступіла па тэлефоне даверу, пацвердзілася. Па выніках праведзеных работы ў дзяржаўны бюджэт пералічана 400 млн рублёў. Матэрыялы праверак накіраваныя ў праваахоўныя органы і ў цяперашні час вырашаецца пытанне аб узбуджэнні ў дачыненні да грамадзяніна В. крымінальнай справы.

Калі ў Вас маюцца звесткі аб парушэннях заканадаўства, калі Вы хочаце паведаміць аб фактах прадпрымальніцкай дзейнасці без выплаты падаткаў, аб фактах здачы ўнаймы кватэр і гаражоў, аб асобах, якія жывуць не па даходах, аб дзейнасці камерцыйных структур, накіраванай на ўтойванне даходаў і ўхіленне ад выплаты падаткаў, Вы можаце пазваніць па тэлефоне даверу (328 53 53). Кваліфікаваныя спецыялісты Міністэрства па падатках і зборах зарэгіструюць ваша паведамленне. Інфармацыя, перададзеная Вамі, будзе старанна вывучана і прааналізавана, з улікам выкладзеных Вамі фактаў і доказаў будуць арганізаваны і праведзены адпаведныя кантрольныя мерапрыемствы. Работнікі падатковых органаў прымуць неабходныя меры для спынення правапарушэнняў і прыцягнення вінаватых асобаў да адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам. Толькі сумеснымі намаганнямі, накіраванымі на ўзаемадзеянне грамадзян і дзяржаўных кантрольных органаў, мы зможам пабудаваць здаровае грамадства, заснаванае на прынцыпах маралі і законнасці.

ПАТАНУЛЫХ ЛАСЁЎ... РАЗАБРАЛІ

Работнікамі Брагінскай міжрайінспекцыі сумесна з супрацоўнікамі «Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка», вайскоўцамі в/ч 1242 і ветурачом Камарынскай ветлячэбніцы праведзена праверка па факце гібелі трох ласёў на рацэ Брагінка ў Брагінскім раёне паблізу мяжы з Украінай.

Установлена, што жывёлы пераходзілі раку па лёдзе, праваліліся і загінулі ад пераахаладжання, паколькі не змаглі разламаць лёд каля берага. Два ласі-сяголеткі потым былі выцягнуты невядомымі з вады, разабраны і вывезены. Пры даследаванні тушы трэцяга лася і кінутых паблізу шкур ад разабраных жывёл агнястрэльных раненняў не знойдзена. Падчас следча-аператыўных мерапрыемстваў выкліканай групай Брагінскага РАУС частка вывезенага мяса была знойдзена ў жыхароў вёскі Гдзень.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кватэрная «арыфметыка»

ЯК САМОМУ ЗМЕНШЫЦЬ КАМУНАЛЬНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ?

За студзень жыхары будуць разлічвацца за кватэру па новых тарыфах. Як заўважаюць у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у сярэднім плацяжы павялічацца больш чым на 10 долараў. Так што лютаўскія «жыроўкі» будуць ужо больш важкія, чым тыя, што мы атрымалі цяпер. Вядома ж, нарматывы разлікаў ніхто змяншаць не збіраецца, а вось рэальныя лічбы ў плацёжках можна нейкім чынам «карэктаваць». Якім чынам гэта можна зрабіць?

Аплата па сабекошце — толькі ў далёкай перспектыве

У адпаведнасці з праграмнымі дакументамі (перш за ўсё маецца на ўвазе Канцэпцыя развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі) выйсці на 100-працэнтнае пакрыццё насельніцтвам затрат на аказанне «кватэрных» паслуг мяркуецца не раней, чым у 2015 годзе. Гэта далёкая перспектыва, якая невядома ці ўвасобіцца ў жыццё. Цяпер жыхары вяртаюць менш чым 30 працэнтаў сабекошту «камуналкі». Дарэчы, такі ўзровень сёлета павышаць не будуць — было б вельмі добра, каб утрымаліся і на гэтай «планцы».

Пасля апошняга павышэння тарыфаў з улікам магчымага павелічэння сярэдніх заробкаў доля расходаў сярэднестатыстычнай сям'і (двое працуючых, у якіх адно дзіця) можа панізіцца ў параўнанні з мінулым годам. Такое меркаванне выказваюць ва ўпраўленні эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Так што цяжар плацяжоў адпаведна зменшыцца. Але гэта толькі ў тым выпадку, калі рост тарыфаў будзе даволі «мяккім». Прагназаваць далейшае развіццё сітуацыі пакуль даволі складана.

ЖЭС павінен разабрацца

Апошнім часам жылыя дамы, дзе налічваецца больш чым 20 кватэр, абсталяваны групавымі прыборамі ўліку і рэгулявання падачы цяпла. Гэта даволі выгадны для жыхароў варыянт. Цяпер неабходна разлічвацца толькі за той аб'ём энергарэсурсаў, якія спажыў канкрэтны будынак. Праўда, аўтаматыка калі-нікалі ўсё ж дае збоі. Асабліва гэта датычыцца рэгулявання падачы цяпла ў залежнасці ад тэмпературы паветра на двары. Спецыялісты заўважаюць, што адхіленні часцей за ўсё здараюцца, калі слупок тэрмометра вагаецца каля нулявой адзнакі. Тады, на жаль, нярэдкія выпадкі нематываванага павышэння тэмпературы ў кватэрах, калі батарэі — проста не дакрануцца. А ў маразы наадварот — людзі мерзнуць. У гэтых выпадках заўсёды неабходна звяртацца ў абслуговую арганізацыю, каб такі факт дакладна зафіксавалі і пасля зрабілі перараразлік, што называецца, «па факце». Навошта вам плаціць лішнія грошы і разлічвацца такім чынам за безгаспадарнасць тых жа ЖЭСаў? Адсочваць сітуацыю — гэта іх непасрэдны абавязак.

Лічыльнік рубель бярэжэ

Зараз ёсць шэраг варыянтаў, як самастойна «вярстаць» плацёжку. Адзін з іх — усталяванне лічыльнікаў. Напрыканцы мінулага года адзначаўся сапраўдны ажыятаж на абсталяванне кватэр прыборамі ўліку вады. Гэтая сітуацыя ўзнікла з-за магчымага значнага павелічэння тарыфаў для жыхароў тых кватэр, дзе няма лічыльнікаў. Як меркавалася, з пачатку гэтага года разлікі яны павінны былі весці па сабекошце (гэта ў некалькі разоў перавышае плацяжы па тарыфах). Чуткі аб гэтых мерах пацвердзіліся, змянілася толькі канчатковая дата ўвядзення такой сістэмы — усталяваць прыборы можна да 1 мая. Пасля чаго будзе ўведзена адпаведная градацыя. Як заўважаюць у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі, на працягу бліжэйшых трох з паловай месяцаў можна ўсталяваць лічыльнік і ў далейшым засцерагчыся ад непатрэбных страт для сямейнага бюджэту.

Калі пакватэрны ўлік вады і газу (не кажучы пра электрычнасць, дзе адпаведнымі прыборамі жыллё абсталявана даўно) — рэальная справа, то з ацяпленнем цяжэй. Некалькі гадоў таму ў новых дамах пачалі ўсталёўваць спецыяльныя прыборы ўліку — экзэмперы. За нязвыклай назвай хаваецца рэальная карысць для жыхароў. Па заканчэнні ацяпляльнага сезона ім будзе зроблены спецыяльны перараразлік — па паказаннях прыбораў. У такім выпадку жыхары могуць самастойна рэгуляваць спажыванне цеплавой энергіі. І ў выніку можна зэканоміць адчувальна — да трэці «звычайнага» аб'ёму спажывання (па традыцыйнай схеме, калі разлікі за спажытыя энергарэсурсы проста раскідваюцца сярод усіх кватэр). Трэба ўлічваць той факт, што менавіта «батарэйныя» разлікі самыя важкія ў «жыроўцы» — на іх долю, як правіла, прыпадае каля 40 працэнтаў агульнай сумы. Так што зменшыць плацяжы з дапамогай індывідуальных прыбораў уліку цяпла можна без усялякіх перашкод. І ў кватэры цёпла, і для кішэні прыемна.

«Светлавы» эфект

Яшчэ адзін з даволі «важкіх» радкоў у плацёжцы жыхароў — плата за электрычнасць. Зменшыць спажыванне тут таксама магчыма. Не варта ўвогуле адмаўляцца ад прывычнага ладу жыцця і жыць у цёмнай кватэры. Існуе шэраг даволі слушных варыянтаў. У іх ліку — выкарыстанне энергазберагальных лямпачак. Паводле разлікаў спецыялістаў Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Камітэта па стандартызацыі, 18—20 працэнтаў усёй энергіі, якую мы выкарыстоўваем, спажываюць менавіта асвятляльныя прыборы. Калі замяніць лямпачку магутнасцю 75 Вт на такую ж па характарыстыках энергазберагальную магутнасцю 15 Вт, то можна зэканоміць пэўную суму. Па-першае, адрозніваецца спажыванне — на адной светлавой «кропцы» яно змяншаецца на 60 Вт. Такама трэба ўлічваць той факт, што тэрмін эксплуатацыі ў энергазберагальнай лямпачкі складае 4 гады супраць паўгода ў звычайнай.

У агульную скарбонку сямейнай эканоміі да месца будзе і бытавая тэхніка з адпаведнымі характарыстыкамі. Падчас яе набыцця заўсёды варта звяртаць увагу на клас энергаэканамічнасці той ці іншай мадэлі. Таму ўважліва прыглядайцеся да адпаведных літарак. Ад А да С — эканамічны клас, D — сярэдні ўзровень, ад E да G — затратны тып, вялікі расход электраэнергіі. Дарэчы, апараты апошніх класаў на рынку сустракаюцца даволі рэдка (прыняты пэўныя абмежаванні для іх пастаўкі), але, тым не менш, тут трэба быць вельмі пільнымі, каб пасля не сумаваць над разлікоўкамі. Спецыялісты заўважаюць, што выкарыстанне тэхнікі класа А можа дазволіць зменшыць спажыванне электраэнергіі больш чым на 30 працэнтаў.

Шанц на перараразлік

Не губляйце свой шанц для змяншэння «жыроўкі» падчас ад'ездаў. Паколькі вызначана: калі жыхар адсутнічае больш чым 10 дзён запар, то ён мае права звярнуцца ў жыллёва-эксплуатацыйную арганізацыю, каб яму зрабілі адпаведны перараразлік. Калі ў кватэры не ўсталяваны лічыльнікі, то «адмінусуюць» плацяжы за газ, халодную і гарачую ваду і каналізацыю. У гэты спіс таксама трапілі і разлікі за вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў. Толькі варта мець на ўвазе, што трэба загадзя папярэдзіць аб ад'ездзе, а з даведкамі, якія пацвярджаюць вашу адсутнасць, неабходна звяртацца на працягу 7 дзён пасля прыбыцця. Такі тэрмін вызначаны заканадаўствам. Калі ад'язджаеце за мяжу (якую ў такім разе патрабаваць даведку?), то можна паказаць білет, пашпарт з адзнакай аб перасячэнні мяжы, іншыя дакументы, якія пацвярджаюць адпаведны факт. Дарэчы, даведкі для ЖЭСа можна ўзяць у санаторыях і дамах адпачынку, ва ўстановах аховы здароўя (калі вы, да прыкладу, захварэлі і доўгі час знаходзіцеся на стацыянарным лячэнні).

«Пустыя» кватэры — удар па кішэні

У шэрагу выпадкаў разлікі за асобныя паслугі праводзяцца па поўным кошце. Да прыкладу, за «лішнія» метры (па тарыфах аплачваецца 20 квадратных метраў на чалавека плюс 10 «квадратаў» на сям'ю) вызначаны адпаведныя плацяжы за тэхнічнае абслугоўванне жылля. Калі ж у кватэры ніхто не прапісаны, то такім жа чынам трэба разлічвацца яшчэ і па адлічэннях за капітальны рамонт жылля.

Сем'і, для якіх разлікі за кватэру перавышаюць вызначаны ўзровень (20 працэнтаў сукупнага даходу для жыхароў гарадоў і 15 працэнтаў для вяскоўцаў), маюць права на атрыманне безнаяўнай жыллёвай субсідыі. Для іх у залежнасці ад сітуацыі «жыроўка» можа змяншацца на пэўную суму.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

На слыху

ПАСЛЯ ДТЗ ВЯРНУЎСЯ ДАХАТЫ... ПАМІРАЦЬ

У Шчучынскім раёне ў вёсцы Шкордзь у сваім доме быў знойдзены нежывым рабочы адной з гаспадарак: пасля судова-медыцынскай экспертызы высветлілася, што прычынай смерці 42-гадовага мужчыны сталі пераломы і разрыў унутраных органаў.

Напярэдадні ноччу ахвяра разам з 40-гадовым знаёмым трапілі ў дарожна-транспартнае здарэнне. Апошні, не маючы вадзіцельскага пасведчання, знаходзіўся за рулём «Форда», і аўтамабіль паблізу вёскі Васілішкі з'ехаў у кювет і перакуліўся. Пацярпелы пасажыр, не зважаючы на атрыманыя траўмы, змог дабрацца да свайго дому, але без медыцынскай дапамогі памёр.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

БРАКАНЬЕРЫ З-ЗА МЯЖЫ

Пра незаконнае паляванне работнікам Салігорскай міжрайінспекцыі паведамілі з мясцовага РАУС. Дзяржінспектары сумесна з супрацоўнікамі следча-аператыўнай групы знайшлі рэшткі трох ласёў-самцоў, безгаспадарную паляўнічую стрэльбу. Па месцы жыхарства ў аднаго з падазроных канфіскаваныя дзве незарэгістраваныя паляўнічыя стрэльбы, малакаліберная вінтоўка з аптычным прыцэлам, два прыборы начнога бачання, боепрыпасы, а таксама 33 засоленыя шкуры андатры. У вартаўнікоў фермерскіх гаспадарак, размешчаных паблізу ад месца здарэння, канфіскаваны таксама дзве незарэгістраваныя паляўнічыя стрэльбы. Выяўлена, што ў гэтым паляванні бралі ўдзел два грамадзяніны Расіі — жыхары Санкт-Пецярбурга, якія незаконна ўвезлі зброю і палявалі на тэрыторыі Беларусі. Урон прыродным рэсурсам нанесены ў асабліва буйным памеры — на суму больш за 9,9 мільёна рублёў (285 базавых велічынь). Лунінецкім РАУС разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЛАТА ЗА МАЎЧАННЕ

У Мінску затрымана 43-гадовая індывідуальная прадпрымальніца, якая вымагала грошы ў дырэктара аднаго з унітарных прадпрыемстваў.

Жанчына «падкацілася» да кіраўніка з «прапановай» заплаціць ёй 3,5 мільёна рублёў за маўчанне: маўляў, у такім выпадку яна пакіне ў сакрэце звесткі аб парушэнні фінансава-гаспадарчай дзейнасці на прадпрыемстве. Разбагацець ёй не далі праваахоўнікі, якія ўмяшаліся ў справу. У Салігорску ж супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС разам з мясцовымі супрацоўнікамі міліцыі затрымалі двух непрацуючых мясцовых жыхароў, раней судзімых, якія збівалі 30-гадовага мужчыну, вымагаючы ў яго 1200 долараў ЗША і 850 тысяч рублёў. Адкупіцца ад сваіх крыўдзіцеляў ён паспрабаваў 160 тысячамі рублёў, аднак марна. Дапамога прыйшла своечасова.

Ігар ГРЫШЫН.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.18	16.20	8.02
Віцебск —	8.14	16.04	7.50
Магілёў —	8.09	16.10	8.01
Гомель —	7.58	16.14	8.16
Брэст —	8.32	16.37	8.05
Гродна —	8.26	16.44	8.18

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Малахіі, Гардзея.*
К. *Валеры, Ганараты, Бярнарда, Вальдэмара, Уладзіміра.*

Фота Марыі ЖБЫПІНСКАЙ

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	-5..-3°С	КІЕЎ	-3..-1°С	РЫГА	-4..-2°С
ВІЛЬНЮС	-4..-2°С	МАСКВА	-5..-3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-5..-3°С

Дзве даты

16 студзеня

1629 год — нарадзіўся Сімяон Полацкі (Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітніяновіч, па іншых звестках — Емельяновіч), беларускі паэт, драматург, перакладчык, выдавец, рэлігійны і грамадскі дзеяч.

1919 год — ЦК РКП(б) пастанавіў абвясціць Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (Літбел) у складзе Мінскай, Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў, а Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні перадаць у склад РСФСР. У аснову гэтага рашэння была пакладзена ідэя стварэння ва ўмовах нарастання польскай ваеннай пагрозы больш устойлівай буфернай дзяржавы, якая дазволіла б пазбегнуць у гэты перыяд прамой вайны паміж Савецкай Расіяй і Польшчай.

Цытата дня:

«Перш за ўсё патрэбныя факты, а ўжо пасля можна рабіць з імі ўсё, што хочаш».

Марк Твен (1835—1910), амерыканскі пісьменнік.

КАЛЯДНАЯ ВАРАЖБА

У большай ступені прыадчыніць таямніцы свайго заўтрашняга дня імкнуліся дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту. Ім трэба было рыхтавацца да пераходу ў іншую, чужую сям'ю, таму, вядома, ж карцела даведацца, адкуль, з якога боку будзе хлопец, як да яго ставіцца радзіна і аднавяскоўцы, якім характарам надзяліў яго Бог, да чаго ён здатны і якім гаспадаром стане з цягам часу.

Прывядзём некалькі прыкладаў калядная варажбы, якімі ў свой час карысталіся дзяўчаты.

● Дзяўчына брала кавалачак куцці (а дакладней, яе трэба было ўзяць неўпрыкмет, каб ніхто не бачыў) і перад тым, як легчы спаць, клала пад падушку. Затым пад ложак ставіла міску з вадой, цераз якую клала лучыну. Дзяўчына ўкладалася спаць і ў думках прамаўляла наступныя словы:

— Хто мяне па кладачцы правядзе, той мяне замуж возьме.

Пры гэтым ні падчас выканання варажбы, ні пасля (аж да самай раніцы) нельга было ні з кім размаўляць.

● У калядную ноч дзяўчаты бралі тыя стужкі, што ў косах насілі, прывязвалі на вішню (толькі на вішню, а не на якое-небудзь іншае дрэва). Гэтыя стужкі (адна з іх сімвалізавала нарачонага, другая — саму дзяўчыну) перапляталі паміж сабой, пры гэтым прасілі, каб прысніўся або знайшоўся нарачоны. Стужкі пакідалі на дрэве на ўсю ноч.

● Вечарам да калодзежа падыходзіла некалькі дзяўчат, бралі вочап і рукамі па чарзе хапаліся за яго. Якая з іх апошняй зверху «закрые» вочап, тая першая і замуж пойдзе.

● Дзве сяброўкі набіраюць з калодзежа вядро вады, нясуць яго ў хату і ставяць на лаву. Затым бяруць замок і «замыкаюць вядро». Пасля гэтага кладуцца спаць, не сказаўшы ніводнага слова. Ноччу павінен быў прысніцца той, хто прыйдзе «адамкнуць» вядро.

● Варажба на дровах. У хляве або ў паветцы дзяўчына набірае ахапак дроў, прыносіць у хату, кладзе каля печы і лічыць: калі пара будзе — замуж пойдзе, калі лішка — то не.

● Варажба на аладках. Дзяўчаты раніцай напякуць аладак, па адной схаваюць. Вечарам збяруцца ў чыёй-небудзь хаце і пачынаюць варажыць. На ўслон кожная з прысутных дзяўчат кладзе сваю аладку, а затым у хату прыводзяць сабаку. Чыю аладку сабака схопіць першую, тая хутчэй за ўсіх замуж пойдзе.

● Варажба на плоце. Дзяўчына выбягала на двор і рукамі абхоплівала плот. Затым лічыла штыкеціны. Калі ў пару будзе — замуж пойдзе, калі няцот — у дзеўках засядзіцца.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Дзеці, а давайце паклічам Снягурку!

— Сня-гу-рач-ка, ідзі да нас!

— А зараз, дзеці, давайце чымнебудзь здзівім Снягурку!

— Сня-гу-рач-ка, валі адсюль!

☺

Стопрацэнтная абарона ад перхаці — чорныя кашулі ў белую крапінку!

☺

Муж і жонка вячэраюць.

— Калі мы толькі пажаніліся, ты сабе браў маленькія кавалачкі, а мне пакідаў самыя вялікія. Ты мяне больш не кахаеш!

— Глупства, дарагая. Проста ты стала гатаваць значна лепш.

☺

Каб праславіцца гурманам у студэнцкім інтэрнаце, дастаткова пакласці ў пельмені, якія варацца, лаўровы ліст...

ГАНДЛЯРЫ МІРАЖАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

На самой жа сустрэчы чалавеку адкрывалася сітуацыя чужога свята. Прысутныя абавязкова дэманстравалі навічкам радасць і задаволенасць. Пацярпелыя мімаволі звярталі ўвагу на парадны выгляд прысутных, падкрэсленую асаблівую значнасць таго, што адбываецца, хоць ніхто канкрэтна не гаварыў, чаму ў прынцыпе варта радавацца. Падчас самога семінара слухачам прапаноўваліся нейкія матэматычныя разлікі, абстрактныя разважанні, жартаўлівыя гісторыі, статыстычныя звесткі, прыклады з жыцця... Пры гэтым ад прысутных патрабавалася занатоўваць пачутае, што, на думку экспертаў, даволі эфектыўна вызваляе чалавека ад неабходнасці супастаўляць інфармацыю і паніжае крытычнасць да таго, што адбываецца, паколькі чалавек у гэты момант цалкам засяроджаны на думках выступоўцы.

Лектары актыўна карысталіся аўдыя- і відэаапаратурай, камп'ютарнай тэхнікай, з дапамогай якой даводзілі да грамадзян рознага кшталту эканамічную і сацыяльную інфармацыю. Людзі слухалі, нешта запісвалі і пранікаліся ідэяй «новага бізнэсу», які абяцаў быць абсалютна выгадным — з атрыманнем адпаведных даходаў, пэўных зніжак падчас набыцця тавараў і паслуг. Варта было толькі запаліцыць узнос...

Клубныя лідары абяцалі кожнага навучыць усяму, што дапаможа стаць багатым і паспяховым, дэманстравалі фотаздымкі і ролікі пра людзей, якія аднойчы рызыкнулі, і вось цяпер... маюць шыкоўныя вілы на беразе акіяна, аўтамабілі, кватэры і многае іншае. Пасля такой «апрацоўкі» чалавек пранікаўся даверам да клуба і добраахвотна развіваўся з узносам, памер якога складаў ад 300 да 1,4 тысячы долараў. Суму трэба было выплаціць за раз.

Пазней большасць пацярпелых прызнаюць, што перажылі псіхалагічную атаку. На момант жа перадачы грошай членства ў клубе здавалася ўсім справай абсалютна добраахвотнай.

Злачынцы распрацавалі канкрэтны план працяглай дзейнасці па сістэматычным авалоданні грашыма. Падчас уступлення ў клуб навічку паведамлялася пра тое, што асноўны спосаб паляпшэння яго дабрабыту — запрашэнне новых членаў, гатовых уступіць у клуб. Семінары, на якія павінны былі прыходзіць усё новыя людзі, адбываліся ў розных арандаваных памяшканнях, а філіялы «клубаў» вандравалі па розных гарадах. Лектары прафесійна пераконвалі даверлівых навічкоў у выгадзе, якую атрымаюць апошнія, калі ўкладуць свае сродкі ў праграму, фарміравалі ў патэнцыйных ахвяраў неабходнае пазітыўнае мысленне і ў рэшце рэшт дасягалі пастаўленай мэты, — людзі добраахвотна развіваліся са сваімі зберажэннямі.

Зразумела, ніводны з «клубаў» не меў спецыяльнага дазволу на ажыццяўленне валютных аперацый, бухгалтарскай і фінансавай справаздачы. Аднак членам клуба не прыходзіла на розум цікавіцца падобнымі рэчамі.

Суд Партызанскага раёна г. Мінска асудзіў восем актывістаў «піраміднага» руху да пазбаўлення волі тэрмінам ад 6 да 9 гадоў. Двое абвінавачаных — Савіцкая і Жалезнякоў — вызвалены ад крымінальнай адказнасці па прычыне завяршэння тэрмінаў даўніны прыцягнення да крымінальнай адказнасці. Днямі прысуд уступіў у сілу.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«Бацькоўская зямля, ты сноў маіх палон...»

Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Гэта — і пра Міколу Шабовіча, вядомага ў Беларусі паэта-лірыка, паэта-песняніка, паэта-сатырыка, дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.

Сёлетні студзень асабліва значны для паэта: яму спаўняецца 50 гадоў. Паэзія, праца, сям'я — тры нязменныя крыніцы яго натхнення.

— У якім узросце ўпершыню напісалі верш?

— На зімовых канікулах у восьмым класе. Якраз падчас раённай алімпіяды па хіміі. «Все оксиды, кислоты и соли. Реагируют только с тобой...». Як вам тэматыка?

— Паступленне на філфак было заканамернасцю або, як часам здараецца, выпадковасцю?

— І заканамернасцю, і выпадковасцю. Пасля школы паступаў на факультэт прыкладной матэматыкі ў БДУ. Хацелася новага, нязведанага. І, дарэчы, не хапіла толькі аднаго бала ці нават паўбала. А матэматыку вусна наогул здаў на максімальную адзнаку. У гэты ж год з'явіўся мой першы верш у раённай газеце «Нарачанская зара». Калі ў ваенкамаце падказалі, што ў Львоўскім ваенна-палітычным ёсць спецыяльнасць «ваенная журналістыка», вырашыў паспрабаваць, але, атрымаўшы чацвёркі і развітаўшыся з «заходняй сталіцай», прыехаў у Мінск і паспеў яшчэ падаць дакументы ў пединстытут на філфак (за што вялікая мая ўдзячнасць Святлане Афанасьеўне Лепешавай і светлай памяці Сяргею Уладзіміравічу Кабяку). Уявіце сітуацыю. Прыходзім у БДУ (я і Міхась Гайцюкевіч, будучы мой аднакурснік-аднагрупнік, а таксама паэт і тэлерэжысёр), а на дзвярах абвестка: «Прыём дакументаў да 14-00». А на гадзінніку 16-50. Мы бяжым у педагагічны. Абвестка «...да 17-00». А на гадзінніку 16-59... Вось гэта быў адрэналін!



— Ведаю, што студэнты вас вельмі паважаюць і любяць.

— Можа, я і не ідэальны выкладчык, але на лекцыях і на практычных стараюся як мага больш выявіць творчых людзей, дапамагчы ім зрабіць першыя крокі ў літаратуру. Кожны чалавек таленавіты па-свойму. Але нярэдка бывае, што некаторыя не здагадваюцца, што надзелены пэўным талентам. Вершы сваіх выхаванцаў адношу ў рэдакцыі літаратурных газет і часопісаў. За гэта мяне называюць «прадзюсарам».

— У такім выпадку дазвольце вас назваць «прадзюсарам» творчай універсітэцкай суполкі «Крокі».

— Яна маладзейшая за мяне толькі на 20 гадоў, на ўзрост таго хударлявага юнака ў клятчастым пінжаку, па якім мяне, дарэчы, пазнавалі і які я пранасіў ледзь не ўсе свае чатыры гады навучання. Для кожнага з нас, тагачасных маладых і няўрымслівых, — а гэта найперш Мікола Ждановіч, Людміла Харужык (Глінская), Вікторыя Чарняўская, Мікола Мікуліч, Сяргей Ільюшчыц і многія-многія іншыя — слова «Крокі» святое. Гэта, бадай, самыя прыемныя, самыя светлыя і радасныя ўспаміны не толькі для мяне як кіраўніка, а, думаю, для ўсіх «крокаўцаў». Мне і сёння, калі аб'яднанню спаўняецца 30 гадоў, ёсць чым пахваліцца, бо менавіта ў БДПУ імя Максіма Танка, менавіта на маім родным факультэце беларускай філалогіі і культуры навучаюцца такія таленавітыя творцы, як Ксенія Шаржановіч, на сёння, відаць, самы малады (21 год) член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Вераніка Мандзік, чыя падборка ў «ЛіМе» выклікала вельмі станоўчы розгалас, Ірына Чарняўская, якая друкавалася ў «ЛіМе» і «Маладосці», Алесь Мойскі, Наталля Пятроўская... А нядаўнія выпускнікі Сяргей Карчыцкі, Таццяна Сівец, Ганна Міклашэвіч, якія ўжо сталі членамі Саюза пісьменнікаў, Ганна Васільева, якая выдатна піша вершы і прозу, Кацярына Цвяткова, Міхась Бараноўскі, Марына Белякова, Галіна Дзмітрук, Жанна Навіцкая, Вераніка Паўлоўская, Дзмітрый Пятровіч, Алена Шарапа, Юрась Чарнякев

ПАНЯДЗЕЛАК, 19 СТУДЗЕНЯ

5.25 Дак. серыял «Таямнічы свет жывёл».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00,19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.25 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.10 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 15.25 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Хрышчэння Гасподняга.
9.25 Nota Bene.
9.50 Здароўе.
10.20 Серыял «Родныя людзі».
11.15 Дак. фільм «Мас-фільм». Невядомая версія».
12.10 Камедыя «Па сямейных абставінах».
14.30 «У інтарэсах нацыянальнай бяспекі». «МНС. Тэрыторыя бяспекі».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 «Інтуіцыя».
16.50 Серыял «Гарачы лёд».
17.45 Серыял «Родныя людзі».
19.40 Арэна.
20.00 «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 «ЁўраФэст». Фінал.
23.35 Серыял «Доктар Хаўс».
0.30 Дзень спорту.
0.40 Усе стыхіі.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.50, 0.45 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10, 11.10 Маст. фільм «Дзіцячы свет».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.05, 1.00 Навіны спорту.
11.40 «Элька». Мультфільм.
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.50 «Модны прыгавор».
15.00 «Шырокая рака». Серыял.
16.15 «Агонь кахання». Серыял.
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 «След». Серыял.
23.10 «Застацца ў жывых». Серыял.
23.55 «Прафесійны бокс. Хуліа Гарсія — Дэні Перэс».

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 17.00 Смачна з Барысам Бурдой.
8.15 Тэлебарометр.
8.35 Усё пра бяспеку.
9.00 У гэты дзень.
9.05, 16.15 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
9.55, 17.35 Серыял «Спадчынніца».
10.45 Драма «Танцы падчас Луназы».
12.20 «Гаспадар».
12.50 Серыял «Расплата за грахі».
13.40 Бухта капітанаў.
14.20 Мультсерыял «Сонік Iкс».
15.00 Пазакласная гадзіна.
15.15 «Тайны смак».
15.45 «Шунін і бландзінкі».
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Забойная сіла-2».
19.50 Беларуская часінка.
20.40 Калыханка.
21.00 Кінараман «Доўгая дарога ў дзюнах». 1-я серыя.
22.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
23.20 Хакей. Формула гульні.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30,19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае снеданне».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.50 «Жыццё працягваецца». Серыял.
11.45, 18.25 «Багатая і любімая». Серыял.
12.35 «Ваенная тайна».
13.50 «Мой дом».
14.20 «Наша справа».
14.30 «Далёкія сваякі».
14.40 «Фантастычныя гісторыі».
15.35 «Я — падарожнік».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 «Скардзіцца дазволена».
22.00 «Мінск і мінчане».
23.00 «StartUp!».
0.30 «Зоркі спорту».
0.55 «Дэтэктыўныя гісторыі».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05, 2.30 Садружнасць live.
5.30 «Жаночы часопіс».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.30 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «У сузор'і Быка».
12.05, 23.45 Маст. фільм «Гадзіна поўні».
14.05 Мультсерыял «Блізняты Крамп».
14.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».
15.20 Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 Акцэнты.
18.30 Серыял «Дзеці Ванюхіна».
19.30 «Дзень пасла».
20.05 Ток-шоу «Слова за слова».
21.20, 3.00 Серыял «Херувім».
22.30 «Вёска дурняў».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».
1.30 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
3.20 Садружнасць Live.

7.00, 23.10 Навіны кіно.
7.10, 10.55 «Астра-, метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Пасейдон».
9.00 «К-відэа» для дзяцей.
9.30 «Адшукваецца адпачынак».
9.50 Серыял «Вялікая прагулка».
11.00 Камедыя «Адпетыя махляры».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
16.45, 19.45 Серыял «Мусаліні».
17.45 Серыял «Вяртанне Будулая».
19.10 «К-гульні».
19.15 «Хіт-парад тэлечата».
20.45 «Вечарніца».
20.55 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.00 Маст. фільм «Фрыда».
23.20 «Метэапрагноз».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05, 19.35 Серыял «Кармеліта».
10.05, 20.30 Серыял «Калі ў вас няма цёткі».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 21.35 Серыял «Пастка».
12.15 Маст. фільм «Камісар Мантале». 2-я серыя.
13.50, 16.50, 18.50, 23.20 Навіны—Беларусь.
14.20 Дак. фільм «2012. Ці збудуцца прароцтвы майя».
15.15, 22.30 «Кулагін і партнёры».
15.50 Суд ідзе.
17.30 «Гарадок». Дайджэст.
18.00 Серыял «Жанчына без мінулага».
23.00 «Весткі+».
23.30 «Нясмешнае жыццё смешнага чалавека. Готліб Раніпсон». Дак. фільм.

6.55 Камедыя «Не бойся, я з табой!».
8.30 «К-відэа для дзяцей».
9.20 «Пакой смеху».
10.00, 17.25, 0.25 «Родныя людзі». Серыял.
10.45, 18.15, 1.10 «Жанчына без мінулага». Серыял.
11.30, 15.05 Мультфільмы.
11.35 Маст. фільм «Я хацела бачыць анёлаў».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Маст. фільм «Камісар Мантале». 1-я серыя.
15.15 «Рускі бас Максім Міхайлаў».
16.30 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.50, 0.10, 6.40 Весткі—спорт.
17.00, 5.40 «Пісьменнікі нашага дзяцінства». Радзій Пагодзін.
19.45, 1.55 Серыял «Кармеліта».
20.30, 3.40 Серыял «Калі ў вас няма цёткі...».
21.20, 4.50 «Гарадок».
22.05 Весткі—Санкт-Пецярбург.
22.20 «Астравы». Юлій Карасік.
23.00, 4.30 «Весткі+».
23.20, 2.40 Навіны культуры.
23.40, 6.10 «Начны палёт».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.00 «Праграма Максімум».
10.25 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.10 «Следства вялі...».
13.35 Серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
15.10 «Прафесія — рэпарцёр».
15.30, 18.25, 22.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
19.35 Серыял «Павуціна-2».
21.20 Серыял «Білет у гарэм».
22.10 «Чыстасардэчнае прызнанне».

23.25 «Ты смешны!».
0.05 Серыял «Медыум».

7.15 Канал «Настрой».
9.20, 7.05 «Энцыклапедыя». Буда.
9.30, 18.30, 3.10 «Трымай мяне мацней». Серыял.
10.15 «Прыгоды капітана Врунгеля». Мультфільм.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.45 «Трайны скачок «Пантэры». Маст. фільм.
12.10 «Масква Першапрастольная». Дак. фільм.
12.35 «Анёл-ахоўнік». Серыял.
13.20, 16.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
13.45 Пятроўка, 38.
14.00 «Пастскрыптум».
15.00, 6.20 «Жонка Іуды». Серыял.
15.45 «Рэпарцёр».
16.00 «Геній Месца».
16.55, 2.10 «Інспектар Дэрык». Серыял.
17.55 «Жалезная заслона апушчана». Фільм Леаніда Млечына.
20.05 «Што сказаў нябожчык». Серыял.
20.55 «Лінія абароны».
21.35 «Амерыка ў чорных тонах». Фільм Леаніда Млечына.
22.00, 4.20 «Залатое цяля». Серыял.
22.50 «Момант ісціны».
23.25 «Аднойчы схлусіўшы». Маст. фільм.
1.00 Падзеі. 25-я гадзіна.
1.30 «Нічога асабістага».
3.55 «Масква Першапрастольная». Дак. фільм.
5.10 «Pop Corn-TV».
5.40 «Нацыянальны набытак». Уладзімір Этуш.

4.00, 15.30, 2.00 Тэніс. Australian Open.
15.00 Агляд снежнага ўікэнда.
19.00, 0.00 Футбол. Еўрагалы.
19.45, 1.00 Снукер.
21.00 Байцоўскі клуб.

11.00 ФІЛЬМ ДНЯ

«НЕ БОЙСЯ, Я З ТАБОЙ!» (СССР, 1981 г.)

Малады джыгіт Рустам, даведаўшыся аб магчымай хуткай смерці сваёй бабулі, вяртаецца на Каўказ, радзіму сваіх продкаў, дзе яму па закону гор пагражае кроўная помста...

